Пераклад Кодэкса адобраны экспертным саветам па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову (пратакол ад 29.12.2021 № 6)

# КОДЭКС ГАНДЛЁВАГА МАРАПЛАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
15 лістапада 1999 г. № 321-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 13 кастрычніка 1999 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 кастрычніка 1999 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2005 г. № 76-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1173) <H10500076>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 134-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 106, 2/1233);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 137-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 г. № 162-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1259);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 300-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1397);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 397-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 175, 2/1494);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 109-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 17, 2/1661);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2011 г. № 326-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 1, 2/1878) <H11100326>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2015 г. № 242-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.01.2015, 2/2240);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 мая 2021 г. № 111-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 25.05.2021, 2/2831)

## ЗМЕСТ

РАЗДЗЕЛ IАГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса
Артыкул 2. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе
Артыкул 3. Суб’екты гандлёвага мараплаўства
Артыкул 4. Заканадаўства ў галіне гандлёвага мараплаўства
Артыкул 5. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 6. Дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне гандлёвага мараплаўства
Артыкул 7. Дзяржаўны кантроль у галіне гандлёвага мараплаўства
Артыкул 8. Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў
Артыкул 9. Тарыфы
Артыкул 10. Разліковая адзінка

РАЗДЗЕЛ II. СУДНА
ГЛАВА 2. УЛАСНАСЦЬ НА СУДНА
Артыкул 11. Формы ўласнасці на судна
Артыкул 12. Момант узнікнення права ўласнасці на судна і судна, якое будуецца
Артыкул 13. Правы ўласніка судна
Артыкул 14. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна, якое будуецца
Артыкул 15. Перадача судна ў давернае кіраванне
ГЛАВА 3. НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ І ФЛАГ СУДНА
Артыкул 16. Права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь
Артыкул 17. Узнікненне права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь
Артыкул 18. Адказнасць за незаконнае падняцце на судне Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь
Артыкул 19. Нацыянальнасць судна
Артыкул 20. Страта суднам права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь
Артыкул 21. Часовая страта суднам права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 4. ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ СУДНАЎ
Артыкул 22. Рэестры суднаў
Артыкул 23. Орган, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў
Артыкул 24. Умовы дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў
Артыкул 25. Звесткі, падлеглыя ўнясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу
Артыкул 26. Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе
Артыкул 27. Дзяржаўная рэгістрацыя судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе
Артыкул 28. Асаблівасці дзяржаўнай рэгістрацыі замежнага судна, якое эксплуатуецца на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу
Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй
Артыкул 30. Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, якія ўносяцца ў рэестры суднаў
Артыкул 31. Страта дакументаў, якія пацвярджаюць факт дзяржаўнай рэгістрацыі судна
Артыкул 32. Выключаны
Артыкул 33. Адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі судна
Артыкул 34. Адказнасць за парушэнне правіл дзяржаўнай рэгістрацыі судна
Артыкул 35. Выключэнне судна з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнігі
Артыкул 36. Судна, якое прапала без вестак
Артыкул 37. Судна, канструктыўна загінулае
Артыкул 38. Права на атрыманне інфармацыі з рэестраў суднаў
ГЛАВА 5. ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ СУДНА
Артыкул 39. Назва судна
Артыкул 40. Міжнародны пазыўны сігнал
Артыкул 41. Порт прыпіскі судна
ГЛАВА 6. СУДНАВЫЯ ДАКУМЕНТЫ
Артыкул 42. Суднавыя дакументы, якія знаходзяцца на судне
Артыкул 43. Суднавыя дакументы для некаторых катэгорый суднаў
Артыкул 44. Органы, якія выдаюць суднавыя дакументы
Артыкул 45. Прызнанне дакументаў, выдадзеных замежным класіфікацыйным таварыствам
Артыкул 46. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да суднавых дакументаў
Артыкул 47. Правілы афармлення суднавых дакументаў і захоўвання суднавага журнала
РАЗДЗЕЛ III. ЭКІПАЖ СУДНА. КАПІТАН СУДНА
ГЛАВА 7. ЭКІПАЖ СУДНА
Артыкул 48. Склад экіпажа судна
Артыкул 49. Мінімальны склад экіпажа судна
Артыкул 50. Прававое становішча членаў экіпажа судна
Артыкул 51. Грамадзянства членаў экіпажа судна
Артыкул 52. Нацыянальнае пасведчанне асобы марака
Артыкул 53. Патрабаванні да кваліфікацыі членаў экіпажа судна
Артыкул 54. Патрабаванні да стану здароўя членаў экіпажа судна

Артыкул 55. Працоўныя адносіны на судне
Артыкул 56. Абавязкі суднаўладальніка
Артыкул 57. Рэпатрыяцыя членаў экіпажа судна
Артыкул 58. Асабістая маёмасць члена экіпажа судна
Артыкул 59. Узаемаадносіны членаў экіпажа судна з консуламі Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнымі прадстаўнікамі)
ГЛАВА 8. ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ КАПІТАНА СУДНА
Артыкул 60. Кіраванне суднам і іншыя абавязкі капітана судна
Артыкул 61. Абавязак капітана судна аказваць дапамогу людзям, якія церпяць бедства на моры
Артыкул 62. Абавязак капітана судна аказваць дапамогу пасля сутыкнення суднаў
Артыкул 63. Абавязак капітана судна заходзіць у порт для аказання неадкладнай медыцынскай дапамогі
Артыкул 64. Абавязак капітана судна ў выпадку ўзнікнення ваенных дзеянняў або ў іншых выпадках ваеннай небяспекі
Артыкул 65. Права капітана судна рэквізаваць харчаванне ў выпадку зрасходавання жыццёвых прыпасаў
Артыкул 66. Правы капітана судна ў выпадку неадкладнай патрэбы ў грашах для працягу плавання
Артыкул 67. Дзеянні капітана судна ў выпадку небяспекі гібелі судна
Артыкул 68. Правы капітана судна па падтрыманні парадку на судне
Артыкул 69. Згода капітана судна на прыём на працу членаў экіпажа судна
Артыкул 70. Капітан судна як орган дазнання
Артыкул 71. Абавязкі капітана судна ў выпадку нараджэння дзіцяці або смерці на судне
Артыкул 72. Права капітана судна на сведчанне тастаментаў
Артыкул 73. Права капітана судна на валоданне агнястрэльнай зброяй і яе прымяненне
Артыкул 74. Капітан судна як прадстаўнік суднаўладальніка і грузаўладальнікаў
Артыкул 75. Ускладанне абавязкаў капітана судна на старшага памочніка капітана судна
Артыкул 76. Адказнасць капітана судна
РАЗДЗЕЛ IV. МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ГРУЗАЎ
ГЛАВА 9. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ МАРСКОЙ ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ
Артыкул 77. Падставы ажыццяўлення марской перавозкі грузаў
Артыкул 78. Часовыя спыненне або абмежаванне прыёму грузаў для марской перавозкі
Артыкул 79. Перавозка грузаў марскім транспартам агульнага карыстання
Артыкул 80. Дагавор марской перавозкі грузу
Артыкул 81. Дагавор фрахтавання (чартар)
Артыкул 82. Дагавор аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў
Артыкул 83. Суадносіны дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў і дагавора марской перавозкі грузу
Артыкул 84. Змешаная перавозка грузаў
Артыкул 85. Праваадносіны перавозчыка і атрымальніка грузу
Артыкул 86. Доказы прыёму грузу для марской перавозкі
Артыкул 87. Даныя канасамента
Артыкул 88. Агаворкі ў канасаменце
Артыкул 89. Доказная сіла канасамента
Артыкул 90. Віды канасамента
Артыкул 91. Множнасць экзэмпляраў канасамента
Артыкул 92. Перадача правоў па канасаменце
ГЛАВА 10. АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ МАРСКОЙ ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ
Артыкул 93. Мараходнасць судна
Артыкул 94. Замена судна
Артыкул 95. Порт пагрузкі
Артыкул 96. Месца пагрузкі
Артыкул 97. Тэрмін падачы судна да месца пагрузкі
Артыкул 98. Паведамленне аб гатоўнасці судна да пагрузкі
Артыкул 99. Сталійны час
Артыкул 100. Контрсталійны час
Артыкул 101. Дэмерэдж

Артыкул 102. Дыспач
Артыкул 103. Права перавозчыка адправіць судна ў рэйс пасля сканчэння контрсталійнага часу
Артыкул 104. Пакрыццё страт за затрымку судна
Артыкул 105. Адпраўленне судна ў рэйс да сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу
Артыкул 106. Выгрузка чужога грузу
Артыкул 107. Размяшчэнне грузу на судне. Перавозка грузу на палубе
Артыкул 108. Выдаткі на пагрузку
Артыкул 109. Упакоўка і маркіроўка грузу
Артыкул 110. Замена грузу
Артыкул 111. Дакументы на груз
Артыкул 112. Права распараджэння грузам
Артыкул 113. Абавязкі перавозчыка ў дачыненні да грузу
Артыкул 114. Небяспечны груз
Артыкул 115. Груз, пагружаны не пад сваім найменнем
Артыкул 116. Тэрмін і маршрут перавозкі. Дывіяцыя
Артыкул 117. Перашкоды для заходу судна ў порт прызначэння
Артыкул 118. Выгрузка грузу
Артыкул 119. Асоба, якая мае права на атрыманне грузу
Артыкул 120. Здача грузу на захоўванне. Продаж незапатрабаванага грузу
Артыкул 121. Агляд і праверка грузу да яго выдачы
Артыкул 122. Заява аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) грузу
Артыкул 123. Плацяжы пры перавозцы грузаў
Артыкул 124. Памер фрахту
Артыкул 125. Фрахт за груз, страчаны пры перавозцы
Артыкул 126. Вылічэнне фрахту за фактычна пройдзеную суднам адлегласць
Артыкул 127. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора
Артыкул 128. Адмова фрахтавальніка або адпраўшчыка ад выканання дагавора
Артыкул 129. Адмова бакоў ад выканання дагавора
Артыкул 130. Спыненне дагавора немагчымасцю выканання
ГЛАВА 11. АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, АДПРАЎШЧЫКА І ФРАХТАВАЛЬНІКА
Артыкул 131. Адказнасць перавозчыка
Артыкул 132. Падставы вызвалення перавозчыка ад адказнасці
Артыкул 133. Навігацыйная памылка
Артыкул 134. Вызваленне перавозчыка ад адказнасці за нястачу грузу, дастаўленага ў апламбаваных памяшканнях, непашкоджанай упакоўцы або з суправаджэннем
Артыкул 135. Адказнасць перавозчыка за страту або пашкоджанне кантэйнера
Артыкул 136. Памер урону, падлеглага пакрыццю за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) грузу
Артыкул 137. Абмежаванне адказнасці перавозчыка за пратэрміноўку дастаўкі грузу
Артыкул 138. Адказнасць фактычнага перавозчыка
Артыкул 139. Неправадзейнасць пагаднення аб абмежаванні або вызваленні ад адказнасці
Артыкул 140. Выпадкі заключэння пагадненняў аб абмежаванні або вызваленні ад адказнасці
Артыкул 141. Адказнасць адпраўшчыка і фрахтавальніка
Артыкул 142. Адказнасць за прастой судна па віне адпраўшчыка, фрахтавальніка або атрымальніка
РАЗДЗЕЛ V. МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ
ГЛАВА 12. МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ
Артыкул 143. Дагавор марской перавозкі пасажыра
Артыкул 144. Перыяд марской перавозкі
Артыкул 145. Перавозачныя дакументы
Артыкул 146. Агульныя ўмовы марской перавозкі пасажыраў
Артыкул 147. Адмова пасажыра ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра
Артыкул 148. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра
Артыкул 149. Спыненне дагавора марской перавозкі пасажыра пры немагчымасці яго выканання
Артыкул 150. Вяртанне пасажыру платы за праезд
Артыкул 151. Змяненне дагавора марской перавозкі пасажыра
Артыкул 152. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю і здароўю пасажыра

Артыкул 153. Адказнасць перавозчыка за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) багажу
Артыкул 154. Адказнасць перавозчыка за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) каютнага багажу
Артыкул 155. Адказнасць фактычнага перавозчыка
Артыкул 156. Страта або пашкоджанне каштоўнасцей
Артыкул 157. Прымяненне меж адказнасці
Артыкул 158. Заява аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) багажу
Артыкул 159. Незапатрабаваны багаж
Артыкул 160. Бясплатная перавозка ў адпаведнасці з дагаворам марской перавозкі пасажыра
РАЗДЗЕЛ VI. ФРАХТАВАННЕ СУДНА НА ЧАС
ГЛАВА 13. ДАГАВОР АРЭНДЫ (ФРАХТАВАННЯ НА ЧАС) СУДНА З ЭКІПАЖАМ (ТАЙМ-ЧАРТАР)
Артыкул 161. Паняцце дагавора
Артыкул 162. Форма і істотныя ўмовы дагавора
Артыкул 163. Субарэнда судна з экіпажам
Артыкул 164. Абавязак суднаўладальніка (арэндадаўцы) па ўтрыманні судна
Артыкул 165. Абавязкі суднаўладальніка (арэндадаўцы) па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі судна
Артыкул 166. Абавязкі фрахтавальніка (арандатара) па камерцыйнай эксплуатацыі і вяртанні судна
Артыкул 167. Страхаванне судна
Артыкул 168. Падпарадкаванасць экіпажа судна
Артыкул 169. Выплата фрахту
Артыкул 170. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі
Артыкул 171. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) перад трэцімі асобамі
Артыкул 172. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна
РАЗДЗЕЛ VII. АРЭНДА СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА (БЕРБОЎТ-ЧАРТАР)
ГЛАВА 14. ДАГАВОР АРЭНДЫ СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА (БЕРБОЎТ-ЧАРТАР)
Артыкул 173. Паняцце дагавора
Артыкул 174. Форма і істотныя ўмовы дагавора
Артыкул 175. Субарэнда судна без экіпажа
Артыкул 176. Абавязак арэндадаўцы прывесці судна ў мараходны стан
Артыкул 177. Абавязак арандатара па ўтрыманні судна
Артыкул 178. Абавязак арандатара па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі судна
Артыкул 179. Экіпаж судна
Артыкул 180. Плата па бербоўт-чартары
Артыкул 181. Правы і абавязкі арандатара па эксплуатацыі і вяртанні судна
Артыкул 182. Адказнасць арандатара перад трэцімі асобамі
Артыкул 183. Адказнасць арандатара за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна
РАЗДЗЕЛ VIII. ДАГАВОР БУКСІРОЎКІ
ГЛАВА 15. ДАГАВОР БУКСІРОЎКІ
Артыкул 184. Паняцце дагавора буксіроўкі
Артыкул 185. Форма дагавора буксіроўкі
Артыкул 186. Абавязкі бакоў
Артыкул 187. Адказнасць пры марской буксіроўцы
Артыкул 188. Адказнасць пры партовай буксіроўцы
Артыкул 189. Перыяд буксіроўкі
Артыкул 190. Дапамога буксіруемаму судну ў выпадку марскога здарэння
РАЗДЗЕЛ IX. АПЛАТНАЕ АКАЗАННЕ ПАСЛУГ
ГЛАВА 16. ДАГАВОР АКАЗАННЯ ПАСЛУГ ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ МАРСКОГА КРУІЗУ (ДАГАВОР МАРСКОГА КРУІЗУ)
Артыкул 191. Паняцце дагавора марскога круізу
Артыкул 192. Аднабаковая адмова ад выканання дагавора марскога круізу
Артыкул 193. Павелічэнне тэрміну круізу
Артыкул 194. Адказнасць арганізатара круізу

Артыкул 195. Неправадзейнасць пагаднення аб абмежаванні правоў удзельніка круізу
ГЛАВА 17. ДАГАВОР АКАЗАННЯ ПАСЛУГ МАРСКОГА АГЕНТА
Артыкул 196. Паняцце дагавора аказання паслуг марскога агента
Артыкул 197. Дзеянні марскога агента ад імені абодвух бакоў
Артыкул 198. Абавязкі марскога агента
Артыкул 199. Абавязкі суднаўладальніка
Артыкул 200. Спыненне дагавора аказання паслуг марскога агента
ГЛАВА 18. ДАГАВОР АКАЗАННЯ МАРСКІХ ПАСЯРЭДНІЦКІХ ПАСЛУГ
Артыкул 201. Паняцце дагавора аказання марскіх пасярэдніцкіх паслуг
Артыкул 202. Ажыццяўленне марскім брокерам дзеянняў марскога агента
Артыкул 203. Узнагароджанне паслуг марскога брокера
РАЗДЗЕЛ X. МАРСКОЕ СТРАХАВАННЕ
ГЛАВА 19. МАРСКОЕ СТРАХАВАННЕ
Артыкул 204. Добраахвотнае страхаванне
Артыкул 205. Абавязковае страхаванне
Артыкул 206. Абандон
Артыкул 207. Заява аб абандоне
Артыкул 208. Асацыяцыі ўзаемнага страхавання
ГЛАВА 20 ВЫКЛЮЧАНА
Артыкул 239. Выключаны
Артыкул 240. Выключаны
РАЗДЗЕЛ XI. ІПАТЭКА СУДНА АБО СУДНА, ЯКОЕ БУДУЕЦЦА
ГЛАВА 21. ІПАТЭКА СУДНА АБО СУДНА, ЯКОЕ БУДУЕЦЦА
Артыкул 241. Права на іпатэку суднаў
Артыкул 242. Форма і істотныя ўмовы дагавора іпатэкі судна або судна, якое будуецца
Артыкул 243. Прадмет іпатэкі судна або судна, якое будуецца
Артыкул 244. Дзяржаўная рэгістрацыя іпатэкі судна або судна, якое будуецца
Артыкул 245. Чарговасць задавальнення патрабаванняў, якія ўзнікаюць з абавязацельстваў, забяспечаных іпатэкай судна або судна, якое будуецца
Артыкул 246. Наступная іпатэка
Артыкул 247. Уступка правоў паводле дагавора іпатэкі
Артыкул 248. Захаванасць прадмета іпатэкі
Артыкул 249. Іпатэка пры пераходзе права ўласнасці на судна або судна, якое будуецца
Артыкул 250. Падстава прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца
Артыкул 251. Давядзенне да ўсеагульнага ведама рашэння суда аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца
Артыкул 252. Паведамленне аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца
Артыкул 253. Наступствы прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца
Артыкул 254. Першачарговая аплата выдаткаў з выручкі ад прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца
Артыкул 255. Спыненне іпатэкі судна або судна, якое будуецца
РАЗДЗЕЛ XII. АГУЛЬНАЯ І ПРЫВАТНАЯ АВАРЫІ. МАРСКІЯ ПРАТЭСТЫ
ГЛАВА 22. АГУЛЬНАЯ АВАРЫЯ
Артыкул 256. Паняцце агульнай аварыі
Артыкул 257. Прынцыпы размеркавання агульнай аварыі
Артыкул 258. Прымяненне правіл аб агульнай аварыі
Артыкул 259. Агульная аварыя, выклікaная заходам судна ў месца прыстанішча
Артыкул 260. Выдаткі, звязаныя з перамяшчэннем на борце судна, выгрузкай і зваротнай пагрузкай грузу, паліва і прадметаў забеспячэння
Артыкул 261. Выдаткі па часовым рамонце судна
Артыкул 262. Выдаткі, выкліканыя затрымкай судна дзеля агульнай бяспекі
Артыкул 263. Наступствы прызнання судна непрыдатным да плавання і спынення рэйса
Артыкул 264. Агульная аварыя, выкліканая выдаткамі па ратаванні
Артыкул 265. Агульная аварыя, выкліканая ажыццяўленнем мер па ратаванні
Артыкул 266. Страты ад пашкоджання або гібелі грузу, паліва і прадметаў забеспячэння
Артыкул 267. Урон ад страты фрахту
Артыкул 268. Замяняльныя выдаткі

Артыкул 269. Страты ад пашкоджання судна, яго машын або прыналежнасцей
Артыкул 270. Скідкі «за новае замест старога»
Артыкул 271. Страты ад гібелі судна
Артыкул 272. Страты ад гібелі або пашкоджання грузу
Артыкул 273. Прадастаўленне сродкаў на выдаткі, якія пакрываюцца ў якасці агульнай аварыі
Артыкул 274. Працэнты на страты, якія пакрываюцца ў якасці агульнай аварыі
Артыкул 275. Кантрыбуцыйны кошт
Артыкул 276. Дыспаша і дыспашэры
Артыкул 277. Доказы і матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша
Артыкул 278. Плата за складанне дыспашы
Артыкул 279. Выпраўленне і аспрэчванне дыспашы
Артыкул 280. Выкананне дыспашы
ГЛАВА 23. ПРЫВАТНАЯ АВАРЫЯ
Артыкул 281. Паняцце прыватнай аварыі
Артыкул 282. Адказнасць па прыватнай аварыі
ГЛАВА 24. МАРСКІЯ ПРАТЭСТЫ
Артыкул 283. Заява аб марскім пратэсце
Артыкул 284. Органы, якім робіцца заява аб марскім пратэсце
Артыкул 285. Тэрмін для заявы аб марскім пратэсце
Артыкул 286. Заява аб марскім пратэсце з затрымкай
Артыкул 287. Асаблівасці заявы аб марскім пратэсце пры прычыненні шкоды грузу
Артыкул 288. Доказы
Артыкул 289. Складанне акта аб марскім пратэсце
РАЗДЗЕЛ XIII. БЯСПЕКА ПЛАВАННЯ СУДНАЎ. РАТАВАННЕ НА МОРЫ
ГЛАВА 25. БЯСПЕКА ПЛАВАННЯ СУДНАЎ
Артыкул 290. Бяспека плавання суднаў
ГЛАВА 26. РАТАВАННЕ СУДНАЎ І ІНШАЙ МАЁМАСЦІ
Артыкул 291. Сфера прымянення правіл гэтай главы
Артыкул 292. Дагаворы аб ратаванні
Артыкул 293. Недапушчальнасць і змяненне дагавораў аб ратаванні
Артыкул 294. Абавязкі выратавальніка пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі
Артыкул 295. Абавязкі суднаўладальніка, капітана судна або ўласніка іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў небяспецы
Артыкул 296. Умовы ўзнагароджання
Артыкул 297. Крытэрыі ўстанаўлення ўзнагароджання
Артыкул 298. Спецыяльная кампенсацыя
Артыкул 299. Размеркаванне ўзнагароджання паміж выратавальнікамі
Артыкул 300. Размеркаванне ўзнагароджання паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна
Артыкул 301. Ратаванне людзей
Артыкул 302. Наступствы няправільных паводзін выратавальніка
Артыкул 303. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі ў выпадку прыналежнасці суднаў аднаму і таму ж уладальніку
Артыкул 304. Абавязак прадаставіць забеспячэнне
Артыкул 305. Выратавальныя аперацыі, якія кантралююцца дзяржаўнымі і партовымі ўладамі
РАЗДЗЕЛ XIV. ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ. ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ
ГЛАВА 27. ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ
Артыкул 306. Камерцыйныя і іншыя акты
Артыкул 307. Прэтэнзіі да перавозчыка
Артыкул 308. Іскі па перавозках грузаў
Артыкул 309. Права на прад’яўленне прэтэнзій і іскаў
Артыкул 310. Перадача трэцім асобам права на прад’яўленне прэтэнзій і іскаў
Артыкул 311. Парадак прад’яўлення прэтэнзій
ГЛАВА 28. ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ. ТЭРМІНЫ ДЛЯ ПРАД’ЯЎЛЕННЯ І РАЗГЛЯДУ ПРЭТЭНЗІЙ
Артыкул 312. Тэрміны іскавай даўнасці па патрабаваннях, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў
Артыкул 313. Тэрміны іскавай даўнасці па іншых патрабаваннях
Артыкул 314. Прымяненне агульных тэрмінаў іскавай даўнасці

Артыкул 315. Прыпыненне цячэння тэрміну іскавай даўнасці пры наяўнасці агульнай аварыі
Артыкул 316. Тэрмін для прад'яўлення прэтэнзій, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу
Артыкул 317. Тэрмін разгляду прэтэнзій, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу
РАЗДЗЕЛ XV. ПРЫМЯНЯЛЬНАЕ ПРАВА
ГЛАВА 29. ПРЫМЯНЯЛЬНАЕ ПРАВА
Артыкул 318. Выбар прымяняльнага права
Артыкул 319. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна і судна, якое будуецца
Артыкул 320. Права на затанулую маёмасць
Артыкул 321. Адносіны, якія вынікаюць з дагавораў, заключаных у галіне гандлёвага мараплаўства
Артыкул 322. Права, прымяняльнае пры агульнай аварыі
Артыкул 323. Адносіны па пакрыцці страт ад сутыкнення суднаў
Артыкул 324. Адносіны па ратаванні судна і іншай маёмасці
Артыкул 325. Іпатэка
РАЗДЗЕЛ XVI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 326. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 327. Прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам

Кодэкс гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь вызначае прававыя, эканамічныя і арганізацыйныя асновы гандлёвага мараплаўства з мэтай забеспячэння патрэб эканомікі і насельніцтва ў марскіх перавозках і звязаных з імі работах і паслугах.

## РАЗДЗЕЛ I
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса

Гэты Кодэкс рэгулюе адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з перавозкай суднамі грузаў, пасажыраў і багажу, выкарыстаннем суднаў для буксіроўкі, ажыццяўленнем выратавальных аперацый, а таксама іншыя адносіны ў галіне гандлёвага мараплаўства.

Правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам, распаўсюджваюцца на:

марскія судны падчас іх плавання як па марскіх шляхах, так і па рэках, азёрах, вадасховішчах і іншых унутраных водных шляхах, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае;

судны ўнутранага плавання, а таксама судны змешанага (рака–мора) плавання падчас іх руху па марскіх шляхах, а таксама па рэках, азёрах, вадасховішчах і іншых унутраных водных шляхах пры ажыццяўленні перавозак грузаў, пасажыраў і багажу з заходам у марскі порт, падчас ажыццяўлення выратавальных аперацый і пры сутыкненні з марскім суднам.

Дзеянне гэтага Кодэкса, за выключэннем прадугледжаных у ім або ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь выпадкаў, не распаўсюджваецца на судны, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці або эксплуатуюцца Рэспублікай Беларусь і выкарыстоўваюцца ёю на момант узнікнення патрабаванняў выключна для дзяржаўных некамерцыйных мэт, а таксама на некамерцыйныя грузы, якія знаходзяцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь.

Калі гэтым Кодэксам прадугледжана, што яго правілы распаўсюджваюцца на судны і грузы, указаныя ў частцы трэцяй гэтага артыкула, то такія правілы не павінны выкарыстоўвацца ў якасці падстаў для адабрання, арышту і затрымання такіх суднаў і грузаў.

### Артыкул 2. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе

У гэтым Кодэксе выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

адпраўшчык – асоба, якая ад свайго імені або на падставе дагавора марской перавозкі грузу даручае перавозчыку груз для яго дастаўкі ў пункт прызначэння і выдачы ўпаўнаважанай на атрыманне грузу асобе (атрымальніку);

багаж – рэчы і іншая маёмасць (уключаючы аўтамабіль), якія прыняты перавозчыкам у пасажыра для дастаўкі ў пункт прызначэння і рухаюцца асобна ад пасажыра;

выратавальная аперацыя – дзеянне або дзейнасць, якія ажыццяўляюцца па выратаванні судна, грузу і іншай маёмасці, што знаходзяцца на ім, а таксама па захаванні фрахту і платы за перавозку пасажыраў і багажу ці іншай маёмасці, навакольнага асяроддзя, якія знаходзяцца ў небяспецы ў любых суднаходных або іншых водах;

выратавальнік – асоба, якая ажыццяўляе выратавальную аперацыю;

гандлёвае мараплаўства – дзейнасць, звязаная з выкарыстаннем суднаў з мэтай перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу, рыбнага і іншых марскіх промыслаў, разведкі і распрацоўкі мінеральных рэсурсаў, буксіроўкі, выратавальных аперацый, пад'ёму затанулай маёмасці, гідратэхнічных, падводна-тэхнічных і іншых падобных работ, а таксама для іншых гаспадарчых, навуковых і культурных мэт;

груз – матэрыяльныя каштоўнасці, прынятыя перавозчыкам у адпраўшчыка або фрахтавальніка для дастаўкі марскім транспартам у пункт прызначэння;

дыспач – узнагароджанне, належнае за заканчэнне пагрузкі або разгрузкі грузу да сканчэння сталійнага часу;

дэмерэдж – узнагароджанне, належнае перавозчыку за прастой судна на працягу контрсталійнага часу;

канасамент – таварараспарадчы дакумент (каштоўная папера), які сведчыць заключэнне дагавора марской перавозкі грузу і служыць доказам прыёму перавозчыкам указанага ў гэтым дакуменце грузу;

каютны багаж – рэчы і іншая маёмасць, якія знаходзяцца ў каюце пасажыра або іншым чынам знаходзяцца пад яго аховай або кантролем;

класіфікацыйнае таварыства – арганізацыя, якая прысвойвае клас суднам паводле адпаведных класіфікацыйных патрабаванняў і ажыццяўляе тэхнічны нагляд за суднамі ў працэсе іх будаўніцтва і эксплуатацыі;

контрсталійны час – дадатковы пасля заканчэння сталійнага часу час чакання;

мараходнасць судна – здольнасць судна бяспечна плаваць у любое надвор'е ва ўстаноўленых раёнах з мінімальнымі стратамі хуткасці, без рызыкі для жыцця і здароўя экіпажа судна і пасажыраў і для захаванасці грузу;

марская перавозка – сукупнасць арганізацыйна і тэхналагічна ўзаемазвязаных аперацый па перамяшчэнні пасажыраў, грузаў і багажу марскім транспартам;

марскі транспарт – сукупнасць камунікацый і суднаў, якія забяспечваюць дзейнасць па марской перавозцы пасажыраў, грузаў і багажу;

марскі транспарт агульнага карыстання – марскі транспарт, які ажыццяўляе транспартныя работы і паслугі, заснаваныя на абавязку іх выканання пасля звароту любога грамадзяніна або юрыдычнай асобы;

партовыя ўлады – адпаведныя адміністрацыі партоў, якія ажыццяўляюць адміністрацыйна-ўладныя і іншыя ўскладзеныя на іх паўнамоцтвы;

пасажыр – фізічная асоба, якая мае праязны дакумент (білет), што сведчыць заключэнне дагавора марской перавозкі пасажыраў;

перавозчык – асоба, якая самастойна або іншым чынам ажыццяўляе марскую перавозку пасажыраў, грузаў і багажу ў адпаведнасці з дагаворам марской перавозкі;

порт – комплекс збудаванняў, размешчаных на спецыяльна адведзенай тэрыторыі і акваторыі і прызначаных для абслугоўвання суднаў і пасажыраў, ажыццяўлення аперацый з грузамі і іншых паслуг, якія звычайна аказваюцца ў порце;

сталійны час – перыяд часу, на працягу якога перавозчык прадастаўляе і трымае судна пад пагрузкай або разгрузкай без дадатковых да фрахту плацяжоў;

судна – самаходнае або несамаходнае плывучае збудаванне, прызначанае для выкарыстання з мэтай гандлёвага мараплаўства;

суднаўладальнік – асоба, якая эксплуатуе судна ад свайго імені незалежна ад таго, з'яўляецца яна ўласнікам судна або асобай, якая выкарыстоўвае яго на іншай законнай падставе;

тэхнічны нагляд – праверкі суднаў, якія ажыццяўляюцца класіфікацыйным таварыствам у адпаведнасці з выдадзенымі гэтым таварыствам правіламі класіфікацыі суднаў, правіламі пабудовы суднаў, правіламі тэхнічнага нагляду за вытворчасцю матэрыялаў і вырабаў для суднаў, правіламі тэхнічнага нагляду за пабудовай суднаў, правіламі тэхнічнага нагляду і асведчання суднаў у працэсе іх эксплуатацыі, правіламі прадухілення забруджвання навакольнага асяроддзя з суднаў;

уласнік судна – суб'ект права ўласнасці або асоба, якая ажыццяўляе ў дачыненні да судна правы, да якіх прымяняюцца правілы аб праве ўласнасці;

фактычны перавозчык – асоба, якой перавозчыкам даручана ажыццяўленне марской перавозкі або яе часткі, ці іншая асоба, якой даручана ажыццяўленне марской перавозкі або яе часткі;

экіпаж судна – асобы, унесеныя ў спіс членаў экіпажа судна (суднавую ролю), якім ва ўстаноўленым парадку даручана выкананне абавязкаў па кіраванні суднам і яго абслугоўванні, а таксама па захаванні бяспекі плавання, прадухіленні прычынення шкоды судну і людзям, багажу і грузу, якія знаходзяцца на ім.

**Артыкул 3. Суб'екты гандлёвага мараплаўства**

Суб'ектамі гандлёвага мараплаўства з'яўляюцца Рэспубліка Беларусь у асобе ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржавы, юрыдычныя і (або) фізічныя асобы, уключаючы замежныя, а таксама асобы без грамадзянства, якія ажыццяўляюць гандлёвае мараплаўства.

**Артыкул 4. Заканадаўства ў галіне гандлёвага мараплаўства**

Заканадаўства ў галіне гандлёвага мараплаўства грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Кодэкса, дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іншых актаў заканадаўства.

Маёмасныя адносіны, якія ўзнікаюць з гандлёвага мараплаўства і заснаваны на роўнасці, аўтаноміі волі і маёмаснай самастойнасці іх удзельнікаў, рэгулююцца гэтым Кодэксам у адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь. Да маёмасных адносін, якія не рэгулююцца або не поўнасцю рэгулююцца гэтым Кодэксам, прымяняюцца правілы грамадзянскага заканадаўства.

Да іншых адносін, якія ўзнікаюць з гандлёвага мараплаўства і не рэгулююцца гэтым Кодэксам, прымяняюцца адпаведныя нормы заканадаўства.

**Артыкул 5. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь**

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Кодэксам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

**Артыкул 6. Дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне гандлёвага мараплаўства**

Пад дзяржаўным рэгуляваннем у галіне гандлёвага мараплаўства маецца на ўвазе дзейнасць дзяржаўных органаў па стварэнні эканамічных, арганізацыйных і прававых умоў для ажыццяўлення і развіцця гандлёвага мараплаўства, якая ўключае:

1) вызначэнне і рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне гандлёвага мараплаўства;

2) заключэнне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у галіне гандлёвага мараплаўства;

3) распрацоўку праграм развіцця і функцыянавання марскога гандлёвага флоту Рэспублікі Беларусь;

4) выданне нарматыўных прававых актаў у галіне гандлёвага мараплаўства.

**Артыкул 7. Дзяржаўны кантроль у галіне гандлёвага мараплаўства**

Дзяржаўны кантроль у галіне гандлёвага мараплаўства ў Рэспубліцы Беларусь ускладаецца на рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту, які ажыццяўляе:

1) кантроль за выкананнем заканадаўства ў галіне гандлёвага мараплаўства;

2) гарантаванне бяспекі гандлёвага мараплаўства, аховы жыцця і здароўя людзей на моры, абароны і захавання марскога асяроддзя;

3) дзяржаўную рэгістрацыю суднаў, суднаў, якія будуюцца, і правоў на іх;

4) арганізацыю дыпламавання спецыялістаў гандлёвага мараплаўства;

5) выключаны;

6) выключаны;

7) іншыя функцыі, прадугледжаныя заканадаўствам.

**Артыкул 8. Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў**

Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў ажыццяўляюцца класіфікацыйным таварыствам на выбар суднаўладальніка.

У Рэспубліцы Беларусь класіфікацыйныя таварыствы ажыццяўляюць дзейнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства і міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у галіне гандлёвага мараплаўства.

Класіфікацыйныя таварыствы выдаюць правілы класіфікацыі суднаў, правілы пабудовы суднаў, правілы тэхнічнага нагляду за вытворчасцю матэрыялаў і вырабаў для суднаў, правілы тэхнічнага нагляду за пабудовай суднаў, правілы тэхнічнага нагляду і асведчання суднаў у працэсе іх эксплуатацыі, правілы прадухілення забруджвання навакольнага асяроддзя з суднаў.

Класіфікацыйнае таварыства мае права пры невыкананні яго правіл, патрабаванняў заканадаўства і міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у галіне гандлёвага мараплаўства не выдаваць і забіраць раней выдадзеныя ім суднавыя дакументы.

Класіфікацыйнае таварыства ажыццяўляе тэхнічны нагляд і класіфікацыю:

1) пасажырскіх і наліўных суднаў, суднаў, прызначаных для перавозкі небяспечных грузаў, а таксама для буксіроўкі, незалежна ад магутнасці галоўных рухавікоў і валавой умяшчальнасці;

2) самаходных суднаў, не ўказаных у пункце 1 гэтай часткі, магутнасцю галоўных рухавікоў 55 кВт і больш;

3) суднаў, не ўказаных у пунктах 1 і 2 гэтай часткі, валавой умяшчальнасцю 80 рэгістравых тон і больш.

Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў, не ўказаных у частцы пятай гэтага артыкула, ажыццяўляюцца арганізацыяй, якая вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9. Тарыфы**

Тарыфы на марскую перавозку грузаў, пасажыраў і багажу марскім транспартам агульнага карыстання, а таксама правілы прымянення гэтых тарыфаў устанаўліваюцца ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 10. Разліковая адзінка**

Разліковай адзінкай, якая прымяняецца гэтым Кодэксам, з’яўляецца адзінка спецыяльнага права запазычання, якая вызначаецца Міжнародным валютным фондам. У выпадку неабходнасці сумы, указаныя ў гэтым Кодэксе ў разліковых адзінках, пераводзяцца ў беларускія рублі па курсе Нацыянальнага банка на дату вынясення судовага рашэння або на дату, устаноўленую пагадненнем бакоў.

## РАЗДЗЕЛ II
## СУДНА

### ГЛАВА 2
### УЛАСНАСЦЬ НА СУДНА

**Артыкул 11. Формы ўласнасці на судна**

Судны могуць знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (уласнасці Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак), у прыватнай уласнасці юрыдычных і (або) фізічных асоб, у тым ліку замежных, а таксама асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Судны з ядзернай энергетычнай устаноўкай могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 12. Момант узнікнення права ўласнасці на судна і судна, якое будуецца**

Права ўласнасці на судна або на долю ў ёй узнікае з моманту рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй узнікае з моманту рэгістрацыі такога права ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

**Артыкул 13. Правы ўласніка судна**

Уласнік судна мае права паводле свайго меркавання ажыццяўляць у дачыненні да свайго судна любыя дзеянні, якія не супярэчаць заканадаўству, грамадскай карысці і бяспецы, не наносяць шкоды навакольнаму асяроддзю, гісторыка-культурным каштоўнасцям і не ўшчамляюць правоў і абароненых законам інтарэсаў іншых асоб, у тым ліку адчужаць судна ва ўласнасць іншым асобам, перадаваць ім, застаючыся ўласнікам, правы валодання, карыстання і распараджэння суднам, аддаваць судна ў іпатэку і абцяжарваць яго іншымі спосабамі, а таксама выкарыстоўваць яго іншым чынам.

Адчужэнне судна, якое знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, ва ўласнасць замежнай дзяржаве, замежнай юрыдычнай і (або) фізічнай асобе дапускаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

**Артыкул 14. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна, якое будуецца**

Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй вызначаюцца паводле права месца заключэння дагавора на будаўніцтва судна, калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем бакоў.

**Артыкул 15. Перадача судна ў давернае кіраванне**

Уласнік судна мае права перадаць яго davернаму кіраўніку па дагаворы давернага кіравання суднам на тэрмін, які не перавышае пяці гадоў, для ажыццяўлення кіравання суднам за ўзнагароджанне ў інтарэсах уласніка.

Судна, якое знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні, не можа быць перададзена ў давернае кіраванне.

Перадача судна ў давернае кіраванне не цягне за сабой пераходу права ўласнасці на яго да давернага кіраўніка.

Перадача судна ў давернае кіраванне падлягае абавязковай рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Даверным кіраўніком могуць быць кампетэнтны ў галіне кіравання суднамі і іх эксплуатацыі індывідуальны прадпрымальнік або камерцыйная арганізацыя, за выключэннем унітарнага прадпрыемства.

Дагавор давернага кіравання суднам павінен быць заключаны ў пісьмовай форме.

У дагаворы давернага кіравання суднам павінны быць указаны:

1) прадмет дагавора, у тым ліку характарыстыка судна, якое перадаецца ў давернае кіраванне, і яго кошт;

2) межы выкарыстання судна даверным кіраўніком;

3) найменне юрыдычнай асобы або імя грамадзяніна, у інтарэсах якіх ажыццяўляецца кіраванне суднам (даверніка або выгаданабывальніка);

4) памер і форма ўзнагароджання давернаму кіраўніку, калі выплата ўзнагароджання прадугледжана дагаворам;

5) тэрмін дзеяння дагавора.

## ГЛАВА 3
## НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ І ФЛАГ СУДНА

**Артыкул 16. Права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь**

Права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь даецца суднам:

1) якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

2) якія знаходзяцца ва ўласнасці юрыдычных і (або) фізічных асоб, у тым ліку замежных, а таксама асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

3) якія эксплуатуюцца юрыдычнымі і (або) фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу.

Права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь суднам, указаным у пункце 3 часткі першай гэтага артыкула, прадастаўляецца на тэрмін дзеяння дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу.

**Артыкул 17. Узнікненне права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь**

Судна набывае права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь з моманту рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Судна, набытае за мяжой, карыстаецца правам плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь з моманту выдачы консулам Рэспублікі Беларусь (дыпламатычным

прадстаўніком) часовага пасведчання, якое сведчыць гэта права і правадзейнае да ўнясення судна ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, але на тэрмін, які не перавышае аднаго года.

**Артыкул 18. Адказнасць за незаконнае падняцце на судне Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь**

За падняцце на судне Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь без права плавання пад гэтым флагам вінаватыя асобы нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўствам.

**Артыкул 19. Нацыянальнасць судна**

Судна, якое карыстаецца правам плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь, мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь.

Судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь, абавязана несці Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Страта суднам права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь**

Судна страчвае права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь у выпадках неадпаведнасці ўмовам, прадугледжаным артыкулам 16 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 21. Часовая страта суднам права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь**

Калі ўласнік судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь, на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу перадаў судна ў эксплуатацыю замежнай юрыдычнай або фізічнай асобе, судна па рашэнні рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту часова страчвае права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь пры ўмове, калі:

1) заканадаўства дзяржавы, нацыянальнасць якой часова прадастаўляецца судну, не забараняе змены флага;

2) уласнік судна выказаў сваю згоду на часовы перавод судна пад флаг замежнай дзяржавы;

3) закладатрымальнікі зарэгістраваных іпатэк выказалі сваю пісьмовую згоду на часовы перавод судна пад флаг замежнай дзяржавы.

## ГЛАВА 4
## ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ СУДНАЎ

**Артыкул 22. Рэестры суднаў**

У Рэспубліцы Беларусь судны рэгіструюцца ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

У Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь рэгіструюцца судны, тэхнічны нагляд за якімі ажыццяўляецца класіфікацыйным таварыствам.

Судны, не падлеглыя рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, рэгіструюцца ў суднавай кнізе.

У Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнізе не рэгіструюцца шлюпкі і іншыя плывучыя сродкі, якія з’яўляюцца прыналежнасцю якога-небудзь судна.

Судны, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці або эксплуатуюцца Рэспублікай Беларусь і выкарыстоўваюцца ёю выключна для дзяржаўных некамерцыйных мэт,

рэгіструюцца ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым Кодэксам.

**Артыкул 23. Орган, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў**

Дзяржаўная рэгістрацыя суднаў ажыццяўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Парадак вядзення Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнігі ўстанаўліваецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

**Артыкул 24. Умовы дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў**

Судна можа быць зарэгістравана толькі ў адным з рэестраў суднаў.

Судна, зарэгістраванае ў рэестры суднаў замежнай дзяржавы, можа быць зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе пры ўмове, калі яно выключана з рэестра суднаў замежнай дзяржавы з прадастаўленнем адпаведнага пасведчання або пасведчання, якое сведчыць, што гэта судна будзе неадкладна выключана з рэестра суднаў замежнай дзяржавы з моманту яго дзяржаўнай рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Замежнае судна, якое эксплуатуецца юрыдычнымі і (або) фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу, можа быць зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе пасля прыпынення яго рэгістрацыі ў рэестры суднаў дзяржавы асноўнай рэгістрацыі з прадастаўленнем адпаведнага пасведчання ці калі на момант заключэння ўказаных дагавораў гэта судна не было ўнесена ў рэестр суднаў іншай дзяржавы.

Рэгістрацыя судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь, у рэестры суднаў замежнай дзяржавы не мае юрыдычнай сілы, калі судна не выключана ва ўстаноўленым парадку з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі.

Судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь і эксплуатуецца замежнымі фізічнымі і (або) юрыдычнымі асобамі на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу, можа быць зарэгістравана ў рэестры суднаў замежнай дзяржавы пры ўмове прыпынення яго дзяржаўнай рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе і прадстаўлення пісьмовай згоды ўсіх закладатрымальнікаў зарэгістраваных іпатэк судна.

**Артыкул 25. Звесткі, падлеглыя ўнясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу**

У Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносяцца наступныя звесткі:

1) парадкавы рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі судна;

2) назва судна (цяперашняя і ранейшая), порт (месца) папярэдняй рэгістрацыі судна;

3) найменне порта (месца) дзяржаўнай рэгістрацыі судна;

4) міжнародны пазыўны сігнал судна, калі ён ёсць;

5) тып і прызначэнне судна, раён яго плавання;

6) назва класіфікацыйнага таварыства, код судна, сімвал класа і тэрмін яго дзеяння;

7) асноўныя тэхнічныя характарыстыкі судна, у тым ліку ўмяшчальнасць (валавая і чыстая), поўная грузападымальнасць і галоўныя памеры судна;

8) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, месца жыхарства і грамадзянства або найменне і месца знаходжання ўласніка (уласнікаў) судна;

9) доля кожнага з уласнікаў у агульнай долевай уласнасці, калі ёсць некалькі ўласнікаў;

10) падстава ўзнікнення права ўласнасці на судна або частку судна (дагавор куплі-продажу, дагавор на будаўніцтва судна і г.д.);

11) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, месца жыхарства або найменне і месца знаходжання суднаўладальніка, калі ён не з'яўляецца ўласнікам судна;

12) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, месца жыхарства або найменне і месца знаходжання давернага кіраўніка пры перадачы судна яму ў кіраванне;

13) даныя аб зарэгістраванай іпатэцы судна;

14) падстава і дата выключэння судна з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі.

Пры часовым пераводзе судна пад флаг замежнай дзяржавы ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносяцца таксама наступныя асноўныя звесткі:

1) указанне аб рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту, які прыняў рашэнне аб пераводзе судна пад флаг замежнай дзяржавы, і дата прыняцця такога рашэння;

2) тэрмін, на які дапускаецца перавод судна пад флаг замежнай дзяржавы;

3) назва дзяржавы, пад флагам якой судну дазволена плаваць;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, месца жыхарства або найменне і месца знаходжання арандатара судна па бербоўт-чартары;

5) дата прыпынення дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

**Артыкул 26. Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе**

Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе павінна адпавядаць тыпавой форме, якая зацвярджаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту, і ўтрымліваць звесткі, прадугледжаныя часткай першай артыкула 25 гэтага Кодэкса.

Да заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе дадаюцца дакументы ў адпаведнасці з пералікам, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 27. Дзяржаўная рэгістрацыя судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе**

Дзяржаўная рэгістрацыя судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе ажыццяўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту ў тэрмін да пятнаццаці дзён з дня рэгістрацыі заявы аб рэгістрацыі судна.

У Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе судны рэгіструюцца на імя ўласніка (уласнікаў).

Судна, якое эксплуатуецца юрыдычнымі і (або) фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу, рэгіструецца ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе на імя арандатара або лізінгаатрымальніка судна.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту выдаецца пасведчанне аб праве плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь і

пасведчанне аб праве ўласнасці на судна. Судну, зарэгістраванаму ў суднавай кнізе, выдаецца суднавы білет.

Пасля дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе судну прысвойваецца рэгістрацыйны нумар.

**Артыкул 28. Асаблівасці дзяржаўнай рэгістрацыі замежнага судна, якое эксплуатуецца на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу**

Для дзяржаўнай рэгістрацыі замежнага судна, якое эксплуатуецца на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу, прадстаўляюцца дакументы ў адпаведнасці з пералікам, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі судна, якое эксплуатуецца на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) або дагавора лізінгу, выдаецца пасведчанне аб праве плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь на тэрмін, які не перавышае тэрміну дзеяння гэтых дагавораў.

**Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй**

Дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй ажыццяўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй можа быць ажыццёўлена з моманту закладкі кіля на падставе экспертнага заключэння, якое ўтрымлівае звесткі, што тычацца даўжыні кіля і іншых асноўных памераў судна, выкарыстаных будаўнічых матэрыялаў, машын, абсталявання, якія знаходзяцца ў межах суднабудаўнічай верфі і маркіраваных або ідэнтыфікаваных іншым спосабам як прыналежныя судну, якое будуецца.

Для ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй у Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе прадстаўляюцца дакументы ў адпаведнасці з пералікам, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй выдаецца пасведчанне аб праве ўласнасці на судна, якое будуецца.

**Артыкул 30. Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, якія ўносяцца ў рэестры суднаў**

Аб змяненнях звестак, падлеглых унясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, уласнік, арандатар ці лізінгаатрымальнік судна абавязаны паведаміць органу, які рэгіструе, на працягу двух тыдняў з дня атрымання інфармацыі аб такіх змяненнях.

Для ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў звестак, у тым ліку іпатэкі, падлеглых унясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, прадстаўляюцца дакументы ў адпаведнасці з пералікам, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Пры пераходзе права ўласнасці на судна або на долю ў ёй у Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносяцца адпаведныя змяненні з указаннем даты рэгістрацыі права ўласнасці на судна або на долю ў ёй і выдаецца пасведчанне аб праве ўласнасці або суднавы білет на імя новага ўласніка.

У выпадку, калі судна ў выніку здарэння ці па любой іншай прычыне змянілася настолькі, што перастала адпавядаць даным, раней унесеным у Дзяржаўны рэестр марскіх

суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, яно можа быць перарэгістравана ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі артыкулам 26 гэтага Кодэкса, пасля яго асведчання і атрымання класіфікацыйнага пасведчання.

**Артыкул 31. Страта дакументаў, якія пацвярджаюць факт дзяржаўнай рэгістрацыі судна**

У выпадку страты пасведчання аб праве плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь, суднавага білета, пасведчання аб праве ўласнасці на судна або судна, якое будуецца, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту выдаецца дублікат такога дакумента.

Для атрымання дублікатаў дакументаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, прадстаўляюцца дакументы ў адпаведнасці з пералікам, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Калі судна ў момант страты дакументаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, знаходзіцца за мяжой, то консулам Рэспублікі Беларусь (дыпламатычным прадстаўніком) па заяве капітана судна выдаецца часовае пасведчанне аб праве плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь або часовы суднавы білет, але на тэрмін, які не перавышае аднаго года.

**Артыкул 32. Выключаны**

**Артыкул 33. Адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі судна**

У дзяржаўнай рэгістрацыі судна можа быць адмоўлена ў выпадку невыканання заяўнікам патрабаванняў артыкулаў 15, 24 і 26 гэтага Кодэкса, а таксама ў іншых выпадках у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі судна, права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй можа быць абскарджана ў судовым парадку.

**Артыкул 34. Адказнасць за парушэнне правіл дзяржаўнай рэгістрацыі судна**

Асобы, якія зарэгістравалі судна ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе шляхам падману ці парушылі патрабаванні часткі першай артыкула 30 гэтага Кодэкса, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 35. Выключэнне судна з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнігі**

З Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнігі выключаюцца судны:

1) затанулыя, поўнасцю разбураныя або якія прапалі без вестак;

2) канструктыўна загінулыя;

3) якія страцілі права плавання пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь;

4) якія страцілі якасці судна ў выніку перабудовы або іншых істотных змяненняў.

Судны, указаныя ў пункце 3 часткі першай гэтага артыкула, могуць быць выключаны з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі толькі з пісьмовай згоды ўсіх закладатрымальнікаў зарэгістраваных іпатэк судна.

Рашэнне рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту аб выключэнні судна з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 36. Судна, якое прапала без вестак**

Судна лічыцца суднам, што прапала без вестак, калі на працягу тэрміну, які ў два разы перавышае тэрмін, неабходны ў нармальных умовах для пераходу ад месца, з якога паступіла апошняе паведамленне аб судне, да порта прызначэння, аб судне не паступіла ніякіх паведамленняў.

Тэрмін, неабходны для прызнання судна такім, што прапала без вестак, не можа быць меншым за адзін месяц і большым за тры месяцы, а ва ўмовах ваенных дзеянняў – меншым за шэсць месяцаў з дня апошняга паведамлення аб судне.

**Артыкул 37. Судна, канструктыўна загінулае**

Пашкоджанае судна лічыцца канструктыўна загінулым у выпадках:

немагчымасці аднаўлення судна ні ў месцы яго знаходжання, ні ў любым іншым месцы, куды яно можа быць дастаўлена;

эканамічнай немэтазгоднасці рамонту судна.

**Артыкул 38. Права на атрыманне інфармацыі з рэестраў суднаў**

Зацікаўленыя асобы маюць права на атрыманне інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў рэестрах суднаў, у выглядзе належна аформленай выпіскі з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь і суднавай кнігі.

## ГЛАВА 5
## ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ СУДНА

**Артыкул 39. Назва судна**

Судна, падлеглае дзяржаўнай рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе, павінна мець назву. Назва судна прысвойваецца ўласнікам судна.

Назва судна павінна адрозніваецца ад назваў іншых зарэгістраваных суднаў.

Назва судна наносіцца на насавую частку на абодвух бартах і на карму судна. Новая назва можа быць нанесена на судна толькі пасля ўнясення адпаведнага змянення ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу.

Аб змяненні назвы судна ўласнік судна неадкладна паведамляе закладатрымальнікам зарэгістраваных іпатэк судна.

**Артыкул 40. Міжнародны пазыўны сігнал**

Судну, абсталяванаму сродкамі сувязі, прысвойваецца міжнародны пазыўны сігнал.

У залежнасці ад тэхнічнай аснашчанасці судна яму прысвойваюцца таксама ідэнтыфікацыйны нумар суднавай станцыі спадарожнікавай сувязі і нумар выбіральнага выкліку суднавай станцыі.

Парадак прысваення міжнароднага пазыўнога сігналу, ідэнтыфікацыйнага нумара суднавай станцыі спадарожнікавай сувязі і нумара выбіральнага выкліку суднавай станцыі вызначаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне сувязі.

**Артыкул 41. Порт прыпіскі судна**

Портам прыпіскі судна лічыцца месца яго дзяржаўнай рэгістрацыі. Порт прыпіскі судна ўказваецца на карме пад назвай судна.

## ГЛАВА 6
## СУДНАВЫЯ ДАКУМЕНТЫ

### Артыкул 42. Суднавыя дакументы, якія знаходзяцца на судне

На судне павінны знаходзіцца наступныя суднавыя дакументы:

1) пасведчанне аб праве плавання судна пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь;

2) пасведчанне аб праве ўласнасці на судна;

3) пасведчанне аб бяспецы грузавога судна па канструкцыі;

4) пасведчанне аб бяспецы пасажырскага судна (для пасажырскіх суднаў);

5) пасведчанне аб бяспецы грузавога судна па забеспячэнні;

6) пасведчанне аб бяспецы грузавога судна па радыёабсталяванні;

7) класіфікацыйнае пасведчанне;

8) міжнароднае вымяральнае пасведчанне (для суднаў, падлеглых тэхнічнаму нагляду класіфікацыйнага таварыства);

9) міжнароднае пасведчанне аб грузавой марцы судна (аб найменшай вышыні надводнага борта);

10) дазвол на эксплуатацыю суднавай радыёстанцыі і радыёжурнал (пры наяўнасці радыёстанцыі);

11) спіс членаў экіпажа судна (суднавая роля);

12) спіс пасажыраў, якія знаходзяцца на судне;

13) пасведчанне аб мінімальным складзе экіпажа судна;

14) суднавы журнал;

15) машынны журнал (для суднаў з механічным рухавіком);

16) журнал аперацый па прадухіленні забруджвання мора;

17) міжнароднае пасведчанне аб прадухіленні забруджвання мора нафтай;

18) міжнароднае пасведчанне аб прадухіленні забруджвання мора сцёкавымі водамі;

19) іншыя дакументы, прадугледжаныя рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Судна, зарэгістраванае ў суднавай кнізе, замест дакументаў, указаных у пунктах 1 і 2 часткі першай гэтага артыкула, павінна мець суднавы білет.

### Артыкул 43. Суднавыя дакументы для некаторых катэгорый суднаў

Судна, не падлеглае тэхнічнаму нагляду класіфікацыйнага таварыства, павінна мець наступныя дакументы:

1) суднавы білет;

2) пасведчанне аб прыдатнасці да плавання;

3) спіс членаў экіпажа судна (суднавую ролю).

### Артыкул 44. Органы, якія выдаюць суднавыя дакументы

Класіфікацыйнае пасведчанне, міжнароднае вымяральнае пасведчанне і міжнароднае пасведчанне аб грузавой марцы судна выдаюцца класіфікацыйным таварыствам.

Суднавыя дакументы, прадугледжаныя міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь па пытаннях бяспекі мараплаўства і прадухілення забруджвання з суднаў, выдаюцца органам, прызнаным Урадам Рэспублікі Беларусь.

Дазвол на эксплуатацыю суднавай радыёстанцыі выдаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне сувязі.

### Артыкул 45. Прызнанне дакументаў, выдадзеных замежным класіфікацыйным таварыствам

Пасведчанні, выдадзеныя судну, якое плавае пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь, замежным класіфікацыйным таварыствам, у выпадку, калі Рэспублікай Беларусь не заключана міжнароднае пагадненне аб узаемным прызнанні адпаведных дакументаў, прызнаюцца правадзейнымі пры ўмове, што такое замежнае класіфікацыйнае таварыства афіцыйна прызнанае Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да суднавых дакументаў**

Дакументы, указаныя ў артыкулах 42 і 43 гэтага Кодэкса, павінны знаходзіцца на судне ў арыгіналах, за выключэннем пасведчання аб праве ўласнасці на судна і суднавага білета, якія могуць знаходзіцца на судне ў натарыяльна засведчаных копіях.

**Артыкул 47. Правілы афармлення суднавых дакументаў і захоўвання суднавага журнала**

Спіс членаў экіпажа судна (суднавая роля), спіс пасажыраў, якія знаходзяцца на судне, суднавы, машынны і радыёжурналы вядуцца па форме і правілах, якія ўстанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Суднавы журнал захоўваецца на судне на працягу пяці гадоў з моманту ўнясення ў яго апошняга запісу і прадастаўляецца для кантролю і зняцця копій асобам, зацікаўленым у атрыманні адпаведнай інфармацыі. Па сканчэнні ўказанага тэрміну суднавы журнал перадаецца ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

## РАЗДЗЕЛ III
## ЭКІПАЖ СУДНА. КАПІТАН СУДНА

### ГЛАВА 7
### ЭКІПАЖ СУДНА

**Артыкул 48. Склад экіпажа судна**

Экіпаж судна складаецца з капітана судна, іншых асоб каманднага складу судна і суднавай каманды.

Да каманднага складу судна, акрамя капітана судна, адносяцца памочнікі капітана судна, суднавыя механікі, электрамеханікі, радыёспецыялісты і ўрачы. Суднаўладальнікам да каманднага складу могуць быць аднесены таксама іншыя суднавыя спецыялісты.

Суднавая каманда складаецца з членаў экіпажа судна, якія не адносяцца да каманднага складу судна.

**Артыкул 49. Мінімальны склад экіпажа судна**

Кожнае судна павінна мець на борце экіпаж, члены якога маюць належную кваліфікацыю і склад якога дастатковы па колькасці для:

1) захавання бяспекі плавання, абароны марскога асяроддзя;

2) выканання патрабаванняў да прытрымлівання працоўнага часу на борце судна;

3) недапушчэння перагрузкі членаў экіпажа судна працай.

Мінімальна дапушчальны склад экіпажа судна для выхаду судна ў мора ўстанаўліваецца ў залежнасці ад тыпу, прызначэння і раёна плавання судна рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

**Артыкул 50. Прававое становішча членаў экіпажа судна**

Прававое становішча членаў экіпажа судна і адносіны паміж членамі экіпажа судна, звязаныя з эксплуатацыяй судна, вызначаюцца правам дзяржавы флага судна.

Адносіны паміж членамі экіпажа судна і суднаўладальнікам вызначаюцца правам дзяржавы флага судна, калі іншае не прадугледжана дагаворам, што рэгулюе адносіны паміж суднаўладальнікам і членамі экіпажа судна, якія з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі.

**Артыкул 51. Грамадзянства членаў экіпажа судна**

У склад экіпажа судна нараўне з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь могуць уваходзіць замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства.

Пасады капітана судна, старшага памочніка капітана судна, старшага механіка і радыёспецыяліста могуць займаць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

**Артыкул 52. Нацыянальнае пасведчанне асобы марака**

Да працы на судне дапускаюцца асобы, якія маюць дакумент – нацыянальнае пасведчанне асобы марака, выдадзены ў адпаведнасці з Канвенцыяй 1958 года аб пасведчаннях асобы маракоў.

У Рэспубліцы Беларусь нацыянальнае пасведчанне асобы марака Рэспублікі Беларусь выдае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 53. Патрабаванні да кваліфікацыі членаў экіпажа судна**

Да займання пасад капітана судна і іншых асоб каманднага складу дапускаюцца асобы, якія маюць адпаведныя званні, устаноўленыя Палажэннем аб званнях асоб каманднага складу марскіх суднаў, якое зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь. Прысваенне ўказаных званняў сведчыцца выдачай дыпломаў або кваліфікацыйных пасведчанняў.

Да займання пасад каманднага складу, для якіх не прадугледжваецца прысваенне званняў, а таксама членаў суднавай каманды дапускаюцца асобы, якія маюць дыпломы або кваліфікацыйныя пасведчанні, калі такія дыпломы або кваліфікацыйныя пасведчанні патрабуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Пазбаўленне звання, адабранне дыплома або кваліфікацыйнага пасведчання дапускаюцца толькі па рашэнні суда.

**Артыкул 54. Патрабаванні да стану здароўя членаў экіпажа судна**

Да працы на судне дапускаюцца асобы, якія маюць пасведчанні, што пацвярджаюць іх прыдатнасць да гэтай працы па стане здароўя.

**Артыкул 55. Працоўныя адносіны на судне**

Парадак прыёму на працу членаў экіпажа судна, іх правы і абавязкі, умовы і аплата працы на судне, а таксама парадак і падставы іх звальнення ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам, статутамі службы на суднах, іншым заканадаўствам, а таксама генеральнымі і галіновымі тарыфнымі пагадненнямі, калектыўнымі і індывідуальнымі працоўнымі дагаворамі.

Статут службы на суднах, за выключэннем суднаў рыбапромыславага флоту, зацвярджаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Статут службы на суднах рыбапромыславага флоту зацвярджаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскіх промыслаў.

**Артыкул 56. Абавязкі суднаўладальніка**

Бяспечныя ўмовы працы на судне, ахова жыцця і здароўя членаў экіпажа судна і аснашчэнне судна ўсімі неабходнымі для гэтага сродкамі і абсталяваннем, а таксама бесперабойнае забеспячэнне экіпажа судна харчаваннем і вадой, прадастаўленне належных суднавых памяшканняў забяспечваюцца суднаўладальнікам у адпаведнасці з правіламі, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту, а ў дачыненні да рыбапромыславага судна – у адпаведнасці з правіламі, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскіх промыслаў.

**Артыкул 57. Рэпатрыяцыя членаў экіпажа судна**

Суднаўладальнік абавязаны за свой кошт забяспечыць рэпатрыяцыю члена экіпажа судна ў выпадках:

1) сканчэння тэрміну дзеяння працоўнага дагавора, заключанага на пэўны тэрмін або на адзін рэйс, у момант знаходжання члена экіпажа судна за межамі Рэспублікі Беларусь;

2) гібелі судна;

3) хваробы або атрымання траўмы членам экіпажа судна, якія патрабуюць лячэння па-за суднам;

4) немагчымасці выканання суднаўладальнікам сваіх абавязкаў у дачыненні да членаў экіпажа судна, якія прадугледжваюцца заканадаўствам або калектыўным працоўным дагаворам, з прычыны банкруцтва, продажу судна або змянення дзяржавы рэгістрацыі судна;

5) спынення працоўнага дагавора па ініцыятыве суднаўладальніка.

Рэпатрыяцыя члена экіпажа судна ажыццяўляецца на яго выбар у порт, у якім ён быў наняты, або ў порт, з якога пачаўся рэйс судна, або ў месца, указанае ў калектыўным або індывідуальным працоўным дагаворы.

Суднаўладальнік абавязаны арганізаваць рэпатрыяцыю члена экіпажа судна і аплаціць выдаткі на яго праезд і правоз багажу ў колькасці, агаворанай у кантракце, харчаванне і пражыванне да прыбыцця ў месца, указанае ў частцы другой гэтага артыкула, а ў выпадку хваробы члена экіпажа судна – таксама на лячэнне да транспартабельнага стану.

Пры невыкананні суднаўладальнікам абавязкаў, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула, гэтыя абавязкі прымае на сябе Урад Рэспублікі Беларусь з наступным спагнаннем з суднаўладальніка панесеных выдаткаў.

**Артыкул 58. Асабістая маёмасць члена экіпажа судна**

Член экіпажа судна мае права правозіць на судне маёмасць, прызначаную для асабістага карыстання.

У выпадку гібелі або пашкоджання асабістай маёмасці члена экіпажа судна з прычыны здарэння з суднам суднаўладальнік кампенсуе прычыненыя страты. Кошт

асабістай маёмасці членаў экіпажа судна, вінаватых у здарэнні з суднам, пакрыццю не падлягае.

**Артыкул 59. Узаемаадносіны членаў экіпажа судна з консуламі Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнымі прадстаўнікамі)**

Узаемаадносіны капітана судна і іншых членаў экіпажа судна з консуламі Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнымі прадстаўнікамі) вызначаюцца Консульскім статутам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8
## ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ КАПІТАНА СУДНА

**Артыкул 60. Кіраванне суднам і іншыя абавязкі капітана судна**

Капітан судна ажыццяўляе кіраванне суднам, у тым ліку суднаваджэнне, прымае меры, неабходныя для захавання бяспекі плавання, абароны марскога асяроддзя, падтрымання парадку на судне, прадухілення прычынення шкоды судну, людзям і грузу, якія знаходзяцца на ім.

**Артыкул 61. Абавязак капітана судна аказваць дапамогу людзям, якія церпяць бедства на моры**

Капітан судна, калі ён можа гэта зрабіць без сур’ёзнай пагрозы свайму судну і людзям, якія знаходзяцца на ім, абавязаны:

аказаць дапамогу любой асобе, якой пагражае гібель у моры;

ісці з максімальна магчымай хуткасцю на дапамогу людзям, якія церпяць бедства на моры, калі яму паведамілі, што яны маюць патрэбу ў дапамозе, і калі на такое дзеянне з яго боку можна разумна разлічваць.

Дапамога асобе, якая церпіць бедства на моры, аказваецца незалежна ад яе нацыянальнай і расавай прыналежнасці, прававога статусу і акалічнасцей, у выніку якіх яна аказалася асобай, што церпіць бедства, або пры якіх была знойдзена.

**Артыкул 62. Абавязак капітана судна аказваць дапамогу пасля сутыкнення суднаў**

Капітан кожнага з суднаў, якія сутыкнуліся, абавязаны, калі ён можа гэта зрабіць без сур’ёзнай пагрозы свайму судну і пасажырам і членам экіпажа, якія знаходзяцца на ім, аказаць дапамогу іншаму судну і пасажырам і членам экіпажа, якія знаходзяцца на ім.

Капітаны суднаў, якія сутыкнуліся, па меры магчымасці абавязаны паведаміць адзін аднаму назвы сваіх суднаў, парты іх прыпіскі, а таксама парты адпраўлення і прызначэння або найбліжэйшы порт заходу суднаў.

**Артыкул 63. Абавязак капітана судна заходзіць у порт для аказання неадкладнай медыцынскай дапамогі**

Калі асоба, што знаходзіцца на борце судна, мае патрэбу ў неадкладнай медыцынскай дапамозе, якая не можа быць аказана ў моры, капітан судна абавязаны зайсці ў найбліжэйшы порт, паведаміўшы аб гэтым суднаўладальніку і консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку), або забяспечыць дастаўку названай асобы ў порт іншым спосабам.

**Артыкул 64. Абавязак капітана судна ў выпадку ўзнікнення ваенных дзеянняў або ў іншых выпадках ваеннай небяспекі**

У выпадку ўзнікнення ваенных дзеянняў у раёне порта адпраўлення або порта прызначэння судна ці ў раёне, праз якi судна павінна прайсці, а таксама ў іншых выпадках ваеннай небяспекі капітан судна абавязаны прыняць усе меры па ратаванні людзей, якія знаходзяцца на судне, недапушчэнні захопу судна і наяўных на судне дакументаў, грузу і іншай маёмасці.

### Артыкул 65. Права капітана судна рэквізаваць харчаванне ў выпадку зрасходавання жыццёвых прыпасаў

Калі ўсе жыццёвыя прыпасы, у тым ліку недатыкальны запас харчавання, вычарпаны, капітан судна з мэтай агульнага размеркавання мае права рэквізаваць неабходную колькасць харчавання, якое ёсць у распараджэнні асоб, што знаходзяцца на судне, а таксама груз, які знаходзіцца на судне і можа быць выкарыстаны для харчавання. Аб рэквізіцыі складаецца акт.

Кошт рэквізаванага харчавання і грузу пакрывае суднаўладальнік.

### Артыкул 66. Правы капітана судна ў выпадку неадкладнай патрэбы ў грашах для працягу плавання

Калі падчас рэйса судна ўзнікла неадкладная патрэба ў грашах для працягу плавання, у прыватнасці для рамонту судна або ўтрымання экіпажа судна, капітан судна пры адсутнасці часу ці магчымасці для атрымання адпаведнага распараджэння суднаўладальніка мае права прадаць або закласці частку даверанай яму маёмасці, якая не з’яўляецца неабходнай для працягу плавання.

Капітан судна абавязаны выбраць такі спосаб набыцця сродкаў для працягу плавання, які будзе найменш стратным для суднаўладальніка і (або) грузаўладальнікаў.

Суднаўладальнік пакрывае кошт прададзенага грузу яго ўладальніку, за выключэннем выпадкаў, калі прычыненыя гэтым страты падпадаюць пад прыкметы агульнай аварыі або калі продаж быў праведзены толькі ў інтарэсах грузу.

### Артыкул 67. Дзеянні капітана судна ў выпадку небяспекі гібелі судна

Калі, на меркаванне капітана судна, судну пагражае немінучая гібель, капітан пасля прыняцця мер, неабходных для ратавання пасажыраў, дазваляе экіпажу судна пакінуць судна. Капітан пакідае судна апошнім, прыняўшы ўсе залежныя ад яго меры па ратаванні суднавага, машыннага і радыёжурналаў, картаў гэтага рэйса, дакументаў і каштоўнасцей.

У выпадку гібелі судна капітан судна захоўвае свае правы і абавязкі ў дачыненні да экіпажа судна.

### Артыкул 68. Правы капітана судна па падтрыманні парадку на судне

Капітан судна мае права ў межах сваіх паўнамоцтваў аддаваць любой асобе, якая знаходзіцца на судне, распараджэнні і каманды, падлеглыя беспярэчнаму выкананню.

Капітан судна ў выпадку невыканання асобамі, якія знаходзяцца на судне, яго законных распараджэнняў і каманд прымае ў дачыненні да гэтых асоб неабходныя меры, у тым ліку і прымусовыя.

Капітан судна мае права заахвочваць членаў экіпажа судна і накладаць на іх дысцыплінарныя спагнанні, а таксама адхіляць іх ад выканання службовых абавязкаў у выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам.

### Артыкул 69. Згода капітана судна на прыём на працу членаў экіпажа судна

Прыём на працу членаў экіпажа судна ажыццяўляецца толькі са згоды капітана судна.

Адмова капітана судна прыняць у склад экіпажа судна асобу, накіраваную на судна суднаўладальнікам, павінна быць абгрунтаванай. Такая адмова з адпаведнай матывіроўкай афармляецца ў пісьмовым выглядзе і перадаецца суднаўладальніку і асобе, якой адмоўлена капітанам судна ў прыёме на працу.

**Артыкул 70. Капітан судна як орган дазнання**

У выпадку ўчынення на судне, што знаходзіцца ў плаванні па-за межамі Рэспублікі Беларусь, дзеяння, якое ўтрымлівае прыкметы злачынства, капітан судна выконвае функцыі органа дазнання, кіруючыся пры гэтым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам.

Капітан судна мае права затрымаць асобу, падазраваную ва ўчыненні злачынства, за якое можа быць прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, да перадачы яе разам з матэрыяламі дазнання адпаведным органам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку) у першым порце заходу судна. У выпадку неабходнасці капітан судна можа накіраваць гэту асобу разам з матэрыяламі дазнання ў Рэспубліку Беларусь на іншым судне, якое плавае пад Дзяржаўным флагам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 71. Абавязкі капітана судна ў выпадку нараджэння дзіцяці або смерці на судне**

Аб кожным факце нараджэння дзіцяці або смерці на судне капітан судна абавязаны зрабіць запіс у суднавым журнале і паведаміць консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку) у порце заходу судна.

Аб факце смерці капітан судна абавязаны паведаміць сваякам нябожчыка і прыняць меры па захаванні і адпраўцы цела нябожчыка на радзіму. Пры адсутнасці такой магчымасці капітан судна абавязаны аддаць цела нябожчыка зямлі або крэміраваць яго і адправіць урну з прахам на радзіму.

У выключным выпадку, калі судна павінна знаходзіцца працяглы час у адкрытым моры і цела нябожчыка не можа быць захавана, капітан судна мае права аддаць цела нябожчыка мору згодна з марскімі звычаямі са складаннем адпаведнага акта.

Капітан судна забяспечвае складанне вопісу і захаванасць маёмасці нябожчыка, якая знаходзіцца на судне, да перадачы гэтай маёмасці з вопісам консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку) у порце заходу судна.

**Артыкул 72. Права капітана судна на сведчанне тастаментаў**

Тастаменты асоб, якія знаходзяцца падчас плавання на судне, сведчацца капітанам судна і прыраўноўваюцца да натарыяльна засведчаных.

**Артыкул 73. Права капітана судна на валоданне агнястрэльнай зброяй і яе прымяненне**

Капітан судна мае права на валоданне агнястрэльнай зброяй і яе прымяненне для забеспячэння асабістай бяспекі і бяспекі людзей і маёмасці, што знаходзяцца на судне..

**Артыкул 74. Капітан судна як прадстаўнік суднаўладальніка і грузаўладальнікаў**

Капітан судна згодна са сваім службовым становішчам прызнаецца прадстаўніком суднаўладальніка і грузаўладальнікаў у дачыненні да здзелак, выкліканых патрэбамі судна, грузу або плавання, а таксама іскаў, якія датычацца даверанай яму маёмасці, калі на месцы няма іншых прадстаўнікоў суднаўладальніка або грузаўладальнікаў.

**Артыкул 75. Ускладанне абавязкаў капітана судна на старшага памочніка капітана судна**

У выпадку смерці, хваробы капітана судна або з іншай прычыны, якая перашкаджае выкананню ім сваіх службовых абавязкаў, да атрымання распараджэнняў суднаўладальніка выкананне гэтых абавязкаў ускладаецца на старшага памочніка капітана судна.

**Артыкул 76. Адказнасць капітана судна**

За невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, указаных у гэтым Кодэксе, капітан судна нясе адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам.

## РАЗДЗЕЛ IV
## МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ГРУЗАЎ

### ГЛАВА 9
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ МАРСКОЙ ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ

**Артыкул 77. Падставы ажыццяўлення марской перавозкі грузаў**

Марская перавозка грузаў ажыццяўляецца паводле дагавора перавозкі, які павінен быць заключаны ў пісьмовай форме.

Марская перавозка грузаў суднамі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці або эксплуатуюцца Рэспублікай Беларусь для дзяржаўных некамерцыйных мэт, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

**Артыкул 78. Часовыя спыненне або абмежаванне прыёму грузаў для марской перавозкі**

Паводле рашэння рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту ў выключных выпадках прыём грузаў для марской перавозкі можа быць часова спынены або абмежаваны. Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту абавязаны неадкладна паведаміць пра такое рашэнне Ураду Рэспублікі Беларусь, а таксама апублікаваць яго ў адной з рэспубліканскіх газет.

Часовыя спыненне або абмежаванне прыёму грузаў могуць быць уведзены для марскіх перавозак у пэўных напрамках, з пэўных партоў або ў пэўныя парты.

**Артыкул 79. Перавозка грузаў марскім транспартам агульнага карыстання**

Калі з заканадаўства вынікае, што гэта камерцыйная арганізацыя абавязана ажыццяўляць марскую перавозку грузаў на падставе звароту любой юрыдычнай і (або) фізічнай асобы, то гэта камерцыйная арганізацыя прызнаецца марской транспартнай арганізацыяй агульнага карыстання.

Марская транспартная арганізацыя агульнага карыстання абавязана прыняць любы прапанаваны для перавозкі груз, калі на судне маюцца свабодныя памяшканні, прыдатныя для яго перавозкі, і груз можа быць перавезены без урону для раней прынятых для перавозкі грузаў.

Марская транспартная арганізацыя агульнага карыстання абавязана даводзіць да ўсеагульнага ведама тарыфы і ўмовы марской перавозкі грузаў.

Марская транспартная арганізацыя агульнага карыстання не мае права аддаваць перавагу аднаму з грузаўладальнікаў у дачыненні да прыёму грузу і ўмоў яго марской перавозкі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

**Артыкул 80. Дагавор марской перавозкі грузу**

Паводле дагавора марской перавозкі грузу перавозчык абавязваецца даставіць у порт прызначэння давераны яму адпраўшчыкам груз і выдаць яго ўпаўнаважанай на атрыманне грузу асобе (атрымальніку), а адпраўшчык абавязваецца заплаціць за перавозку грузу абумоўленую плату (фрахт).

Дагавор марской перавозкі грузу можа быць заключаны:

з умовай прадастаўлення для перавозкі грузу ўсяго судна, яго часткі або пэўных суднавых памяшканняў;

без такой умовы.

**Артыкул 81. Дагавор фрахтавання (чартар)**

Паводле дагавора фрахтавання (чартару) адзін бок (фрахтоўшчык) абавязваецца прадаставіць другому боку (фрахтавальніку) за плату (фрахт) усю або частку ўмяшчальнасці аднаго ці некалькіх суднаў на адзін ці некалькі рэйсаў для марской перавозкі грузу.

Дагавор фрахтавання (чартар) павінен утрымліваць найменні бакоў, памер фрахту, назву судна і абазначэнне грузу, месца (месцы) пагрузкі грузу, месца (месцы) прызначэння або напрамак (напрамкі) руху судна.

У дагавор фрахтавання (чартар) могуць быць уключаны згодна з пагадненнем бакоў і іншыя ўмовы і агаворкі.

**Артыкул 82. Дагавор аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў**

Перавозчык і грузаўладальнік пры неабходнасці ажыццяўлення сістэматычных перавозак грузаў могуць заключаць доўгатэрміновыя дагаворы аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў.

Паводле дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў перавозчык абавязваецца ва ўстаноўленыя тэрміны прымаць, а грузаўладальнік прад’яўляць для перавозкі грузы ў абумоўленым аб’ёме і заплаціць фрахт.

Дагавор аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў можа быць заключаны з некалькімі грузаўладальнікамі.

У дагаворы аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў вызначаюцца:

1) найменне і агульная колькасць грузу, падлеглага перавозцы;

2) тэрмін дзеяння дагавора;

3) тэрміны і іншыя ўмовы прадастаўлення транспартных сродкаў і прад’яўлення грузаў для марской перавозкі;

4) агульныя ўмовы марской перавозкі;

5) парадак разлікаў;

6) адказнасць за парушэнне абавязацельстваў, якія вынікаюць з дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў;

7) іншыя ўмовы.

**Артыкул 83. Суадносіны дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў і дагавора марской перавозкі грузу**

Пры заключэнні дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў перавозка канкрэтнай партыі грузу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дагаворам марской перавозкі грузу, заключаным на падставе дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў.

Умовы марской перавозкі грузу, вызначаныя ў дагаворы аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў, лічацца ўключанымі ў дагавор марской перавозкі грузу.

Калі ўмовы дагавора марской перавозкі грузу, заключанага на перавозку канкрэтнай партыі грузу, супярэчаць умовам дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў, прымяняюцца ўмовы дагавора аб арганізацыі марскіх перавозак грузаў.

**Артыкул 84. Змешаная перавозка грузаў**

Змешаная перавозка грузаў ажыццяўляецца паводле дагавора транспартнай экспедыцыі.

**Артыкул 85. Прававаадносіны перавозчыка і атрымальніка грузу**

Праваадносіны паміж перавозчыкам і атрымальнікам грузу, які не з’яўляецца бокам дагавора марской перавозкі грузу, вызначаюцца канасаментам. Умовы дагавора марской перавозкі грузу, не выкладзеныя ў канасаменце, абавязковыя для гэтага атрымальніка, калі канасамент утрымлівае спасылку на дакумент, у якім яны выкладзены.

**Артыкул 86. Доказы прыёму грузу для марской перавозкі**

Пасля прыёму грузу для марской перавозкі перавозчык па патрабаванні адпраўшчыка абавязаны выдаць канасамент.

Перавозчык мае права выдаць не канасамент, а іншы дакумент у пацвярджэнне атрымання грузу для марской перавозкі. Такі дакумент з’яўляецца першарадным доказам заключэння дагавора марской перавозкі грузу і прыёму яго перавозчыкам.

Канасамент складаецца на падставе падпісанага адпраўшчыкам дакумента, які павінен утрымліваць даныя, указаныя ў пунктах 3–8 часткі першай артыкула 87 гэтага Кодэкса.

Адпраўшчык павінен гарантаваць перавозчыку на момант пагрузкі дакладнасць марак, колькасці месцаў, колькасці і масы грузу, як яны ім указаны, а таксама пакрыць перавозчыку ўсе страты, узніклыя з прычыны недакладнасці ўказаных даных.

**Артыкул 87. Даныя канасамента**

Канасамент павінен утрымліваць наступныя даныя:

1) найменне перавозчыка і яго месцазнаходжанне;

2) назву судна, калі груз прыняты для марской перавозкі на пэўным судне;

3) месца пагрузкі і дату прыёму грузу перавозчыкам у порце пагрузкі;

4) найменне адпраўшчыка і яго месцазнаходжанне;

5) месца прызначэння грузу ці месца прызначэння або накіроўвання судна;

6) найменне атрымальніка, калі ён указаны адпраўшчыкам;

7) найменне грузу, асноўныя маркі, неабходныя для яго ідэнтыфікацыі, а ў неабходных выпадках – прамое ўказанне адносна небяспечнага характару або асаблівых уласцівасцей грузу, колькасць месцаў ці прадметаў і масу грузу або яго колькасць, пазначаную іншым чынам, прычым усе гэтыя даныя ўказваюцца так, як яны ўказаны адпраўшчыкам;

8) апісанне знешняга стану грузу і яго ўпакоўкі;

9) фрахт і іншыя належныя перавозчыку выплаты, ці ўказанне, што фрахт павінен быць аплачаны згодна з умовамі, выкладзенымі ў дагаворы або іншым дакуменце, ці ўказанне, што фрахт аплачаны поўнасцю;

10) час і месца выдачы канасамента;

11) колькасць арыгіналаў канасамента, калі іх больш за адзін;

12) подпіс перавозчыка або асобы, якая дзейнічае ад яго імені.

Пасля пагрузкі грузу на судна перавозчык па патрабаванні адпраўшчыка выдае бартавы канасамент, у якім дадаткова ўказваецца, што груз знаходзіцца на борце пэўнага судна, а таксама дата (даты) пагрузкі.

Калі перавозчык да пагрузкі грузу на судна выдаў адпраўшчыку на груз, прыняты для перавозкі, канасамент або іншы тавараспарадчы дакумент, то па патрабаванні перавозчыка адпраўшчык павінен вярнуць гэты дакумент у абмен на бартавы канасамент.

Перавозчык можа забяспечыць патрабаванні адпраўшчыка ў дачыненні да выдачы бартавога канасамента шляхам дапаўнення раней выдадзенага дакумента данымі, якія павінны ўтрымлівацца ў бартавым канасаменце.

**Артыкул 88. Агаворкі ў канасаменце**

Калі ў канасаменце ўтрымліваюцца даныя, якія датычацца наймення, асноўных марак, колькасці месцаў ці прадметаў або колькасці грузу, у дачыненні да якіх перавозчык або іншая асоба, якая выдае канасамент ад яго імені, ведаюць або маюць дастатковыя падставы меркаваць, што такія даныя не адпавядаюць фактычна прынятаму, а ў выпадку выдачы бартавога канасамента – пагружанаму грузу, ці калі ў перавозчыка або такой іншай асобы не было разумнай магчымасці праверыць гэтыя даныя, то перавозчык або такая іншая асоба ўносяць у канасамент адпаведную агаворку, якая канкрэтна ўказвае на гэтыя неадпаведнасці, падставы для падазрэнняў або адсутнасць разумнай магчымасці праверкі.

Калі перавозчык або іншая асоба, якая выдае канасамент ад яго імені, не ўказваюць у канасаменце знешні стан грузу, то лічыцца, што яны ўказалі ў канасаменце, што знешні стан грузу добры.

**Артыкул 89. Доказная сіла канасамента**

Канасамент сведчыць прыняцце грузу перавозчыкам у адпаведнасці з апісаннем, выкладзеным у канасаменце, за выключэннем даных, у дачыненні да якіх была ўнесена агаворка. Даказванне перавозчыкам процілеглага не дапускаецца, калі канасамент перададзены трэцяй асобе, якая дзейнічала добрасумленна.

**Артыкул 90. Віды канасамента**

Канасамент можа быць выдадзены на імя пэўнага атрымальніка (імянны канасамент), загаду адпраўшчыка або атрымальніка (ордарны канасамент) ці на прад’яўніка.

Ордарны канасамент, які не ўтрымлівае ўказанняў аб выдачы яго загаду адпраўшчыка або атрымальніка, лічыцца выдадзеным загаду адпраўшчыка.

**Артыкул 91. Множнасць экзэмпляраў канасамента**

Па жаданні адпраўшчыка яму можа быць выдадзены канасамент у некалькіх экзэмплярах, у кожным з якіх адзначаецца колькасць складзеных экзэмпляраў канасамента.

Пасля выдачы грузу па адным з экзэмпляраў канасамента астатнія экзэмпляры страчваюць сілу.

**Артыкул 92. Перадача правоў па канасаменце**

Правы, засведчаныя канасаментам, перадаюцца:

1) па імянным канасаменце – з выкананнем правіл, установленых для ўступкі патрабаванняў;

2) па ордарным канасаменце – па ордарных або бланкавых перадатачных надпісах;

3) па канасаменце на прад’яўніка – шляхам простага ўручэння.

## ГЛАВА 10
## АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ МАРСКОЙ ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ

**Артыкул 93. Мараходнасць судна**

Перавозчык абавязаны да пачатку рэйса прывесці судна ў мараходны стан, а менавіта:

1) забяспечыць тэхнічную прыдатнасць судна да плавання;

2) належным чынам падрыхтаваць судна;

3) укамплектаваць судна экіпажам;

4) забяспечыць экіпаж судна ўсім неабходным;

5) прывесці трумы і іншыя памяшканні судна, дзе перавозіцца груз, у стан, які забяспечвае належныя прыём, перавозку і захаванасць грузу.

Перавозчык не нясе адказнасці за немараходны стан судна, калі дакажа, што ён быў выкліканы недахопамі, якія не маглі быць выяўлены пры праяўленні ім належнай руплівасці (скрытыя недахопы).

Пагадненне бакоў, якое супярэчыць частцы першай гэтага артыкула, несапраўднае.

**Артыкул 94. Замена судна**

Калі груз павінен быць перавезены на пэўным судне, ён можа быць пагружаны на іншае судна толькі са згоды фрахтавальніка або адпраўшчыка, за выключэннем выпадкаў перагрузкі грузу з прычыны тэхнічнай неабходнасці, узніклай пасля пачатку пагрузкі.

**Артыкул 95. Порт пагрузкі**

Перавозчык абавязаны падаць судна ў порт пагрузкі, указаны ў дагаворы, або ў порт, указаны ў адпаведнасці з умовамі дагавора.

Калі порт пагрузкі не быў указаны, ці ўказаны нясвоечасова, ці з'яўляецца даволі небяспечным, перавозчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць пакрыцця страт.

**Артыкул 96. Месца пагрузкі**

Перавозчык абавязаны падаць судна да месца пагрузкі, указанага ў дагаворы.

Калі месца, указанае ў дагаворы, непрыдатнае для пагрузкі або ў дагаворах, заключаных перавозчыкам на гэты рэйс, указаны розныя месцы пагрузкі, перавозчык можа падаць судна да месца пагрузкі, якое звычайна выкарыстоўваецца ў гэтым порце.

Пры перавозках у лінейных зносінах месца пагрузкі ўстанаўлівае перавозчык.

**Артыкул 97. Тэрмін падачы судна да месца пагрузкі**

Перавозчык абавязаны падаць судна да месца пагрузкі ў тэрмін, прадугледжаны дагаворам.

У выпадку непадачы судна да месца пагрузкі ў прадугледжаны дагаворам тэрмін дагавор можа быць скасаваны з пакрыццём перавозчыкам прычыненых страт.

**Артыкул 98. Паведамленне аб гатоўнасці судна да пагрузкі**

Перавозчык абавязаны пісьмова паведаміць адпраўшчыку або фрахтавальніку аб гатоўнасці судна да пагрузкі. Паведамленне можа быць пададзена толькі ў выпадку знаходжання судна ў порце пагрузкі або ў звычайным для гэтага порта месцы чакання.

Дзень і гадзіна, у якія паведамленне лічыцца пададзеным, вызначаюцца звычаямі, прынятымі ў гэтым порце.

Калі судна не гатова да прыёму грузу да часу, указанага ў паведамленні, то перавозчык абавязаны пакрыць страты, якія ўзніклі ў сувязі з гэтым.

**Артыкул 99. Сталійны час**

Сталійны час вызначаецца пагадненнем бакоў, а пры адсутнасці такога пагаднення – звычаямі, прынятымі ў порце пагрузкі.

Сталійны час вылічваецца ў працоўных днях, гадзінах і хвілінах пачынаючы з дня, наступнага за днём падачы паведамлення аб гатоўнасці судна да пагрузкі або разгрузкі.

У сталійны час не ўключаецца час, на працягу якога пагрузка не праводзілася па акалічнасцях, залежных ад перавозчыка, або з прычыны непераадольнай сілы ці гідраметэаралагічных умоў, якія пагражаюць захаванасці грузу або перашкаджаюць яго бяспечнай пагрузцы.

Калі пагрузка пачалася да пачатку цячэння сталійнага часу, то час, фактычна затрачаны на пагрузку, залічваецца ў сталійны час.

**Артыкул 100. Контрсталійны час**

Контрсталійны час вызначаецца пагадненнем бакоў. Пры адсутнасці пагаднення бакоў працягласць контрсталійнага часу лічыцца роўнай палавіне сталійнага часу.

Контрсталійны час вылічваецца ў каляндарных днях, гадзінах і хвілінах пачынаючы з моманту заканчэння сталійнага часу.

У контрсталійны час уключаюцца выхадныя і афіцыйна ўстаноўленыя святочныя дні, якія з’яўляюцца непрацоўнымі днямі, час, аб’яўлены непрацоўным у порце, а таксама перапынкі ў пагрузцы, выкліканыя непераадольнай сілай або гідраметэаралагічнымі ўмовамі, што пагражаюць захаванасці грузу або перашкаджаюць бяспечнай яго пагрузцы. Час, на працягу якога пагрузка не праводзілася па прычынах, залежных ад перавозчыка, не ўключаецца ў контрсталійны час.

**Артыкул 101. Дэмерэдж**

Дэмерэдж вызначаецца пагадненнем бакоў.

Пры адсутнасці пагаднення бакоў дэмерэдж вызначаецца па стаўках, прынятых у гэтым порце.

У выпадку адсутнасці ўказаных ставак дэмерэдж вызначаецца выдаткамі на ўтрыманне судна і яго экіпажа.

**Артыкул 102. Дыспач**

Дыспач устанаўліваецца пагадненнем бакоў.

Пры адсутнасці пагаднення бакоў дыспач вылічваецца ў памеры палавіны платы за прастой судна.

**Артыкул 103. Права перавозчыка адправіць судна ў рэйс пасля сканчэння контрсталійнага часу**

Перавозчык мае права пасля сканчэння контрсталійнага часу адправіць судна ў рэйс, калі нават не ўвесь прадугледжаны дагаворам груз пагружаны на судна па акалічнасцях, не залежных ад перавозчыка. Пры гэтым перавозчык захоўвае права на атрыманне поўнага фрахту.

У выпадку прадастаўлення для марской перавозкі грузу ўсяго судна перавозчык не мае права адмовіцца ад прыёму грузу, дастаўленага да заканчэння сталійнага або контрсталійнага часу, калі бакі дамовіліся аб гэтым, нават калі прыняцце, пагрузка і ўкладка грузу маглі затрымаць судна на час, большы за ўстаноўлены.

У выпадку, калі для марской перавозкі грузу прадастаўлена не ўсё судна, перавозчык мае права да сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу, калі бакі дамовіліся аб гэтым, адмовіцца ад прыёму грузу, які з прычыны яго прад’яўлення са спазненнем можна пагрузіць на судна належным чынам і без урону для астатняга грузу няйнакш як з затрымкай судна. Пры гэтым перавозчык захоўвае права на атрыманне поўнага фрахту.

**Артыкул 104. Пакрыццё страт за затрымку судна**

Перавозчык мае права на пакрыццё прычыненых яму страт за затрымку судна звыш контрсталійнага часу, калі затрымка судна адбылася па акалічнасцях, не залежных ад перавозчыка.

**Артыкул 105. Адпраўленне судна ў рэйс да сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу**

У выпадку, калі для марской перавозкі грузу прадастаўлена ўсё судна, перавозчык абавязаны па патрабаванні адпраўшчыка або фрахтавальніка адправіць судна ў рэйс, нават калі быў пагружаны не ўвесь груз. Перавозчык у гэтым выпадку захоўвае права на поўны фрахт.

**Артыкул 106. Выгрузка чужога грузу**

У выпадку прадастаўлення для марской перавозкі грузу ўсяго судна, часткі судна ці асобных суднавых памяшканняў адпраўшчык або фрахтавальнік могуць патрабаваць выгрузкі грузу, які ім не належыць, з судна, часткі судна ці суднавага памяшкання ў порце адпраўлення, а ў выпадку прадастаўлення ўсяго судна – у любым порце заходу судна.

Калі пабочны груз не быў своечасова выгружаны, адпраўшчык або фрахтавальнік маюць права запатрабаваць адпаведнага змяншэння фрахту, а таксама пакрыцця прычыненых яму страт.

**Артыкул 107. Размяшчэнне грузу на судне. Перавозка грузу на палубе**

Груз размяшчаецца на судне паводле меркавання капітана судна.

Груз не можа быць размешчаны на палубе, за выключэннем выпадкаў, калі такая перавозка дапускаецца дагаворам, заканадаўствам або звычаем.

Перавозчык нясе адказнасць за правільнае размяшчэнне, мацаванне і сепарацыю грузу на судне.

Калі груз перавозіцца на палубе, перавозчык абавязаны ўказаць аб гэтым у канасаменце або іншым дакуменце, які пацвярджае заключэнне дагавора. Пры адсутнасці такога ўказання перавозчык абавязаны даказаць, што дагавор марской перавозкі грузу на палубе быў заключаны, але ён не мае права спасылацца на такі дагавор у дачыненні да трэцяй асобы, якая добрасумленна набыла канасамент.

**Артыкул 108. Выдаткі на пагрузку**

Адпраўшчык або фрахтавальнік за свой кошт размяшчаюць груз уздоўж борта судна. Выдаткі на пагрузку і ўкладанне грузу на судне нясе перавозчык, калі бакамі не ўстаноўлена іншае.

**Артыкул 109. Упакоўка і маркіроўка грузу**

Груз, які мае патрэбу ў тары і ўпакоўцы для засцярогі ад страты, недастачы або пашкоджання (псавання), павінен прад'яўляцца для марской перавозкі ў непашкоджаных тары і ўпакоўцы, якія забяспечваюць яго поўную захаванасць. Указанае патрабаванне прымяняецца таксама да кантэйнераў.

Адпраўшчык абавязаны належным чынам маркіраваць груз і прадставіць перавозчыку неабходныя звесткі аб ім. Калі груз патрабуе асаблівага з ім абыходжання, адпраўшчык абавязаны інфармаваць перавозчыка аб уласцівасцях грузу і парадку абыходжання з ім.

**Артыкул 110. Замена грузу**

Груз, род або від якога ўказаны ў дагаворы, можа быць заменены на груз іншага роду або віду толькі са згоды перавозчыка.

**Артыкул 111. Дакументы на груз**

Адпраўшчык павінен своечасова перадаць перавозчыку ўсе неабходныя на груз дакументы і нясе адказнасць перад перавозчыкам за страты, прычыненыя з-за нясвоечасовай перадачы, недакладнасці або непаўнаты гэтых дакументаў.

**Артыкул 112. Права распараджэння грузам**

Адпраўшчык мае права распараджацца грузам да моманту яго выдачы атрымальніку або да моманту, калі ён перадаў гэта права атрымальніку або трэцяй асобе, паведаміўшы перавозчыку аб такой перадачы.

Адпраўшчык мае права запатрабаваць зваротнай выдачы грузу ў месцы адпраўлення да адыходу судна, у прамежкавым порце або выдачы яго не таму атрымальніку, які ўказаны ў перавозачным дакуменце, пры ўмове прад'яўлення ўсіх выдадзеных адпраўшчыку арыгіналаў канасамента або прадастаўлення адпаведнага забеспячэння і з выкананнем правіл, прадугледжаных артыкуламі 128 і 129 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 113. Абавязкі перавозчыка ў дачыненні да грузу**

Перавозчык абавязаны з моманту прыняцця грузу да марской перавозкі да моманту яго выдачы прымаць усе магчымыя меры для забеспячэння захаванасці грузу і яго своечасовай дастаўкі атрымальніку.

Калі прыняты да марской перавозкі груз з-за яго ўласцівасцей патрабуе асаблівага абыходжання і ўказанні аб гэтым змяшчаюцца ў дагаворы і на грузавых месцах, перавозчык павінен клапаціцца пра груз у адпаведнасці з гэтымі ўказаннямі.

**Артыкул 114. Небяспечны груз**

Калі лёгкаўзгаральны, выбуховы або небяспечны па сваёй прыродзе груз быў здадзены не пад сваім найменнем і пры яго прыёмцы перавозчык не мог шляхам вонкавага агляду ўпэўніцца ў яго ўласцівасцях, то такі груз можа быць у любы час выгружаны перавозчыкам ці знішчаны або абясшкоджаны без пакрыцця адпраўшчыку страт.

Адпраўшчык абавязаны пакрыць страты, прычыненыя ў сувязі з марской перавозкай грузу, указанага ў частцы першай гэтага артыкула. Фрахт за перавозку такога грузу не вяртаецца. Калі пры адпраўленні грузу фрахт не быў аплачаны, то перавозчык мае права спагнаць яго ў поўным памеры.

Калі пагружаны з ведама і згоды перавозчыка лёгкаўзгаральны, выбуховы або небяспечны па сваёй прыродзе груз стане небяспечным для судна, іншага грузу або людзей, якія знаходзяцца на судне, то перавозчык мае права распарадзіцца такім грузам у адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула. Перавозчык у такім выпадку не нясе адказнасці перад адпраўшчыкам за страты, прычыненыя ў сувязі з марской перавозкай указанага грузу, за выключэннем агульнай аварыі. Перавозчык мае права на фрахт у памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай гэтым суднам з грузам.

**Артыкул 115. Груз, пагружаны не пад сваім найменнем**

Перавозчык мае права выгрузіць з судна ў любым порце груз, які пагружаны не пад сваім найменнем і з'яўляецца забароненым для вывазу, увозу або кантрабандным.

Адпраўшчык пакрывае перавозчыку страты, прычыненыя ў сувязі з пагрузкай і выгрузкай такіх грузаў. Перавозчык у гэтым выпадку захоўвае права на поўны фрахт.

**Артыкул 116. Тэрмін і маршрут перавозкі. Дывіяцыя**

Перавозчык абавязаны дастаўляць грузы ў адпаведнасці з указанымі ў дагаворы маршрутам і тэрмінамі, а пры адсутнасці такога ўказання – у адпаведнасці са звычайным маршрутам і ў звычайныя тэрміны.

Не лічыцца парушэннем дагавора ўсялякае адхіленне судна ад намечанага маршруту (дывіяцыя) з мэтай ратавання на моры людзей, суднаў і грузаў, а таксама іншае разумнае адхіленне ад маршруту, калі яно не выклікана няправільнымі дзеяннямі перавозчыка.

**Артыкул 117. Перашкоды для заходу судна ў порт прызначэння**

Калі судна не можа зайсці ў порт прызначэння ў выніку забароны дзяржаўных органаў і (або) партовых улад, стыхійных бедстваў або іншых прычын, якія не залежаць ад перавозчыка, то перавозчык абавязаны неадкладна паведаміць аб гэтым адпраўшчыку або фрахтавальніку, а таксама асобе, правамоцнай распараджацца грузам, калі яна вядома перавозчыку.

Калі для марской перавозкі грузу было прадастаўлена ўсё судна і на працягу разумнага тэрміну з моманту адпраўкі паведамлення ад адпраўшчыка, фрахтавальніка або асобы, правамоцнай распараджацца грузам, не паступіць адпаведнага распараджэння адносна грузу, перавозчык мае права выгрузіць груз у адным з бліжэйшых партоў або вярнуць гэты груз у порт адпраўлення ў залежнасці ад таго, што, на яго меркаванне, з’яўляецца больш выгадным для адпраўшчыка, фрахтавальніка або асобы, правамоцнай распараджацца грузам.

Калі для марской перавозкі грузу была прадастаўлена частка судна, перавозчык павінен выгрузіць груз, які не можа быць дастаўлены ў порт прызначэння, у іншым порце ў адпаведнасці з распараджэннем адпраўшчыка, фрахтавальніка або асобы, правамоцнай распараджацца грузам. Пры неатрыманні такога распараджэння на працягу трох сутак з моманту адпраўкі паведамлення перавозчык мае права выгрузіць груз у адным з бліжэйшых партоў, паведаміўшы аб гэтым адпраўшчыку, фрахтавальніку або асобе, правамоцнай распараджацца грузам. Перавозчык мае права абысціся з грузам аналагічным чынам і ў тым выпадку, калі атрыманае ім распараджэнне нельга выканаць без прычынення страт уладальнікам іншых грузаў, якія знаходзяцца на судне.

Перавозчык мае права на пакрыццё страт, звязаных з чаканнем распараджэння на працягу разумнага тэрміну, а таксама выдаткаў на выгрузку грузу і фрахту ў памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам.

**Артыкул 118. Выгрузка грузу**

Пры выгрузцы грузу ў порце прызначэння прымяняюцца адпаведна артыкулы 95–102 і 104 гэтага Кодэкса.

Калі іншае не прадугледжана дагаворам, выдаткі на выгрузку грузу ўздоўж борта судна нясе перавозчык.

**Артыкул 119. Асоба, якая мае права на атрыманне грузу**

Груз, на які выдадзены канасамент, выдаецца ў порце прызначэння па прад’яўленні аднаго з экзэмпляраў арыгінала канасамента:

1) па імянным канасаменце – атрымальніку, указанаму ў канасаменце, або асобе, якой канасамент быў перададзены з выкананнем правіл, устаноўленых для ўступкі патрабаванняў;

2) па ордарным канасаменце – асобе, загаду якой складзены канасамент, а пры наяўнасці ў канасаменце перадатачных надпісаў – асобе, указанай у апошнім з

непарарыўнага рада перадатачных надпісаў, або прад’яўніку канасамента з апошнім бланкавым перадатачным надпісам;

3) па канасаменце на прад’яўніка – прад’яўніку канасамента.

Калі замест канасамента быў выдадзены іншы дакумент, які пацвярджае атрыманне грузу для марской перавозкі, то перавозчык можа выдаць груз толькі атрымальніку, указанаму ў гэтым дакуменце, або атрымальніку, указанаму адпраўшчыкам.

**Артыкул 120. Здача грузу на захоўванне. Продаж незапатрабаванага грузу**

Калі ў порце прызначэння атрымальнік не запатрабаваў груз або ад яго адмовіўся ці затрымлівае прыём грузу такім чынам, што груз не можа быць выгружаны ва ўстаноўлены час, перавозчык мае права, паведаміўшы аб гэтым адпраўшчыку або фрахтавальніку, а таксама атрымальніку, калі ён яму вядомы, здаць груз на захоўванне за кошт і на рызыку асобы, правамоцнай распараджацца грузам.

Калі для перавозкі грузу было прадастаўлена ўсё судна, выгрузка і здача грузу на захоўванне выконваюцца толькі па сканчэнні сталійнага і контрсталійнага часу і пры ўмове, што на працягу гэтага часу не паступіць іншае распараджэнне адпраўшчыка, фрахтавальніка або асобы, правамоцнай распараджацца грузам. Час, затрачаны перавозчыкам на здачу грузу на захоўванне, разглядаецца як прастой судна.

Калі на працягу двух месяцаў з дня прыходу судна ў порт прызначэння груз, здадзены на захоўванне, не будзе запатрабаваны і адпраўшчык, фрахтавальнік ці іншая асоба, правамоцная распараджацца грузам, не заплаціць перавозчыку ўсіх належных па гэтай перавозцы сум, перавозчык мае права ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам, прадаць груз. Хуткапсавальны незапатрабаваны груз, а таксама груз, выдаткі па захоўванні якога перавышаюць яго кошт, можа быць прададзены і да сканчэння ўказанага тэрміну, але не раней за тэрмін дастаўкі грузу.

Сумы, выручаныя ад продажу незапатрабаванага грузу, за вылікам сум, належных перавозчыку ў сувязі з перавозкай гэтага грузу, а таксама выдаткаў па захоўванні і продажы грузу, падлягаюць залічэнню на рахунак перавозчыка для выдачы асобе, правамоцнай распараджацца грузам.

Калі сум, выручаных ад продажу незапатрабаванага грузу, акажацца недастакова для пакрыцця належных перавозчыку плацяжоў, а таксама выдаткаў па захоўванні і продажы грузу, перавозчык мае права спагнаць недаатрыманае з адпраўшчыка або фрахтавальніка.

Калі на працягу шасці месяцаў з дня продажу незапатрабаванага грузу ніхто не заявіць сваіх правоў на суму ад яго продажу, то далейшае распараджэнне сумамі, выручанымі ад продажу гэтага грузу, за вылікам сум, належных перавозчыку, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 121. Агляд і праверка грузу да яго выдачы**

Да выдачы грузу атрымальнік і перавозчык за свой кошт маюць права запатрабаваць правядзення агляду грузу і праверкі яго колькасці. Калі ў выніку агляду і праверкі, праведзеных па патрабаванні атрымальніка, устаноўлены страта, нястача або пашкоджанне (псаванне) грузу, адказнасць за якія нясе перавозчык, выдаткі па аглядзе і праверцы грузу ўскладаюцца на перавозчыка.

**Артыкул 122. Заява аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) грузу**

Калі да выдачы ці падчас выдачы грузу атрымальнік у пісьмовай форме не зрабіў заявы перавозчыку аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) грузу і не ўказаў агульнага характару страты, нястачы або пашкоджання (псавання) грузу, то лічыцца, што груз атрыманы ў адпаведнасці з умовамі канасаменту, пакольні не даказана іншае.

Калі груз быў агледжаны і (або) праверааны атрымальнікам сумесна з перавозчыкам, то атрымальнік можа не рабіць заявы, прадугледжанай часткай першай гэтага артыкула.

У выпадку, калі страта, нястача або пашкоджанне (псаванне) грузу не маглі быць выяўлены пры звычайным спосабе прыёму грузу, то заява перавозчыку можа быць зроблена атрымальнікам на працягу трох дзён з моманту прыёму грузу.

**Артыкул 123. Плацяжы пры перавозцы грузаў**

Усе належныя перавозчыку плацяжы выплачваюцца адпраўшчыкам або фрахтавальнікам. У выпадках, прадугледжаных дагаворам, і пры наяўнасці адпаведнай агаворкі ў канасаменце выплата належных перавозчыку плацяжоў можа праводзіцца атрымальнікам.

Перавозчык мае права ўтрымліваць перададзеныя яму для марской перавозкі грузы ў забеспячэнне належнага яму фрахту і іншых плацяжоў па перавозцы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам або не вынікае з сутнасці абавязацельства.

**Артыкул 124. Памер фрахту**

Памер фрахту ўстанаўліваецца пагадненнем бакоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам. Пры адсутнасці пагаднення бакоў памер фрахту вызначаецца зыходзячы са ставак, прымяняльных у месцы і падчас пагрузкі грузу.

Калі на судна пагружаны груз у колькасці, большай, чым прадугледжана дагаворам, памер фрахту адпаведна павялічваецца.

Калі замест грузу, прадугледжанага дагаворам, на судна пагружаны іншы груз, фрахт за перавозку якога большы, чым вызначана дагаворам, выплачваецца фрахт за перавозку сапраўды пагружанага грузу.

Калі фрахт за перавозку сапраўды пагружанага на судна грузу меншы за фрахт, прадугледжаны дагаворам, выплачваецца фрахт, прадугледжаны дагаворам.

**Артыкул 125. Фрахт за груз, страчаны пры перавозцы**

За груз, страчаны пры перавозцы па віне перавозчыка, фрахт не спаганяецца, а калі ён быў унесены ўперад, то вяртаецца. Калі страчаны груз акажацца ў далейшым выратаваным, перавозчык мае права на атрыманне фрахту ў памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам.

За груз, загінулы або пашкоджаны з прычыны яго натуральных уласцівасцей ці акалічнасцей, якія залежаць ад адпраўшчыка або фрахтавальніка, выплачваецца поўны фрахт.

**Артыкул 126. Вылічэнне фрахту за фактычна пройдзеную суднам адлегласць**

Пры вылічэнні фрахту за фактычна пройдзеную суднам адлегласць улічваюцца суадносіны часткі шляху, пройдзенага суднам з грузам, з устаноўленай працягласцю рэйса судна, а таксама суадносіны выдаткаў, затрат часу, працы і небяспекі, звязаных з пройдзенай суднам адлегласцю, з выдаткамі, затратамі часу, працы і небяспекай, якія звычайна прыпадаюць на рэйс.

**Артыкул 127. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора**

Калі кошт пагружанага на судна грузу не пакрывае фрахту і іншых выдаткаў перавозчыка, звязаных з грузам, а адпраўшчык або фрахтавальнік не ўнеслі поўнасцю фрахт перад адпраўленнем судна ці не прадаставілі забеспячэння выплаты такіх плацяжоў, перавозчык мае права да адпраўлення судна скасаваць дагавор і запатрабаваць выплаты яму палавіны абумоўленага фрахту, платы за прастой судна, калі ён меў месца, а таксама

пакрыцця іншых выдаткаў, звязаных з грузам. Выгрузка грузу выконваецца за кошт адпраўшчыка або фрахтавальніка.

### Артыкул 128. Адмова фрахтавальніка або адпраўшчыка ад выканання дагавора

Калі для марской перавозкі грузу было прадастаўлена ўсё судна, адпраўшчык або фрахтавальнік мае права адмовіцца ад выканання дагавора з выплатай:

1) палавіны поўнага фрахту, а таксама платы за прастой судна, калі ён меў месца, і выдаткаваных перавозчыкам за кошт грузу сум, не ўключаных у суму фрахту, калі адмова адбылася да сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу, устаноўленага для пагрузкі, ці да адпраўлення судна ў рэйс у залежнасці ад таго, які з гэтых двух момантаў наступіць раней;

2) поўнага фрахту, а таксама платы за прастой судна, калі ён меў месца, і выдаткаваных перавозчыкам за кошт грузу сум, не ўключаных у суму фрахту, калі адмова адбылася пасля сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу, устаноўленага для пагрузкі, ці пасля адпраўлення судна ў рэйс, у залежнасці ад таго, які з гэтых двух момантаў наступіць раней, і калі дагавор быў заключаны на адзін рэйс;

3) поўнага фрахту за першы рэйс, а таксама платы за прастой судна, калі ён меў месца, і выдаткаваных перавозчыкам за кошт грузу сум, не ўключаных у суму фрахту, палавіны фрахту за астатнія рэйсы, калі адмова адбылася пасля сканчэння сталійнага або контрсталійнага часу, устаноўленага для пагрузкі, ці пасля адпраўлення судна ў рэйс, у залежнасці ад таго, які з гэтых двух момантаў наступіць раней, і калі дагавор быў заключаны на некалькі рэйсаў.

Пры адмове адпраўшчыка або фрахтавальніка ад выканання дагавора да адпраўлення судна ў рэйс перавозчык абавязаны выдаць ім груз незалежна ад таго, што выгрузка грузу можа затрымаць судна на час, большы за ўстаноўлены тэрмін.

Пры адмове адпраўшчыка або фрахтавальніка ад выканання дагавора падчас рэйса яны маюць права запатрабаваць выдачы грузу ў тым порце, куды судна павінна зайсці згодна з дагаворам ці зайшло з прычыны неабходнасці.

Калі для марской перавозкі грузу было прадастаўлена не ўсё судна, то адпраўшчык або фрахтавальнік можа адмовіцца ад выканання дагавора толькі пры ўмове выплаты поўнага фрахту, платы за прастой судна, калі ён меў месца, і выдаткаваных перавозчыкам за кошт грузу сум, не ўключаных у суму фрахту. Перавозчык абавязаны па патрабаванні адпраўшчыка або фрахтавальніка выдаць груз да яго дастаўкі ў порт прызначэння толькі ў тым выпадку, калі гэтым не будуць нанесены страты перавозчыку і іншым адпраўшчыкам або фрахтавальнікам.

### Артыкул 129. Адмова бакоў ад выканання дагавора

Да адпраўлення судна з месца пагрузкі кожны з бакоў мае права адмовіцца ад выканання дагавора без пакрыцця другому боку страт у выпадках:

1) ваенных ці іншых дзеянняў, якія стварылі пагрозу захопу судна або грузу;

2) блакады месца адпраўлення ці месца прызначэння судна;

3) затрымання судна па распараджэнні дзяржаўных органаў і (або) партовых улад па прычынах, якія не залежаць ад бакоў дагавора;

4) прыцягнення судна для дзяржаўных патрэб;

5) забароны дзяржаўнымі органамі і (або) партовымі ўладамі вывазу з месца адпраўлення або ўвозу ў месца прызначэння грузу, які прызначаны для марской перавозкі.

Выпадкі, указаныя ў пунктах 3 і 5 часткі першай гэтага артыкула, не могуць служыць падставай для адмовы ад выканання дагавора без пакрыцця другому боку страт, калі затрымка прадбачыцца кароткачасовая.

Пры адмове ад выканання дагавора да адпраўлення судна на падставах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, перавозчык не нясе выдаткаў па выгрузцы.

Кожны з бакоў з прычыны наступлення якой-небудзь з акалічнасцей, указаных у частцы першай гэтага артыкула, можа адмовіцца ад выканання дагавора таксама падчас рэйса. У такім выпадку адпраўшчык або фрахтавальнік кампенсуюць перавозчыку выдаткі па выгрузцы грузу, іншыя выдаткі, звязаныя з грузам, а таксама выплачваюць фрахт у памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам.

**Артыкул 130. Спыненне дагавора немагчымасцю выканання**

Выкананне дагавора спыняецца незалежна ад волі бакоў, калі пасля заключэння дагавора і да адпраўлення судна ў рэйс з месца пагрузкі наступяць акалічнасці, за якія ні адзін з бакоў не адказвае, у прыватнасці:

1) судна загіне або будзе гвалтоўна захоплена;

2) судна будзе прызнана непрыдатным да плавання;

3) загіне груз, прызначаны для перавозкі.

У выпадку спынення дагавора з прычыны наступлення акалічнасцей, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, ні адзін з бакоў не абавязаны кампенсаваць прычыненыя ў сувязі з гэтым страты.

Дагавор з прычыны ўказаных у частцы першай гэтага артыкула акалічнасцей можа быць спынены і падчас рэйса судна. Пры гэтым адпраўшчык або фрахтавальнік выплачваюць перавозчыку фрахт у памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам, зыходзячы з колькасці выратаванага і выдадзенага атрымальніку грузу.

## ГЛАВА 11
## АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, АДПРАЎШЧЫКА І ФРАХТАВАЛЬНІКА

**Артыкул 131. Адказнасць перавозчыка**

Перавозчык нясе адказнасць за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) грузу, а таксама за пратэрміноўку яго дастаўкі з моманту прыняцця грузу для перавозкі і да моманту яго выдачы.

**Артыкул 132. Падставы вызвалення перавозчыка ад адказнасці**

Перавозчык не нясе адказнасці за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) прынятага для перавозкі грузу, а таксама пратэрміноўку яго дастаўкі, калі дакажа, што страта, нястача або пашкоджанне (псаванне) грузу ці пратэрміноўка яго дастаўкі адбыліся з прычыны:

1) дзеяння непераадольнай сілы;

2) небяспекі або выпадковасцей на моры і ў іншых суднаходных водах;

3) ратавання людзей або разумных мер па ратаванні маёмасці на моры;

4) пажару, узніклага не па віне перавозчыка;

5) дзеянняў або распараджэнняў дзяржаўных органаў і (ці) партовых улад;

6) ваенных дзеянняў або грамадскіх беспарадкаў;

7) дзеяння або бяздзейнасці адпраўшчыка, фрахтавальніка ці атрымальніка;

8) скрытых недахопаў грузу, яго ўласцівасцей або натуральнага змяншэння;

9) скрытых недахопаў тары або ўпакоўкі грузу;

10) недастатковасці або няяснасці марак;

11) забастовак або іншых акалічнасцей, якія выклікалі поўнае ці частковае прыпыненне або абмежаванне работ;

12) іншых акалічнасцей, якія перавозчык не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

Перавозчык не нясе адказнасці, калі дакажа, што страта, нястача або пашкоджанне (псаванне) грузу ці пратэрміноўка яго дастаўкі адбыліся з прычыны скрытых недахопаў судна.

**Артыкул 133. Навігацыйная памылка**

Перавозчык не нясе адказнасці за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) грузу або пратэрміноўку яго дастаўкі, калі дакажа, што яны адбыліся з прычыны дзеянняў і (або) бяздзейнасці капітана судна, іншых членаў экіпажа судна і (або) лоцмана ў суднаваджэнні ці кіраванні суднам (навігацыйная памылка).

**Артыкул 134. Вызваленне перавозчыка ад адказнасці за нястачу грузу, дастаўленага ў апламбаваных памяшканнях, непашкоджанай упакоўцы або з суправаджэннем**

Перавозчык не нясе адказнасці за нястачу грузу, што прыбыў у порт прызначэння ў:

1) непашкоджаных суднавых памяшканнях, ліхтарах, кантэйнерах з непашкоджанымі пломбамі адпраўшчыка або фрахтавальніка;

2) цэлай і непашкоджанай тары без слядоў яе распячатвання ў дарозе;

3) суправаджэнні прадстаўніка адпраўшчыка, фрахтавальніка або атрымальніка, калі толькі асоба, якая прад'яўляе патрабаванне, не дакажа, што нястача грузу адбылася па віне перавозчыка.

**Артыкул 135. Адказнасць перавозчыка за страту або пашкоджанне кантэйнера**

За страту або пашкоджанне кантэйнера ці іншага прыстасавання адпраўшчыка або фрахтавальніка перавозчык нясе адказнасць у наступных памерах:

за страту кантэйнера або іншага прыстасавання – у памеры іх сапраўднага кошту з улікам фактычнага зносу кантэйнера ці прыстасавання на момант іх страты;

за пашкоджанне кантэйнера або іншага прыстасавання – у памеры сапраўднага кошту іх рамонту ў порце прызначэння, калі рамонт не будзе выкананы перавозчыкам самастойна або за свой кошт к моманту здачы кантэйнера ці іншага прыстасавання атрымальніку.

**Артыкул 136. Памер урону, падлеглага пакрыццю за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) грузу**

Урон, прычынены пры марской перавозцы грузу, кампенсуецца перавозчыкам у выпадках:

1) страты або нястачы грузу – у памеры кошту грузу, які страчаны ці якога не хапае;

2) пашкоджання (псавання) грузу – у памеры сумы, на якую панізіўся яго кошт, а пры немагчымасці аднаўлення пашкоджанага грузу – у памеры яго кошту;

3) страты грузу, здадзенага для марской перавозкі з абвяшчэннем яго цэннасці, – у памеры абвешчанага кошту грузу.

Кошт грузу вызначаецца зыходзячы з яго цаны, указанай у рахунку прадаўца або прадугледжанай дагаворам, а пры адсутнасці рахунка ці ўказання цаны ў дагаворы – зыходзячы з цаны, якая пры параўнальных акалічнасцях звычайна спаганяецца за аналагічныя тавары.

Перавозчык нараўне з пакрыццём устаноўленага ўрону, выкліканага стратай, нястачай або пашкоджаннем (псаваннем) грузу, вяртае фрахт, спагнаны за перавозку грузу, які страчаны, якога не хапае, які сапсаваны ці пашкоджаны, калі фрахт не ўваходзіць у кошт грузу.

**Артыкул 137. Абмежаванне адказнасці перавозчыка за пратэрміноўку дастаўкі грузу**

Адказнасць перавозчыка за пратэрміноўку дастаўкі грузу абмяжоўваецца сумай фрахту, калі не даказана, што пратэрміноўка дастаўкі грузу з'явілася вынікам дзеянняў або недагляду перавозчыка, учыненых наўмысна ці па грубай неасцярожнасці.

**Артыкул 138. Адказнасць фактычнага перавозчыка**

Перавозчык нясе адказнасць за дзеянні і (або) бяздзейнасць фактычнага перавозчыка, яго работнікаў і марскіх агентаў, якія дзейнічалі ў межах сваіх службовых абавязкаў і паўнамоцтваў.

Правілы гэтага Кодэкса, якія рэгулююць адказнасць перавозчыка пры марской перавозцы грузаў, прымяняюцца таксама ў дачыненні да адказнасці фактычнага перавозчыка.

У выпадку, калі адказнасць нясуць перавозчык і фактычны перавозчык, іх адказнасць з'яўляецца салідарнай.

Сумы, якія могуць быць спагнаны з перавозчыка і фактычнага перавозчыка, не павінны ў сукупнасці перавышаць межы адказнасці, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

**Артыкул 139. Недзейнасць пагаднення аб абмежаванні або вызваленні ад адказнасці**

Пагадненне перавозчыка з грузаўладальнікам аб абмежаванні або вызваленні ад установленай заканадаўствам адказнасці недзейнае, за выключэннем выпадкаў, калі магчымасць такіх пагадненняў пры марскіх перавозках грузу прадугледжана заканадаўствам.

**Артыкул 140. Выпадкі заключэння пагадненняў аб абмежаванні або вызваленні ад адказнасці**

Перавозчык і грузаўладальнік маюць права заключыць пагадненне аб абмежаванні або вызваленні ад установленай заканадаўствам адказнасці ў выпадках:

1) марской перавозкі грузу на падставе канасамента з моманту прыняцця грузу да яго пагрузкі на судна і пасля выгрузкі грузу да яго здачы;

2) марской перавозкі грузу на падставе канасамента жывых жывёл і грузаў, якія ў адпаведнасці з дагаворам перавозяцца на палубе;

3) марской перавозкі пэўных грузаў на асаблівых умовах, калі характар або стан грузу ці акалічнасці, тэрміны і ўмовы, пры якіх павінна ажыццяўляцца марская перавозка, апраўдваюць заключэнне асаблівага пагаднення і калі ў гэтым выпадку выдаецца не канасамент, а іншы дакумент, які пацвярджае атрыманне грузу для марской перавозкі.

**Артыкул 141. Адказнасць адпраўшчыка і фрахтавальніка**

Адпраўшчык і фрахтавальнік нясуць адказнасць за прычыненыя перавозчыку страты, калі не дакажуць, што страты прычынены не па іх віне або не па віне асоб, за дзеянні або бяздзейнасць якіх яны адказваюць.

**Артыкул 142. Адказнасць за прастой судна па віне адпраўшчыка, фрахтавальніка або атрымальніка**

За прастой судна з прычыны непрад'яўлення ці нясвоечасовага прад'яўлення грузу, затрымкі пагрузачна-разгрузачных работ, якія выконваюцца сродкамі адпраўшчыка, фрахтавальніка або атрымальніка, ці іншых затрымак па віне адпраўшчыка, фрахтавальніка

або атрымальніка адпраўшчык, фрахтавальнік або атрымальнік нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўствам і пагадненнем бакоў.

## РАЗДЗЕЛ V
## МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ

## ГЛАВА 12
## МАРСКАЯ ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ

### Артыкул 143. Дагавор марской перавозкі пасажыра

Паводле дагавора марской перавозкі пасажыра перавозчык абавязваецца перавезці пасажыра ў пункт прызначэння, а ў выпадку здачы пасажырам багажу – таксама даставіць багаж у пункт прызначэння і выдаць яго ўпаўнаважанай на атрыманне багажу асобе.

Пасажыр абавязваецца заплаціць устаноўленую за праезд плату (правазную плату), а пры здачы багажу – і за правоз багажу.

### Артыкул 144. Перыяд марской перавозкі

Марская перавозка пасажыраў уключае наступныя перыяды:

1) у дачыненні да пасажыра і яго каютнага багажу – перыяд, на працягу якога пасажыр і (або) яго каютны багаж знаходзяцца на борце судна, перыяд пасадкі і высадкі і перыяд, на працягу якога пасажыр і яго каютны багаж дастаўляюцца водным шляхам з берага на судна ці наадварот, калі кошт такой перавозкі ўключаны ў кошт білета або калі судна, што выкарыстоўваецца для гэтай мэты, было прадастаўлена ў распараджэнне пасажыра перавозчыкам. У дачыненні да пасажыра перавозка не ахоплівае перыяд, на працягу якога ён знаходзіцца на марскім вакзале, прычале або ў любым іншым партовым збудаванні ці на ім;

2) у дачыненні да каютнага багажу – таксама перыяд, на працягу якога пасажыр знаходзіцца на марскім вакзале, прычале або ў любым іншым партовым збудаванні ці на ім, калі гэты багаж прыняты перавозчыкам, яго работнікам або марскім агентам ці яшчэ не выдадзены пасажыру;

3) у дачыненні да іншага багажу, які не з’яўляецца каютным багажом, – перыяд з моманту прыняцця багажу перавозчыкам, яго работнікам або марскім агентам на беразе ці на борце судна да моманту выдачы гэтага багажу перавозчыкам, яго работнікам або марскім агентам.

### Артыкул 145. Перавозачныя дакументы

Заключэнне дагавора марской перавозкі пасажыра сведчваецца білетам, а здача пасажырам багажу – багажнай квітанцыяй.

Формы білета і багажнай квітанцыі ўстанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

### Артыкул 146. Агульныя ўмовы марской перавозкі пасажыраў

Перавозчык абавязаны:

1) да пачатку марской перавозкі пасажыраў прывесці судна ў стан, прыдатны да плавання і бяспечнай перавозкі пасажыраў, належным чынам укамплектаваць яго экіпажам, падрыхтаваць і забяспечыць усім неабходным і ўтрымліваць яго ў такім стане падчас марской перавозкі пасажыраў;

2) у выпадку, калі Рэспубліка Беларусь з’яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту, да пачатку марской перавозкі пасажыраў пераканацца ў тым, што пасажыры маюць дакументы, неабходныя для ўезду ў Рэспубліку Беларусь;

3) арганізаваць абслугоўванне пасажыраў і забяспечыць іх дакладнай і своечасовай інфармацыяй аб руху суднаў і прадастаўляемых паслугах.

Пры ажыццяўленні марской перавозкі пасажыраў перавозчык мае права правяраць у пасажыраў дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

Пасажыр мае права на:

1) бясплатны правоз багажу і каютнага багажу ў межах устаноўленых нормаў;

2) бясплатны або льготны правоз дзяцей.

Нормы бясплатнага правозу багажу і каютнага багажу ўстанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Правілы бясплатнага або льготнага правозу дзяцей устанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Пасажыр абавязаны па патрабаванні перавозчыка прад’яўляць яму дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

**Артыкул 147. Адмова пасажыра ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра**

Пасажыр мае права ў любы час да адпраўлення судна ў рэйс, а пасля пачатку рэйса – у любым порце, у які судна зойдзе для пасадкі або высадкі пасажыраў, адмовіцца ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра.

Пасажыр, які паведаміў перавозчыку аб адмове ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра, мае права атрымаць назад плату за праезд і правоз багажу ў парадку, памеры і тэрміны, якія вызначаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту.

Калі пасажыр адмовіўся ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра не пазней за тэрмін, устаноўлены рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне марскога транспарту, ці не з’явіўся к адпраўленню судна па хваробе або адмовіўся да адпраўлення судна ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра па гэтай жа прычыне або па прычынах, якія залежаць ад перавозчыка, пасажыру вяртаецца заплачаная ім плата за праезд і правоз багажу ў поўным памеры.

**Артыкул 148. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра**

Перавозчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра ў выпадках:

1) ваенных і іншых дзеянняў, якія ствараюць пагрозу захопу судна;

2) блакады месца адпраўлення або месца прызначэння судна;

3) затрымання судна па распараджэнні дзяржаўных органаў і (або) партовых улад па прычынах, якія не залежаць ад бакоў дагавора;

4) прыцягнення судна для дзяржаўных патрэб;

5) адмовы пасажыра прад’явіць перавозчыку дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту;

6) парушэння пасажырам правіл, устаноўленых кампетэнтнымі органамі замежнай дзяржавы, якая з’яўляецца дзяржавай адпраўлення, прызначэння або транзіту, у адпаведнасці з заканадаўствам гэтай дзяржавы;

7) наяўнасці ў перавозчыка звестак аб тым, што пасажыру будзе адмоўлена ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь, калі Рэспубліка Беларусь з’яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту.

**Артыкул 149. Спыненне дагавора марской перавозкі пасажыра пры немагчымасці яго выканання**

Выкананне дагавора марской перавозкі пасажыра спыняецца незалежна ад волі бакоў, калі судна загіне або будзе гвалтоўна захоплена, прызнана непрыдатным да плавання ці надыдуць іншыя акалічнасці, за якія ні адзін з бакоў не адказвае.

### Артыкул 150. Вяртанне пасажыру платы за праезд

У выпадках спынення дагавора марской перавозкі пасажыра на падставах, прадугледжаных артыкуламі 148 і 149 гэтага Кодэкса, да адпраўлення судна ў рэйс пасажыру вяртаецца плата за праезд і правоз багажу ў поўным памеры, а пры спыненні дагавора пасля пачатку рэйса – яе частка прапарцыянальна адлегласці, на якую марская перавозка не здзейснілася.

### Артыкул 151. Змяненне дагавора марской перавозкі пасажыра

Перавозчык мае права затрымаць адпраўленне судна, змяніць маршрут марской перавозкі, месца пасадкі і (або) высадкі пасажыраў, калі такія дзеянні будуць неабходныя з прычыны дзеяння непераадольнай сілы, неспрыяльных санітарна-эпідэміялагічных умоў у месцы адпраўлення або прызначэння судна ці па маршруце марской перавозкі, а таксама з прычыны іншых падзей і з’яў, якія не залежаць ад перавозчыка і робяць немагчымым выкананне дагавора марской перавозкі пасажыра на ўмовах, прадугледжаных гэтым дагаворам.

Правілы часткі першай гэтага артыкула не абмяжоўваюць правы пасажыра адмовіцца ад выканання дагавора марской перавозкі пасажыра.

У выпадках, прадугледжаных гэтым артыкулам, перавозчык абавязаны кампенсаваць страты, прычыненыя пасажыру змяненнем дагавора марской перавозкі пасажыра.

### Артыкул 152. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю і здароўю пасажыра

Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю і здароўю пасажыра вызначаецца па правілах Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, калі іншым заканадаўствам або дагаворам марской перавозкі пасажыра не прадугледжана павышаная адказнасць перавозчыка.

### Артыкул 153. Адказнасць перавозчыка за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) багажу

Перавозчык нясе адказнасць за незахаванасць багажу, якая адбылася пасля прыняцця яго для перавозкі да выдачы пасажыру ці асобе, упаўнаважанай на атрыманне багажу, калі не дакажа, што страта, нястача або пашкоджанне (псаванне) багажу адбыліся з прычыны акалічнасцей, якія перавозчык не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

Урон, прычынены пры марской перавозцы багажу, кампенсуецца перавозчыкам у выпадках:

1) страты або нястачы багажу – у памеры кошту багажу, які страчаны ці якога не хапае;

2) пашкоджання (псавання) багажу – у памеры сумы, на якую панізіўся яго кошт, а пры немагчымасці аднаўлення пашкоджанага багажу – у памеры яго кошту;

3) страты багажу, здадзенага для перавозкі з абвяшчэннем яго каштоўнасці, – у памеры абвешчанага кошту багажу.

Кошт багажу вызначаецца зыходзячы з яго цаны, указанай у рахунку прадаўца ці прадугледжанай дагаворам, а пры адсутнасці рахунка або ўказання цаны ў дагаворы – зыходзячы з цаны, якая пры параўнальных акалічнасцях звычайна спаганяецца за аналагічныя тавары.

Перавозчык нараўне з пакрыццём устаноўленага ўрону, выкліканага стратай, нястачай або пашкоджаннем (псаваннем) багажу, вяртае правазную плату, спагнаную за перавозку багажу, які страчаны, якога не хапае, які сапсаваны ці пашкоджаны, калі гэта плата не ўваходзіць у кошт багажу.

### Артыкул 154. Адказнасць перавозчыка за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) каютнага багажу

За страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) каютнага багажу па віне перавозчыка перавозчык нясе адказнасць у памеры яго кошту, а ў выпадку немагчымасці яго ўстанаўлення – зыходзячы з цаны, якая пры параўнальных акалічнасцях звычайна спаганяецца за аналагічныя тавары. Памер адказнасці за страту, нястачу або пашкоджанне (псаванне) каютнага багажу не можа перавышаць 1800 разліковых адзінак на пасажыра ў дачыненні да марской перавозкі пасажыраў у цэлым.

### Артыкул 155. Адказнасць фактычнага перавозчыка

Перавозчык нясе адказнасць за дзеянні і (або) бяздзейнасць фактычнага перавозчыка, яго работнікаў і марскіх агентаў, якія дзейнічалі ў межах сваіх службовых абавязкаў і паўнамоцтваў.

Правілы гэтага Кодэкса, якія рэгулююць адказнасць перавозчыка пры марской перавозцы пасажыраў, прымяняюцца таксама ў дачыненні да адказнасці фактычнага перавозчыка.

У выпадках, калі адказнасць нясуць перавозчык і фактычны перавозчык, іх адказнасць з'яўляецца салідарнай.

### Артыкул 156. Страта або пашкоджанне каштоўнасцей

Перавозчык не нясе адказнасці за страту або пашкоджанне грошай, каштоўных папер, золата, вырабаў з золата і серабра, твораў мастацтва ці іншых каштоўнасцей, за выключэннем выпадкаў, калі такія каштоўнасці былі здадзены на захоўванне перавозчыку.

### Артыкул 157. Прымяненне меж адказнасці

Межы адказнасці, прадугледжаныя артыкулам 154 гэтага Кодэкса, прымяняюцца да сукупнасці сум, падлеглых пакрыццю па ўсіх патрабаваннях, узніклых у выніку страты, нястачы або пашкоджання (псавання) каютнага багажу.

У дачыненні да перавозкі, ажыццёўленай фактычным перавозчыкам, сукупнасць сум, падлеглых пакрыццю перавозчыкам, фактычным перавозчыкам і іх работнікамі і марскімі агентамі, якія дзейнічалі ў межах сваіх службовых абавязкаў і паўнамоцтваў, не можа перавышаць найбольшай сумы пакрыцця, якая ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам магла б быць спагнана з перавозчыка ці з фактычнага перавозчыка. Пры гэтым ні адна з указаных асоб не павінна адказваць звыш мяжы адказнасці, падлеглай прымяненню.

### Артыкул 158. Заява аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) багажу

Пасажыр мае права падаць у пісьмовай форме заяву аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) багажу перавозчыку, яго работніку ці марскому агенту ў выпадках:

яўнай страты, нястачы або пашкоджання (псавання) каютнага багажу – да ці ў момант высадкі пасажыра, а ў дачыненні да багажу – да ці ў момант яго выдачы;

страты, нястачы або пашкоджання (псавання) каютнага багажу, багажу, якія не з'яўляюцца відавочнымі, – на працягу пятнаццаці дзён з дня высадкі пасажыра або з дня выдачы багажу ці з моманту, калі ён павінен быць выдадзены.

Заява аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) багажу ў пісьмовай форме не патрабуецца, калі стан багажу быў устаноўлены або праверваны ў момант яго атрымання сумесна:

пасажырам і перавозчыкам ці яго работнікам або марскім агентам;

пасажырам і фактычным перавозчыкам ці яго работнікам або марскім агентам.

**Артыкул 159. Незапатрабаваны багаж**

Багаж, не запатрабаваны на працягу трох месяцаў з дня прыходу судна ў порт прызначэння, можа быць прададзены або знішчаны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

**Артыкул 160. Бясплатная перавозка ў адпаведнасці з дагаворам марской перавозкі пасажыра**

Правілы гэтага раздзела прымяняюцца таксама да асоб, якія перавозяцца на судне бясплатна ў адпаведнасці з дагаворам марской перавозкі пасажыра.

## РАЗДЗЕЛ VI
## ФРАХТАВАННЕ СУДНА НА ЧАС

### ГЛАВА 13
### ДАГАВОР АРЭНДЫ (ФРАХТАВАННЯ НА ЧАС) СУДНА З ЭКІПАЖАМ (ТАЙМ-ЧАРТАР)

**Артыкул 161. Паняцце дагавора**

Па дагаворы арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам (тайм-чартары) суднаўладальнік (арэндадаўца) прадастаўляе фрахтавальніку (арандатару) судна за плату ў часовае валоданне і карыстанне і аказвае сваімі сіламі паслугі па кіраванні ім і па яго тэхнічнай эксплуатацыі.

**Артыкул 162. Форма і істотныя ўмовы дагавора**

Тайм-чартар заключаецца ў пісьмовай форме і павінен утрымліваць найменні бакоў, назву судна, указанне флага, тэхнічныя і эксплуатацыйныя даныя, раён плавання, мэту арэнды, памер платы (фрахт), тэрмін дзеяння дагавора, месца прыёму і здачы судна.

**Артыкул 163. Субарэнда судна з экіпажам**

Фрахтавальнік (арандатар) мае права без згоды суднаўладальніка (арэндадаўцы) здаваць судна ў субарэнду (субтайм-чартар), калі тайм-чартарам не прадугледжана іншае.

Заключэнне субтайм-чартару не вызваляе фрахтавальніка (арандатара) ад выканання дагавора, заключанага ім з суднаўладальнікам (арэндадаўцам).

Да субтайм-чартару прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса.

**Артыкул 164. Абавязак суднаўладальніка (арэндадаўцы) па ўтрыманні судна**

Суднаўладальнік (арэндадаўца) на працягу ўсяго тэрміну тайм-чартару абавязаны падтрымліваць судна ў належным стане, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту і прадастаўленне неабходных прылад.

**Артыкул 165. Абавязкі суднаўладальніка (арэндадаўцы) па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі судна**

Паслугі па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі судна, якія прадастаўляюцца фрахтавальніку (арандатару) суднаўладальнікам (арэндадаўцам), павінны забяспечыць яго нармальную і бяспечную эксплуатацыю ў адпаведнасці з мэтамі арэнды, указанымі ў тайм-чартары.

Выдаткі па аплаце паслуг членаў экіпажа судна, а таксама выдаткі на іх утрыманне нясе суднаўладальнік (арэндадаўца), калі тайм-чартарам не прадугледжана іншае.

**Артыкул 166. Абавязкі фрахтавальніка (арандатара) па камерцыйнай эксплуатацыі і вяртанні судна**

Фрахтавальнік (арандатар) абавязаны карыстацца суднам і паслугамі экіпажа судна ў адпаведнасці з мэтамі і ўмовамі іх прадастаўлення, вызначанымі тайм-чартарам.

Фрахтавальнік (арандатар) нясе выдаткі, якія ўзнікаюць у сувязі з камерцыйнай эксплуатацыяй судна, у тым ліку выдаткі на аплату паліва, іншых матэрыялаў, якія расходуюцца ў працэсе эксплуатацыі, і на аплату збораў, калі іншае не прадугледжана тайм-чартарам.

Па заканчэнні тэрміну тайм-чартару фрахтавальнік (арандатар) абавязаны вярнуць судна ў тым стане, у якім яно ім было атрымана, за выключэннем нармальнага зносу.

Пры нясвоечасовым вяртанні судна фрахтавальнік (арандатар) аплачвае час затрымкі судна па стаўцы фрахту, прадугледжанай у тайм-чартары, або па рыначнай стаўцы фрахту, калі яна перавышае стаўку фрахту, узгодненую ў тайм-чартары.

**Артыкул 167. Страхаванне судна**

Калі іншае не прадугледжана тайм-чартарам, абавязак страхаваць судна і (або) страхаваць адказнасць за ўрон, які можа быць прычынены ім або ў сувязі з яго эксплуатацыяй, ускладаецца на суднаўладальніка (арэндадаўцы) у выпадку, калі такі абавязак вынікае з добраахвотна прынятага абавязацельства па заключэнні дагавора страхавання.

**Артыкул 168. Падпарадкаванасць экіпажа судна**

Члены экіпажа судна з’яўляюцца работнікамі суднаўладальніка (арэндадаўцы). Яны падпарадкоўваюцца распараджэнням суднаўладальніка (арэндадаўцы), якія датычацца кіравання і тэхнічнай эксплуатацыі, і распараджэнням фрахтавальніка (арандатара), якія тычацца камерцыйнай эксплуатацыі судна.

**Артыкул 169. Выплата фрахту**

Фрахтавальнік (арандатар) выплачвае суднаўладальніку (арэндадаўцу) фрахт у памеры, парадку і тэрміны, прадугледжаныя тайм-чартарам. Фрахтавальнік (арандатар) вызваляецца ад выплаты фрахту і выдаткаў па эксплуатацыі судна за час, на працягу якога яно было непрыдатнае да эксплуатацыі з прычыны немараходнага стану.

Калі судна стала непрыдатным да эксплуатацыі па віне фрахтавальніка (арандатара), суднаўладальнік (арэндадаўца) мае права на фрахт, абумоўлены ў тайм-чартары, незалежна ад пакрыцця фрахтавальнікам (арандатарам) прычыненых яму страт.

У выпадку пратэрміноўкі выплаты фрахту, якая перавышае чатырнаццаць каляндарных дзён, суднаўладальнік (арэндадаўца) мае права без папярэджання забраць судна ў фрахтавальніка (арандатара) і спагнаць з яго прычыненыя пратэрміноўкай страты.

У выпадку гібелі судна фрахт падлягае выплаце па дзень гібелі судна, а калі гэты дзень устанавіць немагчыма – па дзень атрымання апошняга паведамлення аб ім.

**Артыкул 170. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі**

Узнагароджанне, належнае судну за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі, якая мела месца да заканчэння дзеяння тайм-чартару, размяркоўваецца ў роўных долях паміж суднаўладальнікам (арэндадаўцам) і фрахтавальнікам (арандатарам) за вылікам выдаткаў на ратаванне і долі ўзнагароджання, належнай экіпажу судна.

**Артыкул 171. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) перад трэцімі асобамі**

Калі судна прадастаўлена фрахтавальніку (арандатару) для марской перавозкі грузаў, ён мае права ад свайго імені заключаць дагаворы марской перавозкі, выдаваць канасаменты і іншыя перавозачныя дакументы. Фрахтавальнік (арандатар) нясе адказнасць па абавязацельствах, якія вынікаюць з гэтых дагавораў і дакументаў.

**Артыкул 172. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна**

Фрахтавальнік (арандатар) абавязаны пакрыць страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна, калі суднаўладальнік (арэндадаўца) дакажа, што ратаванне, гібель або пашкоджанне судна адбыліся па акалічнасцях, за якія фрахтавальнік (арандатар) адказвае ў адпаведнасці з заканадаўствам або тайм-чартарам.

## РАЗДЗЕЛ VII
## АРЭНДА СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА (БЕРБОЎТ-ЧАРТАР)

## ГЛАВА 14
## ДАГАВОР АРЭНДЫ СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА (БЕРБОЎТ-ЧАРТАР)

**Артыкул 173. Паняцце дагавора**

Паводле дагавора арэнды судна без экіпажа (бербоўт-чартару) арэндадаўца прадастаўляе арандатару судна за плату ў часовае валоданне і карыстанне без аказання паслуг па кіраванні ім і яго тэхнічнай эксплуатацыі.

**Артыкул 174. Форма і істотныя ўмовы дагавора**

Бербоўт-чартар заключаецца ў пісьмовай форме і павінен утрымліваць найменні бакоў, назву судна, указанне сцяга, тэхнічныя і эксплуатацыйныя даныя, раён плавання, мэту арэнды, час і месца прыёму і здачы судна, памер платы, тэрмін арэнды.

**Артыкул 175. Субарэнда судна без экіпажа**

Арандатар мае права без згоды арэндадаўцы здаваць арандаванае судна ў субарэнду (суббербоўт-чартар) на ўмовах тайм-чартару або бербоўт-чартару, калі бербоўт-чартарам не прадугледжана іншае.

Заключэнне суббербоўт-чартару не вызваляе арандатара ад выканання дагавора, заключанага ім з арэндадаўцам.

**Артыкул 176. Абавязак арэндадаўцы прывесці судна ў мараходны стан**

Арэндадаўца абавязаны праявіць належную клапатлівасць аб прывядзенні судна ў мараходны стан да моманту яго перадачы арандатару і прыняць меры да забеспячэння прыдатнасці корпуса судна, яго рухавіка і абсталявання для мэт, прадугледжаных бербоўт-чартарам.

**Артыкул 177. Абавязак арандатара па ўтрыманні судна**

Арандатар на працягу ўсяго тэрміну бербоўт-чартару абавязаны падтрымліваць судна ў належным стане, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту і прадастаўленне неабходных прыналежнасцей.

**Артыкул 178. Абавязак арандатара па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі судна**

Арандатар сваімі сіламі ажыццяўляе кіраванне суднам і яго эксплуатацыю, як камерцыйную, так і тэхнічную.

**Артыкул 179. Экіпаж судна**

Камплектаванне экіпажа судна ажыццяўляецца арандатарам.

Капітан судна і іншыя члены экіпажа судна з’яўляюцца работнікамі арандатара і падпарадкоўваюцца яго ўказанням і распараджэнням.

**Артыкул 180. Плата па бербоўт-чартары**

Арандатар выплачвае арэндадаўцу плату паводле бербоўт-чартару наперад па месячнай стаўцы, узгодненай бакамі. Арандатар вызваляецца ад платы паводле бербоўт-чартару і выдаткаў па эксплуатацыі судна за час, на працягу якога яно было непрыдатнае да эксплуатацыі з прычыны немараходнага стану, за выключэннем выпадкаў, калі непрыдатнасць наступіла па віне арандатара ці з прычыны вінаватых дзеянняў і (або) бяздзейнасці экіпажа судна.

У выпадку затрымкі платы паводле бербоўт-чартару, якая перавышае чатырнаццаць каляндарных дзён, арэндадаўца мае права без папярэджання забраць судна ў арандатара і спагнаць з яго прычыненыя затрымкай страты.

У выпадку гібелі судна плата паводле бербоўт-чартару праводзіцца па дзень гібелі судна ўключна, а калі гэты дзень устанавіць немагчыма – па дзень атрымання апошняга паведамлення аб ім.

**Артыкул 181. Правы і абавязкі арандатара па эксплуатацыі і вяртанні судна**

Арандатар ажыццяўляе эксплуатацыю судна ў адпаведнасці з умовамі бербоўт-чартару і нясе ўсе звязаныя з гэтым выдаткі, забяспечвае ўтрыманне экіпажа судна, аплачвае выдаткі і зборы па эксплуатацыі судна, уключаючы выдаткі па яго страхаванні.

Арандатар мае права без згоды арэндадаўцы ад свайго імені заключаць з трэцімі асобамі дагаворы марской перавозкі і іншыя дагаворы, калі яны не супярэчаць мэтам выкарыстання судна па бербоўт-чартары.

Па заканчэнні тэрміну бербоўт-чартару арандатар абавязаны вярнуць судна арэндадаўцу ў тым стане, у якім яно ім было атрымана, за выключэннем нармальнага зносу.

**Артыкул 182. Адказнасць арандатара перад трэцімі асобамі**

Арандатар нясе адказнасць перад трэцімі асобамі па любых іх патрабаваннях, звязаных з эксплуатацыяй судна, у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 183. Адказнасць арандатара за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна**

Арандатар абавязаны пакрыць страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна, калі такія страты былі прычынены па яго віне, уключаючы віну экіпажа судна.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## ДАГАВОР БУКСІРОЎКІ

## ГЛАВА 15
## ДАГАВОР БУКСІРОЎКІ

**Артыкул 184. Паняцце дагавора буксіроўкі**

Паводле дагавора буксіроўкі ўладальнік аднаго судна абавязваецца за ўзнагароджанне буксіраваць другое судна або іншае збудаванне, здольнае ажыццяўляць плаванне, на пэўную адлегласць або на працягу пэўнага часу (марская буксіроўка) ці для выканання манеўраў на акваторыі порта, уключаючы ўвод судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, у порт або вывад іх з порта (партовая буксіроўка).

**Артыкул 185. Форма дагавора буксіроўкі**

Дагавор марской буксіроўкі заключаецца ў пісьмовай форме.

Дагавор партовай буксіроўкі можа заключацца як у пісьмовай, так і ў вуснай форме. Пагадненне аб ускладанні абавязкаў па кіраўніцтве буксіроўкай на капітана буксіравальнага судна заключаецца ў пісьмовай форме.

**Артыкул 186. Абавязкі бакоў**

Кожны з бакоў у дагаворы буксіроўкі абавязаны загадзя прывесці сваё судна або іншае збудаванне, здольнае ажыццяўляць плаванне, у стан, прыдатны для буксіроўкі.

Уладальнікі суднаў і іншых аб’ектаў буксіроўкі не нясуць адказнасці за недахопы свайго судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, калі дакажуць, што яны з’яўляліся скрытымі.

Буксіроўка павінна ажыццяўляцца з праяўленнем майстэрства, як таго патрабуюць акалічнасці, без перапынку і затрымак, не выкліканых неабходнасцю, і ў адпаведнасці з прынцыпамі добрай марской практыкі.

Судна або іншае збудаванне, здольнае ажыццяўляць плаванне, якія знаходзяцца пад кіраўніцтвам капітана іншага судна або збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, павінны таксама праяўляць клопат аб бяспечным плаванні буксірнага каравана.

**Артыкул 187. Адказнасць пры марской буксіроўцы**

Марская буксіроўка ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам капітана буксіравальнага судна.

Адказнасць за страты, прычыненыя пры марской буксіроўцы буксіруемаму судну або іншаму збудаванню, здольнаму ажыццяўляць плаванне, ці людзям і маёмасці, якія знаходзяцца на ім, нясе ўладальнік буксіравальнага судна, калі не дакажа, што страты прычынены не па яго віне.

Пагадненнем бакоў абавязак па кіраўніцтве марской буксіроўкай можа быць ускладзены на капітана буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне. У гэтым выпадку адказнасць за страты, прычыненыя пры буксіроўцы буксіравальнаму судну або людзям і маёмасці, якія знаходзяцца на ім, нясе ўладальнік

буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, калі не дакажа, што страты прычынены не па яго віне.

**Артыкул 188. Адказнасць пры партовай буксіроўцы**

Партовая буксіроўка ажыццяўляецца пад кіраваннем капітана буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне.

Адказнасць за страты, прычыненыя пры партовай буксіроўцы буксіравальнаму судну або людзям і маёмасці, якія знаходзяцца на ім, нясе ўладальнік буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, калі не дакажа, што страты прычынены не па яго віне.

Пагадненнем, заключаным у пісьмовай форме, бакі могуць ускласці кіраванне партовай буксіроўкай на капітана буксіравальнага судна. У гэтым выпадку адказнасць за страты, прычыненыя буксіравальнаму судну або іншаму збудаванню, здольнаму ажыццяўляць плаванне, ці людзям і маёмасці, якія знаходзяцца на ім, нясе ўладальнік буксіравальнага судна, калі не дакажа, што страты прычынены не па яго віне.

**Артыкул 189. Перыяд буксіроўкі**

Пачаткам буксіроўкі лічыцца момант прыняцця буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, на буксір у пачатковым пункце буксіроўкі, а заканчэннем – момант пастаноўкі буксіруемага судна або іншага збудавання, здольнага ажыццяўляць плаванне, на швартовы або якар у канцавым пункце буксіроўкі.

**Артыкул 190. Дапамога буксіруемаму судну ў выпадку марскога здарэння**

У выпадку марскога здарэння з буксіруемым суднам або іншым збудаваннем, здольным ажыццяўляць плаванне, капітан буксіравальнага судна абавязаны прадаставіць буксіруемаму судну або іншаму збудаванню, здольнаму ажыццяўляць плаванне, выратавальныя сродкі і аказваць ім неабходную дапамогу да таго часу, пакуль пацярпелае судна або іншае збудаванне, здольнае ажыццяўляць плаванне, не змогуць абысціся без выратавальніка, з пакрыццём толькі фактычных выдаткаў буксіравальнага судна і без аплаты выратавальнага ўзнагароджання.

## РАЗДЗЕЛ IX
## АПЛАТНАЕ АКАЗАННЕ ПАСЛУГ

## ГЛАВА 16
## ДАГАВОР АКАЗАННЯ ПАСЛУГ ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ МАРСКОГА КРУІЗУ (ДАГАВОР МАРСКОГА КРУІЗУ)

**Артыкул 191. Паняцце дагавора марскога круізу**

Паводле дагавора марскога круізу адзін бок (арганізатар круізу) абавязваецца па заданні другога боку (удзельніка круізу) аказаць паслугі па арганізацыі і (або) ажыццяўленні марскога падарожжа (круізу) па пэўнай праграме (марская перавозка, харчаванне, бытавое і экскурсійнае абслугоўванне і да т.п.), а ўдзельнік круізу абавязваецца заплаціць устаноўленую плату.

Дагавор марскога круізу сведчыцца пуцёўкай або іншым прыраўнаваным да яе дакументам, выдадзеным арганізатарам круізу.

**Артыкул 192. Аднабаковая адмова ад выканання дагавора марскога круізу**

Удзельнік круізу мае права да пачатку круізу адмовіцца ад выканання дагавора марскога круізу пры ўмове аплаты арганізатару круізу фактычна панесеных выдаткаў. Удзельнік круізу, які паведаміў арганізатару круізу аб адмове ад выканання дагавора марскога круізу, мае права атрымаць назад плату за круіз у парадку, памеры і тэрміны, устаноўленыя дагаворам марскога круізу.

У выпадку, калі арганізатар круізу не можа прадаставіць удзельніку круізу месца на судне, абумоўленае ў дагаворы марскога круізу, або такое самае месца на судне, якое па сваіх характарыстыках і ўмовах абслугоўвання не ўступае абумоўленаму, удзельнік круізу мае права адмовіцца ад выканання дагавора марскога круізу. Арганізатар круізу абавязаны вярнуць у поўным памеры ўстаноўленую плату за круіз, а таксама пакрыць іншыя панесеныя ўдзельнікам круізу ў сувязі з гэтым страты.

Арганізатар круізу мае права адмовіцца ад выканання дагавора марскога круізу пры наступленні акалічнасцей, прадугледжаных артыкуламі 148 і 149 гэтага Кодэкса.

Пры адмове ад выканання дагавора марскога круізу да пачатку круізу арганізатар круізу абавязаны вярнуць удзельніку круізу плату за круіз у поўным памеры, а пры адмове ад выканання дагавора пасля пачатку круізу – плату за нявыкарыстаную частку круізу. Па патрабаванні ўдзельніка круізу арганізатар круізу абавязаны за свой кошт даставіць яго ў порт адпраўлення.

**Артыкул 193. Павелічэнне тэрміну круізу**

У выпадку павелічэння тэрміну круізу з прычыны непрадбачаных акалічнасцей арганізатар круізу нясе ўсе дадатковыя выдаткі, звязаныя з прадастаўленнем паслуг удзельніку круізу.

**Артыкул 194. Адказнасць арганізатара круізу**

Арганізатар круізу нясе адказнасць за шкоду, прычыненую жыццю або здароўю ўдзельніка круізу, а таксама за страты, прычыненыя згубай, нястачай або пашкоджаннем (псаваннем) яго рэчаў і іншай маёмасці, у адпаведнасці з артыкуламі 152–158 гэтага Кодэкса.

Арганізатар круізу, які пакрыў удзельніку круізу страты, прычыненыя перавозчыкам або трэцяй асобай, мае права адваротнага патрабавання да перавозчыка або гэтай трэцяй асобы ў памеры выплачанага пакрыцця.

**Артыкул 195. Неправадзейнасць пагаднення аб абмежаванні правоў удзельніка круізу**

Пагадненне бакоў, якое абмяжоўвае правы ўдзельніка круізу, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, з'яўляецца неправадзейным.

## ГЛАВА 17
## ДАГАВОР АКАЗАННЯ ПАСЛУГ МАРСКОГА АГЕНТА

**Артыкул 196. Паняцце дагавора аказання паслуг марскога агента**

Паводле дагавора аказання паслуг марскога агента адзін бок (марскі агент) абавязваецца за ўзнагароджанне ажыццяўляць юрыдычныя дзеянні ў галіне гандлёвага мараплаўства ў якасці пастаяннага прадстаўніка другога боку (суднаўладальніка) у пэўным порце або на пэўнай тэрыторыі.

**Артыкул 197. Дзеянні марскога агента ад імені абодвух бакоў**

Пры заключэнні дагавора ад імені суднаўладальніка марскі агент, які выступае ў якасці камерцыйнага прадстаўніка, можа дзейнічаць таксама на карысць другога дагаворнага боку, калі ён яго на тое ўпаўнаважыў і суднаўладальнік з гэтым згодны.

**Артыкул 198. Абавязкі марскога агента**

Марскі агент абавязаны:

1) ажыццяўляць сваю дзейнасць добрасумленна ў адпаведнасці са звычайнай марской практыкай;

2) дзейнічаць у межах сваіх паўнамоцтваў;

3) не перадаваць ажыццяўленне сваіх функцый іншай асобе, калі толькі ён не быў упаўнаважаны на гэта;

4) весці ўлік выдаткавання сродкаў;

5) прадстаўляць суднаўладальніку справаздачы ў парадку і тэрміны, прадугледжаныя дагаворам.

**Артыкул 199. Абавязкі суднаўладальніка**

Суднаўладальнік абавязаны:

1) прадастаўляць марскому агенту сродкі, дастатковыя для ажыццяўлення яго функцый;

2) пакрываць марскому агенту выдаткі, зробленыя ім ад імені суднаўладальніка ў межах прадастаўленых яму паўнамоцтваў;

3) несці адказнасць за наступствы любых дзеянняў марскога агента ў межах яго паўнамоцтваў;

4) выплачваць марскому агенту ўзнагароджанне ў памеры і парадку, устаноўленых дагаворам.

У выпадку абмежавання суднаўладальнікам паўнамоцтваў марскога агента любая здзелка, ажыццёўленая марскім агентам з трэцяй асобай, якая дзейнічала добрасумленна, з'яўляецца правадзейнай і стварае правы і абавязкі па ажыццёўленай для суднаўладальніка здзелцы, калі толькі трэцяй асобе не было вядома аб такім абмежаванні.

**Артыкул 200. Спыненне дагавора аказання паслуг марскога агента**

Дагавор аказання паслуг марскога агента, заключаны на пэўны тэрмін, спыняецца па сканчэнні гэтага тэрміну.

Калі дагавор аказання паслуг марскога агента заключаны на няпэўны тэрмін, кожны з бакоў мае права скасаваць дагавор, паведаміўшы другому боку аб гэтым не менш чым за тры месяцы да мяркуемай даты скасавання дагавора.

## ГЛАВА 18
## ДАГАВОР АКАЗАННЯ МАРСКІХ ПАСЯРЭДНІЦКІХ ПАСЛУГ

**Артыкул 201. Паняцце дагавора аказання марскіх пасярэдніцкіх паслуг**

Паводле дагавора аказання марскіх пасярэдніцкіх паслуг адзін бок (марскі брокер) абавязваецца ад імені і за кошт другога боку (даверніка) аказваць пасярэдніцкія паслугі пры заключэнні дагавораў куплі-продажу суднаў, дагавораў фрахтавання, дагавораў буксіроўкі і дагавораў марскога страхавання.

**Артыкул 202. Ажыццяўленне марскім брокерам дзеянняў марскога агента**

Марскі брокер можа па ўказанні даверніка ажыццяўляць дзеянні, якія выконвае марскі агент. У такім выпадку прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса аб дагаворы аказання паслуг марскога агента.

**Артыкул 203. Узнагароджанне паслуг марскога брокера**

Марскі брокер мае права на ўзнагароджанне за пасярэдніцкія паслугі пры заключэнні дагавораў, указаных у артыкуле 201 гэтага Кодэкса.

## РАЗДЗЕЛ X
## МАРСКОЕ СТРАХАВАННЕ

### ГЛАВА 19
### МАРСКОЕ СТРАХАВАННЕ

**Артыкул 204. Добраахвотнае страхаванне**

У галіне гандлёвага мараплаўства можа ажыццяўляцца добраахвотнае страхаванне жыцця, здароўя і маёмасці пасажыраў, грузаў і багажу, фрахту, жыцця і здароўя членаў экіпажа судна, якія знаходзяцца на борце судна пры выкананні імі працоўных абавязкаў, судна, у тым ліку і судна, якое будуецца, грамадзянскай адказнасці за шкоду, прычыненую жыццю, здароўю і (або) маёмасці іншых асоб, у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 205. Абавязковае страхаванне**

Абавязковае страхаванне ў галіне гандлёвага мараплаўства ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 206. Абандон**

Калі маёмасць застрахавана ад страты (гібелі), страхавальнік або выгаданабывальнік могуць заявіць страхоўшчыку аб адмове ад сваіх правоў на застрахаваную маёмасць (абандон) і атрымаць страхавое пакрыццё ў памеры страхавой сумы (ліміту адказнасці) у выпадку:

1) прапажы судна без вестак;

2) знішчэння судна і (або) грузу (поўная фактычная гібель);

3) канструктыўнай гібелі судна;

4) эканамічнай немэтазгоднасці ліквідацыі пашкоджанняў або дастаўкі застрахаванага грузу ў месца прызначэння;

5) захопу судна і (або) грузу, застрахаваных ад такой небяспекі, калі захоп цягнецца больш за два месяцы.

У выпадках, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, да страхоўшчыка пераходзяць:

пры страхаванні маёмасці ў поўным страхавым кошце – усе правы на застрахаваную маёмасць;

пры страхаванні маёмасці ў частцы страхавога кошту – права на долю застрахаванай маёмасці прапарцыянальна адносінам страхавой сумы (ліміту адказнасці) да страхавога кошту.

Пагадненне бакоў, якое супярэчыць правілам гэтага артыкула, з’яўляецца нікчэмным.

**Артыкул 207. Заява аб абандоне**

Заява аб абандоне павінна быць пададзена страхоўшчыку на працягу шасці месяцаў з моманту наступлення акалічнасцей або заканчэння тэрмінаў, указаных у артыкулах 36 і 206 гэтага Кодэкса.

Па сканчэнні шасці месяцаў страхавальнік або выгаданабывальнік пазбаўляюцца права на абандон, але могуць запатрабаваць пакрыцця страт на агульных падставах.

Заява аб абандоне не можа быць пададзена страхавальнікам або выгаданабывальнікам умоўна і не можа быць узята назад.

Пагадненне бакоў, якое супярэчыць правілам гэтага артыкула, з'яўляецца нікчэмным.

**Артыкул 208. Асацыяцыі ўзаемнага страхавання**

Суднаўладальнікі маюць права ўступаць у міжнародныя асацыяцыі для ўзаемнага страхавання ўсіх відаў сваёй адказнасці.

## ГЛАВА 20 ВЫКЛЮЧАНА

**Артыкул 239. Выключаны**

**Артыкул 240. Выключаны**

# РАЗДЗЕЛ XI
# ІПАТЭКА СУДНА АБО СУДНА, ЯКОЕ БУДУЕЦЦА

## ГЛАВА 21
## ІПАТЭКА СУДНА АБО СУДНА, ЯКОЕ БУДУЕЦЦА

**Артыкул 241. Права на іпатэку суднаў**

Судна, зарэгістраванае ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе, або судна, якое будуецца і права ўласнасці на якое зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе, могуць быць закладзены з мэтай забеспячэння грашовага абавязацельства дагаворам уласніка судна або судна, якое будуецца (заклададаўцы), і крэдытора (закладатрымальніка) з наступнай рэгістрацыяй іпатэкі ў гэтым самым рэестры суднаў або суднавай кнізе, у якіх зарэгістраваны судна або права ўласнасці на судна, якое будуецца.

Іпатэка замежнага судна, у тым ліку судна, якому часова прадастаўлена права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, а таксама судна, якое будуецца для замежнага заказчыка, не можа быць зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь.

Калі судна або судна, якое будуецца, знаходзяцца ў агульнай долевай уласнасці, то закладзена можа быць любая доля ў судне або судне, якое будуецца.

Судна або судна, якое будуецца, што знаходзяцца ў агульнай сумеснай уласнасці, могуць быць закладзены са згоды ўсіх уласнікаў. Уласнік долі ў судне або судне, якое

будуецца, мае права закласці сваю долю самастойна, але ўсё судна або судна, якое будуецца, што знаходзяцца ў агульнай долевай уласнасці, могуць быць закладзены са згоды ўсіх уласнікаў.

### Артыкул 242. Форма і істотныя ўмовы дагавора іпатэкі судна або судна, якое будуецца

Дагавор іпатэкі судна або судна, якое будуецца, заключаецца ў пісьмовай форме і натарыяльна сведчыцца.

У дагаворы іпатэкі судна або судна, якое будуецца, павінны быць указаны найменні і месцы знаходжання бакоў, прадмет іпатэкі, змест, памер і тэрмін выканання абавязацельства, якое забяспечваецца іпатэкай, кошт і месца знаходжання судна, а таксама любыя іншыя ўмовы, адносна якіх паводле заявы аднаго з бакоў павінна быць дасягнута пагадненне.

### Артыкул 243. Прадмет іпатэкі судна або судна, якое будуецца

Калі дагаворам іпатэкі судна не прадугледжана іншае, іпатэка судна распаўсюджваецца на прадметы, непарыўна звязаныя з суднам і прыналежныя ўласніку судна, а таксама на страхавое пакрыццё, належнае згодна з дагаворам марскога страхавання судна, на ўмовах адказнасці за гібель судна. Іпатэка судна не распаўсюджваецца на фрахт.

Калі дагаворам іпатэкі судна, якое будуецца, не прадугледжана іншае, іпатэка судна, якое будуецца, распаўсюджваецца на матэрыялы і абсталяванне, прызначаныя для яго будаўніцтва, пры ўмове, што яны знаходзяцца ў межах верфі і дакладна ідэнтыфікаваны шляхам маркіроўкі або іншым спосабам, а таксама на страхавое пакрыццё, належнае згодна з дагаворам марскога страхавання судна, на ўмовах адказнасці за гібель судна, якое будуецца.

У выпадку, калі прадметам іпатэкі судна або судна, якое будуецца, з’яўляюцца два і больш судны або судны, якія будуюцца, кожнае з іх паасобку або ўсе разам служаць забеспячэннем выканання абавязацельства ў поўным памеры, калі толькі ў дагаворы прама не прадугледжана, у якім памеры выкананне абавязацельства забяспечваецца кожным суднам паасобку. Даныя аб памеры такога забеспячэння павінны быць унесены ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу пры рэгістрацыі іпатэкі.

### Артыкул 244. Дзяржаўная рэгістрацыя іпатэкі судна або судна, якое будуецца

Іпатэка судна або судна, якое будуецца, ці долі ў іх рэгіструецца паводле заявы заклададаўцы або закладатрымальніка.

У заяве аб дзяржаўнай рэгістрацыі ўказваюцца:

1) даныя, якія ідэнтыфікуюць судна (назва, порт дзяржаўнай рэгістрацыі, рэгістрацыйны нумар, тып і клас судна, танаж) або судна, якое будуецца (месца будаўніцтва судна, будаўнічы нумар, тып судна, даўжыня кіля і іншыя асноўныя памеры, рэгістрацыйны нумар);

2) найменне і адрас заклададаўцы;

3) найменне і адрас закладатрымальніка;

4) памер абавязацельства, забяспечанага іпатэкай згодна з дагаворам іпатэкі судна або судна, якое будуецца, а пры іпатэцы двух і больш суднаў або суднаў, якія будуюцца, – памер, у якім выкананне абавязацельства забяспечваецца іпатэкай кожнага судна паасобку пры наяўнасці аб гэтым пагаднення бакоў;

5) дата заканчэння іпатэкі.

Да заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі прыкладаецца натарыяльна засведчаная копія дагавора іпатэкі.

Іпатэка рэгіструецца на дату атрымання заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

У Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносяцца ўсе звесткі, указаныя ў заяве аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула.

Орган, які зарэгістраваў іпатэку, павінен выдаць заклададаўцу і закладатрымальніку пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці са звесткамі, якія ўтрымліваюцца ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі іпатэкі судна не патрабуецца ўносіць якія-небудзь запісы аб гэтым у суднавыя дакументы.

**Артыкул 245. Чарговасць задавальнення патрабаванняў, якія ўзнікаюць з абавязацельстваў, забяспечаных іпатэкай судна або судна, якое будуецца**

Калі дзве і больш іпатэкі зарэгістраваны на адно і тое ж судна або судна, якое будуецца, ці на адну і тую ж долю судна або судна, якое будуецца, чарговасць задавальнення патрабаванняў, якія ўзнікаюць з абавязацельстваў, забяспечаных іпатэкай, вызначаецца часам іх дзяржаўнай рэгістрацыі. Іпатэка, зарэгістраваная раней, мае прыярытэт перад іпатэкай, зарэгістраванай пазней. Пры гэтым іпатэкі, зарэгістраваныя ў адзін дзень, маюць аднолькавую сілу.

Чарговасць задавальнення патрабаванняў, якія ўзнікаюць з абавязацельстваў, забяспечаных іпатэкай, прадугледжаная часткай першай гэтага артыкула, можа быць зменена пагадненнем заклададаўцы і закладатрымальнікаў. Такое пагадненне падлягае рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

**Артыкул 246. Наступная іпатэка**

Наступная іпатэка дапускаецца, калі яна не забаронена папярэднімі дагаворамі аб іпатэцы.

Заклададаўца абавязаны паведаміць кожнаму наступнаму закладатрымальніку аб усіх існуючых іпатэках судна або судна, якое будуецца, а таксама аб характары і памеры забяспечаных гэтымі іпатэкамі абавязацельстваў. Заклададаўца абавязаны пакрыць страты, прычыненыя любому закладатрымальніку з прычыны невыканання гэтага абавязку.

**Артыкул 247. Уступка правоў паводле дагавора іпатэкі**

Закладатрымальнік мае права ўступіць свае правы паводле дагавора іпатэкі іншай асобе.

Пры ўступцы правоў паводле дагавора іпатэкі ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносіцца запіс аб часе ўступкі, найменні і адрасе асобы, на карысць якой зроблена ўступка.

**Артыкул 248. Захаванасць прадмета іпатэкі**

Заклададаўца абавязаны прымаць належныя меры па захаванні і падтрыманні ў парадку закладзеных судна або судна, якое будуецца. Калі невыкананне гэтага абавязку вядзе да значнага абясцэньвання закладзеных судна або судна, якое будуецца, то закладатрымальнік мае права прымусова рэалізаваць закладзеныя судна або судна, якое будуецца, нават калі тэрмін выканання абавязацельства не надышоў.

**Артыкул 249. Іпатэка пры пераходзе права ўласнасці на судна або судна, якое будуецца**

Іпатэка судна або судна, якое будуецца, захоўвае сваю сілу ў выпадку добраахвотнага змянення права ўласнасці на судна або судна, якое будуецца, незалежна ад таго, ці прыняў пакупнік або іншы набывальнік на сябе выкананне абавязацельства, забяспечанага іпатэкай.

У выпадку добраахвотнага пераходу права ўласнасці на судна або судна, якое будуецца, да замежнай юрыдычнай або фізічнай асобы іпатэка судна або судна, якое будуецца, не можа быць выключана з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі без пісьмовай згоды ўсіх закладатрымальнікаў зарэгістраваных іпатэк.

**Артыкул 250. Падстава прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца**

Пры невыкананні заклададаўцам забяспечанага іпатэкай абавязацельства па выплаце доўгу судна або судна, якое будуецца, могуць быць прададзены паводле рашэння суда па месцы знаходжання арыштаваных судна або судна, якое будуецца.

**Артыкул 251. Давядзенне да ўсеагульнага ведама рашэння суда аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца**

Рашэнне суда аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца, публікуецца ў адной з рэспубліканскіх газет на працягу трох дзён запар.

Публікацыя павінна ўтрымліваць:

1) найменне суда, які вынес рашэнне, дату яго прыняцця;

2) прычыны і падставы продажу;

3) спосаб, месца і час продажу;

4) інфармацыю аб судне або судне, якое будуецца;

5) прапановы крэдыторам заявіць аб сваіх патрабаваннях у дачыненні да судна або судна, якое будуецца, суду на працягу шасцідзесяці дзён з дня публікацыі;

6) іншую істотную інфармацыю.

**Артыкул 252. Паведамленне аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца**

Суд павінен не менш чым за трыццаць дзён да продажу судна або судна, якое будуецца, накіраваць паведамленне аб часе і месцы продажу судна або судна, якое будуецца, з паведамленнем аб уручэнні:

органу, які зарэгістраваў судна або права ўласнасці на судна, якое будуецца;

усім закладатрымальнікам зарэгістраваных іпатэк.

Асоба, якая прад’явіла патрабаванне аб прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца, павінна прадставіць суду выпіску з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі з прыкладаннем спіса закладатрымальнікаў зарэгістраваных іпатэк і іх адрасоў.

**Артыкул 253. Наступствы прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца**

У выпадку прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца, усе іпатэкі, за выключэннем тых, якія прыняты на сябе пакупніком судна або судна, якое будуецца, а таксама іншыя абцяжарванні любога роду спыняюць сваё дзеянне ў дачыненні да судна або судна, якое будуецца.

Па просьбе пакупніка судна або судна, якое будуецца, суд выдае яму дакумент, які сведчыць, што прададзеныя судна або судна, якое будуецца, не абцяжараны іпатэкамі, за выключэннем тых, выкананне абавязацельстваў па якіх прыняў на сябе пакупнік.

Пры прадстаўленні дакумента, указанага ў частцы другой гэтага артыкула, орган, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў і права ўласнасці на судны, якія будуюцца,

абавязаны выключыць з Дзяржаўнага рэестра марскіх судоў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі ўсе зарэгістраваныя на гэтыя судна або судна, якое будуецца, іпатэкі, за выключэннем тых, выкананне абавязацельстваў па якіх прыняў на сябе пакупнік.

Калі пакупніком судна або судна, якое будуецца, з'яўляецца юрыдычная або фізічная асоба Рэспублікі Беларусь ці асоба без грамадзянства, якая пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, то судна або права ўласнасці на судна, якое будуецца, павінны быць зарэгістраваны на імя такога пакупніка. Калі пакупніком з'яўляецца замежная юрыдычная або фізічная асоба, орган, што ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў і права ўласнасці на судны, якія будуюцца, абавязаны выдаць такому пакупніку пасведчанне аб выключэнні гэтага судна з Дзяржаўнага рэестра марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі з мэтай рэгістрацыі яго ў рэестры суднаў замежнай дзяржавы.

**Артыкул 254. Першачарговая аплата выдаткаў з выручкі ад прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца**

Выдаткі, прычыненыя арыштам або затрыманнем судна або судна, якое будуецца, і наступным іх продажам, уключаючы выдаткі па ўтрыманні судна з моманту яго арышту або затрымання, рэпатрыяцыі экіпажа судна і размеркаванні выручкі ад продажу, аплачваюцца з выручкі ад іх продажу ў першую чаргу.

**Артыкул 255. Спыненне іпатэкі судна або судна, якое будуецца**

Іпатэка судна або судна, якое будуецца, спыняецца:

1) са спыненнем забяспечанага іпатэкай абавязацельства;

2) пры прымусовым продажы судна або судна, якое будуецца, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай першай артыкула 253 гэтага Кодэкса;

3) у выпадках гібелі судна або судна, якое будуецца, за выключэннем выпадкаў, калі закладатрымальнік іпатэкі судна або судна, якое будуецца, можа ажыццявіць сваё патрабаванне ў дачыненні да страхавога пакрыцця, належнага ў сувязі з гібеллю судна або судна, якое будуецца, у адпаведнасці з дагаворам марскога страхавання;

4) пры наяўнасці пагаднення заклададаўцы і закладатрымальніка.

Закладатрымальнік па патрабаванні заклададаўцы абавязаны выдаць яму належным чынам засведчаны дакумент, які пацвярджае поўнае або частковае выкананне абавязацельстваў.

Орган, які зарэгістраваў іпатэку, пры прадстаўленні доказаў аб спыненні яе ў выпадках, указаных у частцы першай гэтага артыкула, уносіць у Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу запіс аб спыненні іпатэкі.

## РАЗДЗЕЛ XII
## АГУЛЬНАЯ І ПРЫВАТНАЯ АВАРЫІ. МАРСКІЯ ПРАТЭСТЫ

### ГЛАВА 22
### АГУЛЬНАЯ АВАРЫЯ

**Артыкул 256. Паняцце агульнай аварыі**

Агульнай аварыяй прызнаюцца страты, панесеныя з прычыны зробленых наўмысна і разумна надзвычайных выдаткаў або ахвяраванняў дзеля агульнай бяспекі, з мэтай захавання судна, фрахту і грузу, які перавозіцца на судне, ад агульнай для іх небяспекі.

Агульнай аварыяй прызнаюцца толькі такія страты, якія з'яўляюцца прамым вынікам дзеянняў, указаных у частцы першай гэтага артыкула.

**Артыкул 257. Прынцыпы размеркавання агульнай аварыі**

Агульная аварыя размяркоўваецца паміж суднам, грузам і фрахтам суразмерна з іх коштам, які вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі, што ўтрымліваюцца ў артыкуле 275 гэтага Кодэкса.

Права на пакрыццё страт у парадку размеркавання агульнай аварыі захоўваецца, калі небяспека, якая выклікала надзвычайныя выдаткі або ахвяраванні, узнікла па віне аднаго з бакоў дагавора марской перавозкі або трэцяй асобы. Такое размеркаванне не пазбаўляе ўдзельнікаў агульнай аварыі права на спагнанне з адпаведнай асобы панесеных страт.

**Артыкул 258. Прымяненне правіл аб агульнай аварыі**

Пагадненнем бакоў могуць быць устаноўлены іншыя правілы аб агульнай аварыі, за выключэннем правіл, якія ўтрымліваюцца ў артыкулах 256, 276–280 гэтага Кодэкса.

Пры адсутнасці ў нацыянальным заканадаўстве правіл, якія вызначаюць род аварыі, такія правілы могуць устанаўлівацца пагадненнем бакоў або міжнароднымі звычаямі гандлёвага мараплаўства.

**Артыкул 259. Агульная аварыя, выкліканая заходам судна ў месца прыстанішча**

Агульнай аварыяй прызнаюцца выдаткі на заход судна ў порт або іншае месца прыстанішча ці вяртанне яго ў порт або іншае месца пагрузкі з прычыны няшчаснага выпадку або іншых надзвычайных акалічнасцей, якія выклікалі неабходнасць такога заходу або вяртання з мэтай агульнай бяспекі.

У выпадках калі выдаткі па заходзе судна ў месца прыстанішча або па вяртанні яго ў месца пагрузкі прызнаюцца агульнай аварыяй, то агульнай аварыяй прызнаюцца таксама выдаткі, звязаныя з выхадам судна з першапачатковым грузам або часткай яго з такога месца.

Выдаткі па заработнай плаце і задавальненні патрэб экіпажа судна ў харчах і рэчах, на паліва і прадметы забеспячэння, зробленыя ў сувязі з прадаўжэннем рэйса ў выніку заходу судна ў месца прыстанішча або вяртаннем яго ў месца пагрузкі пры акалічнасцях, указаных у частках першай і другой гэтага артыкула, прызнаюцца агульнай аварыяй.

Правілы, якія ўтрымліваюцца ў частках першай, другой і трэцяй гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца да выдаткаў, выкліканых перамяшчэннем судна з месца прыстанішча, куды яно зайшло або вярнулася і дзе яго рамонт не можа быць праведзены, у іншы порт або месца, уключаючы выдаткі, выкліканыя часовым рамонтам судна, яго буксіроўкай і падаўжэннем рэйса.

**Артыкул 260. Выдаткі, звязаныя з перамяшчэннем на борце судна, выгрузкай і зваротнай пагрузкай грузу, паліва і прадметаў забеспячэння**

Агульнай аварыяй прызнаюцца выдаткі па перамяшчэнні на борце судна або выгрузцы грузу, паліва і прадметаў забеспячэння ў месцы пагрузкі, заходу або прыстанішча судна, зробленыя з мэтай агульнай бяспекі або для атрымання магчымасці ліквідацыі суднавых пашкоджанняў, выкліканых няшчасным выпадкам або іншымі надзвычайнымі акалічнасцямі, калі гэтыя выпраўленні былі неабходны для бяспечнага працягу рэйса. Выдаткі па перамяшчэнні на борце судна або выгрузцы грузу, паліва і прадметаў забеспячэння не прызнаюцца агульнай аварыяй, калі:

1) яны зроблены выключна з мэтай пераўкладкі, выкліканай ссоўваннем грузу, паліва і прадметаў забеспячэння падчас рэйса, і такая пераўкладка не з'яўлялася неабходнай дзеля агульнай бяспекі;

2) выяўленая ў месцы пагрузкі, заходу або прыстанішча неабходнасць рамонту судна была выклікана пашкоджаннямі, не звязанымі з якім-небудзь няшчасным выпадкам або іншымі надзвычайнымі акалічнасцямі, якія мелі месца падчас гэтага рэйса.

Выдаткі па зваротнай пагрузцы і ўкладцы грузу, паліва і прадметаў забеспячэння, выгружаных або перамешчаных пры акалічнасцях, указаных у частцы першай гэтага артыкула, разам з усімі выдаткамі па захоўванні, уключаючы страхаванне, таксама прызнаюцца агульнай аварыяй.

Правілы, устаноўленыя артыкулам 262 гэтага Кодэкса, прымяняюцца да выдаткаў, зробленых у сувязі з затрымкай судна, выкліканай такой зваротнай пагрузкай або ўкладкай грузу, паліва ці прадметаў забеспячэння.

**Артыкул 261. Выдаткі па часовым рамонце судна**

Выдаткі па часовым рамонце судна, праведзеным у месцы пагрузкі, заходу або прыстанішча судна з мэтай агульнай бяспекі або ліквідацыі пашкоджанняў, адносяцца да агульнай аварыі. Выдаткі на часовую ліквідацыю выпадковых пашкоджанняў, неабходную толькі для завяршэння рэйса, пакрываюцца толькі ў межах тых прадухіленых выдаткаў, якія былі б аднесены да агульнай аварыі, калі б гэта ліквідацыя не была праведзена.

**Артыкул 262. Выдаткі, выкліканыя затрымкай судна дзеля агульнай бяспекі**

Агульнай аварыяй прызнаюцца выдаткі па заработнай плаце і ўтрыманні экіпажа судна, якія ўзніклі пры затрымцы судна ў якім-небудзь порце або месцы з прычыны няшчаснага выпадку, ахвяравання або іншых надзвычайных акалічнасцей з мэтай агульнай бяспекі ці ліквідацыі пашкоджанняў, прычыненых гэтым няшчасным выпадкам, ахвяраваннем або іншымі надзвычайнымі акалічнасцямі, калі ліквідацыя пашкоджанняў неабходная для бяспечнага працягу рэйса. Выдаткі на паліва, прадметы забеспячэння і партовыя выдаткі, якія ўзніклі за час затрымкі судна, пакрываюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі, за выключэннем выдаткаў на ліквідацыю пашкоджанняў, якія не адносяцца да агульнай аварыі.

Правілы часткі першай гэтага артыкула не прымяняюцца да выдаткаў за час затрымкі судна, выкліканай ліквідацыяй пашкоджанняў, не звязаных з якім-небудзь няшчасным выпадкам або іншай надзвычайнай акалічнасцю, якія мелі месца падчас рэйса. Такія выдаткі не прызнаюцца агульнай аварыяй, нават калі рамонт быў неабходны для бяспечнага працягу рэйса.

**Артыкул 263. Наступствы прызнання судна непрыдатным да плавання і спынення рэйса**

Калі судна прызнана непрыдатным да плавання або адмовілася ад працягу рэйса, з выдаткаў па захоўванні, страхаванні, заработнай плаце экіпажа судна і задавальненні яго патрэб у харчах і рэчах, паліве, суднавым забеспячэнні і партовых выдаткаў, прадугледжаных часткай другой артыкула 260 і часткай першай артыкула 262 гэтага Кодэкса, да агульнай аварыі адносяцца толькі выдаткі, зробленыя да прызнання судна непрыдатным да плавання або да адмовы ад працягу рэйса, а калі выгрузка да гэтага часу не закончана, то да заканчэння выгрузкі грузу.

**Артыкул 264. Агульная аварыя, выкліканая выдаткамі па ратаванні**

Калі ратаванне ажыццяўлялася з мэтай, указанай у артыкуле 256 гэтага Кодэкса, выдаткі па ратаванні прызнаюцца агульнай аварыяй незалежна ад таго, ажыццяўлялася ратаванне на падставе дагавора або іншым чынам.

Выдаткі, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, уключаюць выратавальнае ўзнагароджанне, пры вызначэнні якога прымаюцца пад увагу майстэрства і намаганні выратавальнікаў па прадухіленні або змяншэнні шкоды навакольнаму асяроддзю.

Спецыяльная кампенсацыя, якую выплачвае суднаўладальнік выратавальніку ў памеры, прадугледжаным часткай чацвёртай артыкула 298 гэтага Кодэкса, не прызнаецца агульнай аварыяй.

**Артыкул 265. Агульная аварыя, выклiканая ажыццяўленнем мер па ратаванні**

Агульнай аварыяй пры наяўнасці прыкмет, указаных у артыкуле 256 гэтага Кодэкса, прызнаюцца:

1) страты, выклiканыя выкiданнем за борт судна грузу, а таксама страты, прычыненыя судну і грузу ў выніку ахвяравання з мэтай агульнай бяспекі, у прыватнасці ў выніку пранікнення вады ў трум праз адкрытыя для выкідвання грузу люкі або іншыя зробленыя для гэтага адтуліны;

2) страты, прычыненыя судну або грузу пры тушэнні пажару на судне, уключаючы страты ад ажыццёўленага для гэтай мэты выкідвання судна на бераг ці затаплення судна, якое гарыць;

3) страты, прычыненыя судну або грузу наўмыснай пасадкай судна на мель незалежна ад таго, ці магло судна быць само вынесена на мель;

4) страты ад пашкоджання рухавікоў, іншых машын або катлоў судна, якое знаходзіцца на мелі, прычыненыя стараннямі зняць судна з мелі;

5) надзвычайныя выдаткі па аблягчэнні судна, якое знаходзіцца на мелі, шляхам перагрузкі грузу, паліва або прадметаў забеспячэння з судна ў ліхтары, па найме ліхтараў і па зваротнай іх загрузцы на судна, а таксама іншыя панесеныя ў выніку гэтага страты.

**Артыкул 266. Страты ад пашкоджання або гібелі грузу, паліва і прадметаў забеспячэння**

Страты ад пашкоджання або гібелі грузу, паліва і прадметаў забеспячэння, прычыненыя перамяшчэннем іх на судне, выгрузкай з судна, зваротнай пагрузкай і ўкладкай, а таксама захоўваннем, прызнаюцца агульнай аварыяй у тых выпадках, калі самі выдаткі па ажыццяўленні гэтых аперацый з’яўляюцца агульнай аварыяй.

**Артыкул 267. Урон ад страты фрахту**

Страта фрахту, выклiканая ўтратай грузу, прызнаецца агульнай аварыяй у тых выпадках, калі ўтрата грузу пакрываецца ў парадку размеркавання агульнай аварыі. Пры гэтым з фрахту выключаюцца выдаткі, якія былі б з мэтай яго атрымання зроблены суднаўладальнікам, але ў выніку ахвяравання зроблены не былі.

**Артыкул 268. Замяняльныя выдаткі**

Агульнай аварыяй прызнаюцца ўсе надзвычайныя выдаткі, праведзеныя замест іншых выдаткаў, якія былі б аднесены да агульнай аварыі (замяняльныя выдаткі). Замяняльныя выдаткі пакрываюцца толькі ў межах прадухіленых выдаткаў незалежна ад эканоміі, атрыманай кім-небудзь з удзельнікаў агульнай аварыі ў выніку такіх замяняльных выдаткаў.

**Артыкул 269. Страты ад пашкоджання судна, яго машын або прыналежнасцей**

Страты, якія складаюць агульную аварыю ад пашкоджання судна, яго машын або прыналежнасцей вызначаюцца зыходзячы з кошту рамонту, выпраўлення ці замены таго, што пашкоджана або страчана. Пры гэтым робяцца скідкі па правілах, прадугледжаных артыкулам 270 гэтага Кодэкса.

Калі рамонт судна не праводзіўся, страты ад яго пашкоджання вызначаюцца ў суме, на якую кошт судна зменшыўся ў выніку пашкоджання, але не больш за кошт рамонту згодна з каштарысам.

**Артыкул 270. Скідкі «за новае замест старога»**

Калі пры рамонце судна, узрост якога дасягае пятнаццаці гадоў, старыя матэрыялы або часткі судна замяняюцца новымі, то кошт рамонту, што адносіцца на агульную аварыю ў адпаведнасці з артыкулам 269 гэтага Кодэкса, змяншаецца на адну трэць, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткамі другой, трэцяй і чацвёртай гэтага артыкула.

Скідкі «за новае замест старога» не робяцца з кошту часовага рамонту суднаў, якія прызнаецца агульнай аварыяй у адпаведнасці з артыкулам 261 гэтага Кодэкса, а таксама з кошту харчавання, прадметаў забеспячэння, якараў і якарных ланцугоў.

Выдаткі па сухім доку, стапелях і перамяшчэнні судна, якія выклікаюцца неабходнасцю рамонту судна, поўнасцю адносяцца да агульнай аварыі.

Выдаткі па ачыстцы, афарбоўцы і пакрыцці корпуса судна пры яго рамонце прызнаюцца агульнай аварыяй у памеры пяцідзесяці працэнтаў пры ўмове, што папярэдняя афарбоўка або пакрыццё корпуса мелі месца ў апошнія дванаццаць месяцаў да акта агульнай аварыі.

Для прымянення скідак «за новае замест старога» ўзрост судна вылічваецца з 31 снежня года заканчэння яго будаўніцтва. У дачыненні да ізаляцыі, выратавальных і іншых шлюпак, сродкаў сувязі, навігацыйных прыбораў і абсталявання машын і катлоў улічваецца іх сапраўдны ўзрост.

**Артыкул 271. Страты ад гібелі судна**

У выпадку гібелі або поўнай канструктыўнай гібелі судна страты, якія адносяцца да агульнай аварыі, складаюць розніцу паміж ацэначным коштам судна ў непашкоджаным стане за вылікам з яго каштарыснага кошту ліквідацыі пашкоджанняў, што не адносяцца да агульнай аварыі, і чыстай выручкай, якую можна было б атрымаць ад продажу таго, што засталося ад судна.

**Артыкул 272. Страты ад гібелі або пашкоджання грузу**

Страты ад гібелі або пашкоджання грузу, аднесеныя да агульнай аварыі, вызначаюцца ў адпаведнасці з яго коштам на момант выгрузкі, што ўстанаўліваецца на падставе гандлёвага рахунка, выстаўленага атрымальніку, а пры адсутнасці рахунка – на падставе кошту грузу на момант выгрузкі. Кошт грузу на момант выгрузкі ўключае выдаткі на страхаванне і фрахт, за выключэннем выпадкаў, калі фрахт не знаходзіцца на рызыцы грузаўладальніка.

У выпадку продажу пашкоджанага грузу страты, аднесеныя да агульнай аварыі, складаюць розніцу паміж коштам грузу ў непашкоджаным стане, што вызначаецца ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула, і чыстай выручкай ад яго продажу.

Страты ад пашкоджання або гібелі прадметаў, пагружаных на судна без ведама суднаўладальніка або яго марскіх агентаў, а таксама ад пашкоджання і гібелі грузаў, якія наўмысна здадзены для перавозкі пад няправільным найменнем, не прызнаюцца агульнай аварыяй. Калі такая маёмасць была выратавана, яе ўладальнікі абавязаны ўдзельнічаць на агульнай падставе ва ўзносах па агульнай аварыі.

Уладальнікі грузаў, кошт якіх пры здачы для перавозкі быў аб’яўлены ніжэйшым за іх сапраўдны кошт, удзельнічаюць ва ўзносах па агульнай аварыі ў адпаведнасці з сапраўдным коштам грузаў, але атрымліваюць пакрыццё страт толькі ў адпаведнасці з іх аб’яўленым коштам.

### Артыкул 273. Прадастаўленне сродкаў на выдаткі, якія пакрываюцца ў якасці агульнай аварыі

На суму выдаткаў, якія пакрываюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі, за выключэннем заработнай платы і задавальнення патрэб членаў экіпажа судна ў харчах і рэчах, кошту паліва і прадметаў забеспячэння, што не замяняюцца падчас рэйсу, налічваецца камісія ў памеры двух працэнтаў, якая таксама адносіцца да агульнай аварыі.

Да агульнай аварыі адносяцца выдаткі, зробленыя з мэтай атрымання сродкаў, неабходных на агульнааварыйныя выдаткі, шляхам іпатэкі судна, продажу грузаў або страхавання крэдыту.

### Артыкул 274. Працэнты на страты, якія пакрываюцца ў якасці агульнай аварыі

На суму выдаткаў і іншыя выдаткі, якія пакрываюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі, налічваюцца сем працэнтаў гадавых з моманту, калі гэтыя выдаткі былі праведзены, да заканчэння складання дыспашы. Калі ў парадку пакрыцця выдаткаў па агульнай аварыі былі праведзены якія-небудзь выплаты раней за заканчэнне складання дыспашы, працэнты на заплачаныя сумы налічваюцца па дзень іх выплаты.

### Артыкул 275. Кантрыбуцыйны кошт

Кошт маёмасці (судна, грузу і фрахту), адпаведна якому ўстанаўліваюцца ўзносы на пакрыццё страт, што кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі (кантрыбуцыйны кошт), вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі гэтага артыкула на аснове сапраўднага кошту ўказанай маёмасці пасля заканчэння рэйса. Да такога кошту дадаецца сума, якая пакрываецца ў якасці агульнай аварыі за ахвяраваную маёмасць, калі толькі гэта сума ў яе ўжо не ўключана.

Пры вызначэнні кантрыбуцыйнага кошту маёмасці вылічваюцца ўсе дадатковыя выдаткі, зробленыя ў дачыненні да гэтай маёмасці пасля акта агульнай аварыі, за выключэннем такіх выдаткаў, якія прызнаюцца агульнай аварыяй або адносяцца на судна на падставе рашэння аб выплаце спецыяльнай кампенсацыі ў адпаведнасці з артыкулам 298 гэтага Кодэкса.

Кантрыбуцыйны кошт грузу вызначаецца яго коштам на момант выгрузкі, які ўстанаўліваецца на падставе гандлёвага рахунка, выстаўленага атрымальніку, а пры адсутнасці рахунка – на падставе кошту грузу на момант адгрузкі. Кошт грузу ўключае выдаткі на страхаванне і фрахт, за выключэннем выпадкаў, калі фрахт не знаходзіцца на рызыцы грузаўладальніка.

З кошту грузу вылічаюцца сумы ўсіх страт ад гібелі або пашкоджання грузу да або падчас яго выгрузкі.

Кантрыбуцыйны кошт грузу, прададзенага недалёка ад месца прызначэння, вызначаецца сумай чыстай выручкі ад продажу з дадаваннем да яе сумы, якая кампенсуецца ў якасці агульнай аварыі.

Кантрыбуцыйны кошт судна вызначаецца без уліку тых акалічнасцей, што судна на момант акта агульнай аварыі эксплуатавалася на падставе бербоўт-чартару або тайм-чартару.

Пры вызначэнні кантрыбуцыйнага кошту маёмасці з сум фрахту і платы за праезд пасажыраў, што знаходзіліся на рызыцы суднаўладальніка, вылічаюцца зробленыя з мэтай атрымання гэтых сум выдаткі, у тым ліку на заработную плату экіпажа судна, якія не прыйшлося б несці, калі б судна і груз загінулі пры акалічнасцях, што выклікалі агульную аварыю, і не могуць быць аднесены да агульнай аварыі.

Багаж пасажыраў і іншыя асабістыя рэчы, якія не перавозіліся па канасаменце, не прымаюцца пад увагу пры вызначэнні кантрыбуцыйнага кошту маёмасці і ўзносаў на пакрыццё страт, што кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі.

**Артыкул 276. Дыспаша і дыспашэры**

По заяве зацікаўленых асоб наяўнасць агульнай аварыі ўстанаўліваецца і разлік па яе размеркаванні (дыспаша) складаецца асобамі, якія валодаюць ведамі і вопытам у галіне марскога права (дыспашэрамі).

**Артыкул 277. Доказы і матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша**

Бок, які патрабуе размеркавання агульнай аварыі, абавязаны даказаць, што заяўленыя страты сапраўды павінны быць прызнаны агульнай аварыяй.

Асоба, інтарэсы якой могуць быць закрануты складаннем дыспашы, падае дыспашэру заяву ў пісьмовай форме аб стратах або выдатках, пакрыцця якіх яна патрабуе, на працягу дванаццаці месяцаў з дня заканчэння рэйса.

У выпадку, калі такая заява не пададзена або на працягу дванаццаці месяцаў пасля запыту аб такой заяве асоба не прадставіць доказы з мэтай абгрунтавання заяўленага патрабавання або даныя аб кошце маёмасці, дыспашэр мае права складаць дыспашу на аснове наяўнай у яго інфармацыі; пры гэтым дыспаша можа аспрэчвацца толькі на той падставе, што яна з’яўляецца яўна няправільнай.

Пры ўзнікненні падчас складання дыспашы пытанняў, якія патрабуюць для іх вырашэння спецыяльных ведаў у галіне суднаваджэння, суднабудавання, рамонту суднаў і іншых галінах, дыспашэр мае права даручыць падрыхтаваць адпаведнае заключэнне назначанаму ім эксперту. У частцы ацэнкі кошту суднаў і грузаў дыспашэр мае права заказаць незалежную ацэнку выканаўцу ацэнкі, які мае права на правядзенне ацэнкі адпаведнага віду аб’екта ацэнкі. Такія заключэнні прымаюцца дыспашэрам нараўне з іншымі доказамі.

Матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша, павінны быць адкрыты для азнаямлення, і дыспашэр па патрабаванні зацікаўленых асоб абавязаны за іх кошт выдаваць ім засведчаныя копіі гэтых матэрыялаў.

**Артыкул 278. Плата за складанне дыспашы**

За складанне дыспашы спаганяецца плата, якая ўключаецца ў дыспашу і размяркоўваецца паміж усімі зацікаўленымі асобамі прапарцыянальна долям удзелу ў агульнай аварыі.

**Артыкул 279. Выпраўленне і аспрэчванне дыспашы**

Памылкі ў разліках, выяўленыя ў дыспашы, могуць быць выпраўлены дыспашэрам па сваёй ініцыятыве або па заяве асоб, паміж якімі размеркавана агульная аварыя, шляхам складання дадатку да дыспашы (адэндума), які з’яўляецца яе састаўной часткай.

Асобы, паміж якімі размеркавана агульная аварыя, могуць аспрэчыць дыспашу ў абласных і Мінскім гарадскім судах на працягу шасці месяцаў з дня атрымання дыспашы або адэндума да яе з абавязковым паведамленнем аб гэтым дыспашэру шляхам накіравання яму копіі іскавай заявы.

Дыспашэр мае права, а па патрабаванні суда абавязаны прыняць удзел у разглядзе спрэчкі паводле дыспашы і даць тлумачэнні па сутнасці справы.

Суд, які разглядае спрэчку паводле дыспашы, можа пакінуць дыспашу ў сіле, унесці ў яе змяненні або адмяніць яе і даручыць дыспашэру скласці новую дыспашу ў адпаведнасці з рашэннем суда.

**Артыкул 280. Выкананне дыспашы**

Калі дыспаша не аспрэчана ў тэрмін, прадугледжаны часткай другой артыкула 279 гэтага Кодэкса, або аспрэчана, але пакінута судом у сіле, спагнанне па ёй можа быць праведзена шляхам ажыццяўлення выканаўчага надпісу натарыусамі, дыпламатычнымі агентамі дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь і консульскімі службовымі асобамі консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь. Для гэтага натарыусу, дыпламатычнаму агенту дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобе консульскай установы Рэспублікі Беларусь павінны быць прад'яўлены дыспаша і даведкі дыспашэра аб тым, што дыспаша не адменена і не зменена судом.

Спагнанне паводле дыспашы, зменена судом, праводзіцца ў парадку, устаноўленым грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам.

## ГЛАВА 23
## ПРЫВАТНАЯ АВАРЫЯ

**Артыкул 281. Паняцце прыватнай аварыі**

Страты, якія не падпадаюць пад прыкметы агульнай аварыі, устаноўленыя артыкулам 256 гэтага Кодэкса, прызнаюцца прыватнай аварыяй.

Прыватнай аварыяй, нягледзячы на наяўнасць прыкмет, указаных у артыкуле 256 гэтага Кодэкса, прызнаюцца:

1) кошт выкінутага за борт грузу, які перавозіўся на судне не ў адпаведнасці з правіламі і звычаямі гандлёвага мараплаўства;

2) страты, прычыненыя абсяканнем абломкаў або частак судна, раней знесеных ці фактычна страчаных у выніку марской небяспекі;

3) страты, прычыненыя фарсіраваннем работы або іншай работай рухавікоў, іншых машын ці катлоў судна, якое знаходзілася на плаву;

4) урон або страты, панесеныя суднам ці грузам у выніку павелічэння працягласці рэйса (страты ад прастою, змянення цэн і да т.п.);

5) страты, прычыненыя ў сувязі з тушэннем пажару на судне, у выніку ўздзеяння дыму або награвання.

**Артыкул 282. Адказнасць па прыватнай аварыі**

Прыватная аварыя не падлягае размеркаванню паміж суднам, грузам і фрахтам. Адказнасць па такіх стратах нясе той, хто іх пацярпеў, або той, на каго ўскладаецца адказнасць за іх прычыненне.

## ГЛАВА 24
## МАРСКІЯ ПРАТЭСТЫ

**Артыкул 283. Заява аб марскім пратэсце**

Калі падчас плавання або стаянкі судна меў месца выпадак, які можа з'явіцца падставай для прад'яўлення да суднаўладальніка маёмасных патрабаванняў, капітан судна з мэтай забеспячэння доказаў павінен зрабіць ва ўстаноўленым парадку заяву аб марскім пратэсце.

Заява аб марскім пратэсце павінна ўтрымліваць апісанне акалічнасцей здарэння і прычын, якія выклікалі яго, у тым ліку інфармацыю аб уроне і мерах, прынятых для яго прадухілення або змяншэння.

**Артыкул 284. Органы, якім робіцца заява аб марскім пратэсце**

Заява аб марскім пратэсце робіцца:

консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку);

кампетэнтнай службовай асобе замежнай дзяржавы ў парадку, устаноўленым заканадаўствам гэтай дзяржавы.

**Артыкул 285. Тэрмін для заявы аб марскім пратэсце**

Заява аб марскім пратэсце робіцца, калі здарэнне адбылося:

у порце, – на працягу 24 гадзін з моманту здарэння;

падчас плавання, – на працягу 24 гадзін з моманту прыбыцця судна або капітана судна ў першы порт пасля здарэння.

**Артыкул 286. Заява аб марскім пратэсце з затрымкай**

Калі здарэнне адбылося падчас плавання, заява аб марскім пратэсце можа быць зроблена ў момант прыбыцця судна або капітана судна ў порт, які не з'яўляецца першым портам пасля здарэння, з тым, каб пазбегнуць значных страт часу і выдаткаў, звязаных з заходам судна ў першы порт пасля здарэння.

Калі акажацца немагчымым заявіць марскі пратэст у тэрміны, устаноўленыя артыкулам 285 гэтага Кодэкса, прычыны гэтага павінны быць указаны ў заяве аб марскім пратэсце.

**Артыкул 287. Асаблівасці заявы аб марскім пратэсце пры прычыненні шкоды грузу**

Пры наяўнасці падстаў меркаваць, што здарэнне, якое мела месца, прычыніла шкоду грузу, што знаходзіўся на судне, заява аб марскім пратэсце павінна быць зроблена да адкрыцця люкаў. Выгрузка грузу да заявы марскога пратэсту можа быць пачата толькі ў выпадку крайняй неабходнасці.

**Артыкул 288. Доказы**

У пацвярджэнне акалічнасцей, выкладзеных у заяве аб марскім пратэсце, капітан судна адначасова з заявай аб марскім пратэсце або ў тэрмін не большы за сем дзён з моманту свайго прыбыцця ці прыбыцця судна ў порт або з моманту здарэння, калі яно мела месца ў порце, абавязаны прадставіць консулу Рэспублікі Беларусь (дыпламатычнаму прадстаўніку) ці кампетэнтнай службовай асобе замежнай дзяржавы для азнаямлення суднавы журнал і завераную капітанам судна выпіску з суднавага журнала.

У выпадку гібелі суднавага журнала ў заяве аб марскім пратэсце павінны быць выкладзены акалічнасці і прычыны гібелі суднавага журнала.

**Артыкул 289. Складанне акта аб марскім пратэсце**

Консул Рэспублікі Беларусь (дыпламатычны прадстаўнік) або кампетэнтная службовая асоба замежнай дзяржавы па просьбе капітана судна складае акт аб марскім пратэсце. Акт аб марскім пратэсце завяраецца подпісам і гербавай пячаццю.

Акт аб марскім пратэсце складаецца на падставе заявы капітана судна, даных суднавага журнала, апытання капітана судна і па магчымасці не менш за двух сведак з асоб каманднага складу экіпажа судна, двух сведак з суднавай каманды.

## РАЗДЗЕЛ XIII
## БЯСПЕКА ПЛАВАННЯ СУДНАЎ. РАТАВАННЕ НА МОРЫ

## ГЛАВА 25
## БЯСПЕКА ПЛАВАННЯ СУДНАЎ

### Артыкул 290. Бяспека плавання суднаў

Бяспека плавання суднаў забяспечваецца суднаўладальнікам. Патрабаванні бяспекі плавання суднаў на падставе нормаў міжнароднага марскога права ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Патрабаванні бяспекі плавання суднаў, якім павінны адпавядаць судны ўнутранага плавання Рэспублікі Беларусь, што выходзяць у мора, а таксама межы раёнаў марскога плавання гэтых суднаў устанаўлівае класіфікацыйнае таварыства.

## ГЛАВА 26
## РАТАВАННЕ СУДНАЎ І ІНШАЙ МАЁМАСЦІ

### Артыкул 291. Сфера прымянення правіл гэтай главы

Правілы гэтай главы прымяняюцца да любых выратавальных аперацый, калі дагаворам аб ратаванні не прадугледжана іншае.

Правілы гэтай главы не распаўсюджваюцца на:

стацыянарныя ці плывучыя платформы або марскія рухомыя буравыя ўстаноўкі, калі такія платформы або ўстаноўкі ажыццяўляюць у месцах іх размяшчэння разведку, распрацоўку або здабычу мінеральных рэсурсаў марскога дна;

марскую маёмасць культурнага характару, якая мае дагістарычнае, археалагічнае або гістарычнае значэнне, калі яна знаходзіцца на марскім дне.

Бакі не маюць права дагаворам выключаць прымяненне артыкула 293 гэтага Кодэкса, а таксама адступаць ад абавязкаў па прадухіленні або змяншэнні шкоды навакольнаму асяроддзю, установленых артыкуламі 294 і 295 гэтага Кодэкса.

Правілы гэтай главы прымяняюцца да суднаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці або эксплуатуюцца Рэспублікай Беларусь і выкарыстоўваюцца падчас правядзення выратавальнай аперацыі выключна для дзяржаўных некамерцыйных мэт.

### Артыкул 292. Дагаворы аб ратаванні

Капітан судна мае права заключаць дагаворы аб ратаванні ад імені суднаўладальніка. Капітан судна або суднаўладальнік маюць права заключаць дагаворы аб ратаванні ад імені ўласніка маёмасці, якая знаходзіцца на борце судна.

### Артыкул 293. Неправадзейнасць і змяненне дагавораў аб ратаванні

Дагавор аб ратаванні або любыя яго ўмовы могуць быць прызнаны неправадзейнымі ці зменены, калі:

дагавор заключаны ў выніку неапраўданага ўздзеяння або пад уплывам небяспекі і яго ўмовы з’яўляюцца неправадзейнымі;

плата, прадугледжаная дагаворам, празмерна завышана або заніжана па дачыненні да фактычна аказаных паслуг.

### Артыкул 294. Абавязкі выратавальніка пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі

Выратавальнік абавязаны:

1) ажыццяўляць выратавальныя аперацыі з належным клопатам;

2) праяўляць належны клопат аб прадухіленні або змяншэнні шкоды навакольнаму асяроддзю пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі;

3) звяртацца па дапамогу да іншых выратавальнікаў, калі гэтага патрабуюць акалічнасці;

4) пагаджацца на ўдзел іншых выратавальнікаў, калі гэтага патрабуюць суднаўладальнік, капітан судна або ўласнік іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў небяспецы, пры ўмове, што ў выпадку прызнання ўказанага патрабавання неразумным, гэта не паўплывае на памер яго ўзнагароджання.

**Артыкул 295. Абавязкі суднаўладальніка, капітана судна або ўласніка іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў небяспецы**

Суднаўладальнік, капітан судна або ўласнік іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў небяспецы, абавязаны:

1) у поўнай меры супрацоўнічаць з выратавальнікам у ходзе выратавальных аперацый;

2) праяўляць належны клопат аб прадухіленні або змяншэнні шкоды навакольнаму асяроддзю;

3) па разумным патрабаванні выратавальніка прыняць судна або іншую маёмасць пасля яе дастаўкі ў бяспечнае месца.

**Артыкул 296. Умовы ўзнагароджання**

Выратавальныя аперацыі, якія мелі паспяховы або хоць бы часткова паспяховы вынік, даюць права на ўзнагароджанне.

Узнагароджанне не прадугледжана, калі выратавальная аперацыя не мела паспяховага або хоць бы часткова паспяховага выніку, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 300 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 297. Крытэрыі ўстанаўлення ўзнагароджання**

Узнагароджанне ўстанаўліваецца з мэтай заахвочвання выратавальных аперацый з улікам наступных крытэрыяў незалежна ад паслядоўнасці, у якой яны ўказаны:

1) выратаваны кошт судна і іншай маёмасці;

2) майстэрства і намаганні выратавальнікаў у прадухіленні або змяншэнні шкоды навакольнаму асяроддзю;

3) ступень поспеху, дасягнутага выратавальнікам;

4) характар і ступень небяспекі;

5) майстэрства і намаганні выратавальнікаў у ратаванні судна, іншай маёмасці і людзей;

6) затрачаны выратавальнікамі час і панесеныя выдаткі і страты;

7) рызыка адказнасці і іншыя рызыкі, якім падвергліся выратавальнікі і іх абсталяванне;

8) хуткасць аказання паслуг;

9) наяўнасць і выкарыстанне суднаў або іншага абсталявання, прызначанага для выратавальных аперацый;

10) стан гатоўнасці і эфектыўнасць абсталявання выратавальнікаў і яго кошт.

Узнагароджанне, прадугледжанае часткай першай гэтага артыкула, выплачваецца ўсімі асобамі, зацікаўленымі ў судне і іншай маёмасці, прапарцыянальна іх адпаведнай выратаванай вартасці.

Узнагароджанне, за выключэннем любых працэнтаў і пакрываемых судовых і арбітражных выдаткаў, не павінна перавышаць выратаванага кошту судна і іншай маёмасці.

**Артыкул 298. Спецыяльная кампенсацыя**

Калі выратавальнік, ажыццяўляючы выратавальныя аперацыі ў дачыненні да судна або грузу, якія ствaралі пагрозу прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю, не атрымаў права на ўзнагароджанне ў памеры не менш за спецыяльную кампенсацыю, то ён мае права на атрыманне ад суднаўладальніка спецыяльнай кампенсацыі, роўнай яго выдаткам, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага артыкула.

Калі пры акалічнасцях, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, выратавальнік у выніку праведзеных ім выратавальных аперацый прадухіліў або зменшыў шкоду навакольнаму асяроддзю, спецыяльная кампенсацыя, якая выплачваецца суднаўладальнікам выратавальніку ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула, можа быць павялічана максімальна на трыццаць працэнтаў панесеных выратавальнікам выдаткаў. Суд або арбітраж, калі палічаць гэта справядлівым і разумным, могуць з улікам крытэрыяў, прадугледжаных часткай першай артыкула 297 гэтага Кодэкса, павялічыць спецыяльную кампенсацыю. Пры гэтым агульнае павелічэнне не можа перавышаць ста працэнтаў панесеных выратавальнікам выдаткаў.

Выдаткі выратавальніка для мэт частак першай і другой гэтага артыкула азначаюць фактычныя выдаткі, разумна панесеныя выратавальнікам пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі, і справядлівую плату за абсталяванне і персанал, фактычна і разумна выкарыстаныя ў ходзе выратавальнай аперацыі, прымаючы пад увагу крытэрыі, прадугледжаныя пунктамі 8, 9 і 10 часткі першай артыкула 297 гэтага Кодэкса.

Агульная спецыяльная кампенсацыя ў адпаведнасці з гэтым артыкулам выплачваецца толькі ў выпадку і памеры, калі такая кампенсацыя перавышае любое ўзнагароджанне, якое можа быць атрымана выратавальнікам у адпаведнасці з артыкулам 297 гэтага Кодэкса.

Калі выратавальнік праявіў нядбайнасць і ў выніку гэтага не змог прадухіліць або зменшыць шкоду навакольнаму асяроддзю, ён можа быць поўнасцю або часткова пазбаўлены спецыяльнай кампенсацыі, якая прадугледжана ў адпаведнасці з гэтым артыкулам.

Ніякія палажэнні, што ўтрымліваюцца ў гэтым артыкуле, не закранаюць правы суднаўладальніка на рэгрэс.

### Артыкул 299. Размеркаванне ўзнагароджання паміж выратавальнікамі

Узнагароджанне размяркоўваецца паміж выратавальнікамі ў адпаведнасці з крытэрыямі, устаноўленымі артыкулам 297 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 300. Размеркаванне ўзнагароджання паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна

Размеркаванне любога ўзнагароджання, атрыманага за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі, паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна праводзіцца пасля выліку выдаткаў і страт, панесеных суднаўладальнікам і экіпажам судна ў сувязі з ажыццяўленнем выратавальнай аперацыі, наступным чынам:

тры пятыя нета-ўзнагароджання належаць суднаўладальніку, астатняя частка размяркоўваецца паміж капітанам судна і іншымі членамі экіпажа судна ў суадносінах адна трэць да дзвюх трацей;

частка ўзнагароджання, належная членам экіпажа судна, за выключэннем капітана судна, размяркоўваецца паміж імі з улікам намаганняў, прыкладзеных пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі, і заработнай платы кожнага.

Выключэнні з палажэнняў аб размеркаванні ўзнагароджання, належнага членам экіпажа судна, могуць быць дапушчаны толькі пры наяўнасці асобых акалічнасцей.

Дзеянне часткі першай гэтага артыкула не распаўсюджваецца на размеркаванне ўзнагароджання, атрыманага за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі суднамі:

якія ажыццяўляюць выратавальныя аперацыі на прафесійнай аснове;

якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці або эксплуатуюцца Рэспублікай Беларусь і выкарыстоўваюцца падчас правядзення выратавальнай аперацыі выключна для дзяржаўных некамерцыйных мэт.

**Артыкул 301. Ратаванне людзей**

Ад выратаваных людзей не патрабуецца ніякага ўзнагароджання.

Выратавальнік людзей, які прыняў удзел у аказанні паслуг у сувязі са здарэннем, што выклікала неабходнасць ратавання, мае права на справядлівую долю ў суме, прысуджанай за выратаванне судна і іншай маёмасці або прадухіленне ці змяншэнне шкоды навакольнаму асяроддзю.

**Артыкул 302. Наступствы няправільных паводзін выратавальніка**

Выратавальнік можа быць поўнасцю або часткова пазбаўлены ўзнагароджання ці спецыяльнай кампенсацыі, належнай яму ў адпаведнасці з правіламі гэтага Кодэкса, у той меры, у якой выратавальныя аперацыі аказаліся неабходнымі або больш цяжкімі па яго віне, ці калі ён вінаваты ў падмане ці іншых несумленных паводзінах.

**Артыкул 303. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі ў выпадку прыналежнасці суднаў аднаму і таму ж уладальніку**

Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі выплачваецца таксама і ў тым выпадку, калі судна, якое ажыццявіла выратавальную аперацыю, належыць уладальніку выратаванага судна.

**Артыкул 304. Абавязак прадаставіць забеспячэнне**

Па просьбе выратавальніка асоба, адказная за выплату ўзнагароджання або спецыяльнай кампенсацыі, прадастаўляе належнае забеспячэнне выканання свайго абавязацельства ў дачыненні да выратавальніка.

Суднаўладальнік выратаванага судна прыкладае ўсе намаганні для прадастаўлення ўладальнікам выратаванага грузу да таго, як ён будзе выдадзены, належнага забеспячэння выканання іх абавязацельстваў у дачыненні да выратавальніка.

Без згоды выратавальніка выратаваныя судна і іншая маёмасць не могуць быць перамешчаны з порта або месца, куды гэта маёмасць была першапачаткова дастаўлена пасля завяршэння выратавальных аперацый, да таго часу, пакуль не будзе прадастаўлена належнае забеспячэнне выканання абавязацельстваў у дачыненні да выратавальніка.

**Артыкул 305. Выратавальныя аперацыі, якія кантралююцца дзяржаўнымі і партовымі ўладамі**

Калі выратавальныя аперацыі ажыццяўляюцца дзяржаўнымі або партовымі ўладамі або пад іх кантролем, выратавальнікі, якія ажыццяўляюць такія аперацыі, карыстаюцца правамі, прадугледжанымі гэтай главой.

Дзяржаўныя і партовыя ўлады, абавязаныя ажыццяўляць выратавальныя аперацыі, могуць карыстацца правамі, прадугледжанымі гэтай главой, калі ажыццяўленне выратавальных аперацый не з'яўлялася выкананнем імі сваіх звычайных абавязкаў.

## РАЗДЗЕЛ XIV
## ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ. ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ

### ГЛАВА 27
### ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ

**Артыкул 306. Камерцыйныя і іншыя акты**

Акалічнасці, якія могуць служыць падставай для маёмаснай адказнасці перавозчыка, адпраўшчыка, фрахтавальніка, атрымальніка і пасажыра, сведчацца камерцыйнымі актамі, актамі-паведамленнямі або актамі агульнай формы і іншымі актамі. У порце замежнай дзяржавы такія акалічнасці сведчацца ў адпаведнасці з правіламі, якія існуюць у гэтым порце.

Камерцыйны акт складаецца для сведчання:

1) неадпаведнасці паміж найменнем, масай і колькасцю месцаў грузу або багажу ў натуры і данымі, указанымі ў перавозачным дакуменце;

2) пашкоджання грузу або багажу;

3) выяўлення грузу або багажу без дакументаў ці дакументаў без грузу або багажу;

4) вяртання перавозчыку выкрадзенага або страчанага грузу ці багажу.

Формы актаў, парадак іх стварэння і парадак сведчання акалічнасцей, якія не патрабуюць складання актаў, устанаўліваюцца заканадаўствам.

**Артыкул 307. Прэтэнзіі да перавозчыка**

Фрахтавальнік, адпраўшчык і атрымальнік грузу да прад’яўлення перавозчыку іску, які ўзнікае з марской перавозкі грузу, абавязаны прад’явіць перавозчыку прэтэнзію.

Пасажыр, асоба, упаўнаважаная на атрыманне багажу, да прад’яўлення перавозчыку іску, што ўзнікае з марской перавозкі пасажыраў і багажу, мае права прад’явіць перавозчыку прэтэнзію.

Прэтэнзіі прад’яўляюцца да перавозчыка, які ажыццяўляў перавозку або абавязаны быў яе ажыццявіць у адпаведнасці з пагадненнем бакоў.

Прэтэнзіі, што вынікаюць са змешанай перавозкі грузу, прад’яўляюцца да перавозчыка, які даставіў груз у канцавы пункт перавозкі.

**Артыкул 308. Іскі па перавозках грузаў**

Іск да перавозчыка грузу можа быць прад’яўлены ў выпадку поўнай або частковай адмовы перавозчыка грузу забяспечыць прэтэнзію ці неатрымання ад перавозчыка адказу ў трыццацідзённы тэрмін.

**Артыкул 309. Права на прад’яўленне прэтэнзій і іскаў**

Права на прад’яўленне прэтэнзій і іскаў маюць:

1) у выпадку непадачы судна або падачы яго са спазненнем – адпраўшчык ці фрахтавальнік;

2) у выпадку страты грузу – яго атрымальнік або адпраўшчык пры ўмове прад’яўлення канасамента;

3) у выпадку нястачы або пашкоджання (псавання) грузу – атрымальнік ці адпраўшчык грузу пры ўмове прад’яўлення канасамента;

4) у выпадку пратэрміноўкі ў дастаўцы або затрымкі ў выдачы грузу– яго атрымальнік пры ўмове прад’яўлення канасамента;

5) у выпадку страты або пратэрміноўкі ў дастаўцы багажу, нястачы ці пашкоджання (псавання) багажу – прад’яўнік багажнай квітанцыі;

6) у выпадку перабору правазной платы – фрахтавальнік, адпраўшчык або атрымальнік грузу пры ўмове прад’яўлення канасамента.

Пры прад’яўленні прэтэнзій, што ўзнікаюць з марской перавозкі грузаў, якая ажыццяўлялася не паводле канасамента, а па іншым перавозачным дакуменце, замест канасамента прад’яўляецца гэты дакумент.

### Артыкул 310. Перадача трэцім асобам права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў

Перадача трэцім асобам права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў перадачы такога права адпраўшчыкам і атрымальнікам грузу адзін аднаму, а таксама экспедытару.

Перадача права на прад'яўленне прэтэнзіі і іску сведчыцца пераўступачным надпісам на канасаменце або іншым перавозачным дакуменце.

### Артыкул 311. Парадак прад'яўлення прэтэнзій

Прэтэнзіі прад'яўляюцца ў пісьмовай форме. Да прэтэнзіі павінны быць прыкладзены перавозачныя дакументы ў копіях.

Перавозчык мае права ў двухтыднёвы тэрмін пасля атрымання прэтэнзіі вярнуць яе без разгляду, калі да прэтэнзіі не прыкладзены перавозачныя дакументы ў копіях.

Да прэтэнзіі аб страце, нястачы або пашкоджанні (псаванні) грузу, акрамя перавозачных дакументаў, дакументаў, якія пацвярджаюць права на прад'яўленне прэтэнзіі, павінны быць таксама прыкладзены дакументы, што сведчаць колькасць і кошт адпраўленага грузу.

## ГЛАВА 28
## ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ. ТЭРМІНЫ ДЛЯ ПРАД'ЯЎЛЕННЯ І РАЗГЛЯДУ ПРЭТЭНЗІЙ

### Артыкул 312. Тэрміны іскавай даўнасці па патрабаваннях, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў

Для патрабаванняў, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, устанаўліваецца гадавы тэрмін іскавай даўнасці.

Тэрмін іскавай даўнасці вылічваецца:

1) па патрабаваннях аб пакрыцці страт за страту грузу – па сканчэнні трыццаці дзён з дня, у які груз павінен быў быць выдадзены, а пры змешанай перавозцы – па сканчэнні чатырох месяцаў з дня прыёму грузу для перавозкі;

2) па патрабаваннях аб пакрыцці страт за нястачу або пашкоджанне (псаванне) грузу, за пратэрміноўку ў дастаўцы або затрымку ў выдачы грузу і вяртанні перабору ці спагнанні недабору правазной платы – з дня выдачы грузу, а калі груз не быў выдадзены – з дня, у які ён павінен быў быць выдадзены;

3) па патрабаваннях аб пакрыцці страт за непадачу судна або падачу яго са спазненнем, плаце за прастой судна, а таксама аб выплаце прэмій за датэрміновую пагрузку ці выгрузку – з дня заканчэння месяца, наступнага за тым, у які пачалася або павінна была пачацца перавозка;

4) ва ўсіх астатніх выпадках – з дня наступлення падзеі, якая паслужыла падставай для прад'яўлення патрабавання.

### Артыкул 313. Тэрміны іскавай даўнасці па іншых патрабаваннях

Да патрабаванняў, якія вынікаюць з марской перавозкі пасажыраў і багажу, тайм-чартару, бербоўт-чартару, буксіроўкі, марскога страхавання, здзелак, якія ажыццяўляюцца капітанам судна ў адпаведнасці з прадастаўленымі яму законам правамі, сутыкнення суднаў, ажыццяўлення выратавальных аперацый, прымяняецца двухгадовы тэрмін іскавай даўнасці.

Тэрмін іскавай даўнасці вылічваецца:

1) па патрабаваннях, якія вынікаюць з дагавора марской перавозкі пасажыраў і багажу:

у дачыненні да пасажыраў – з дня, калі пасажыр пакінуў або павінен быў пакінуць судна, а калі патрабаванне прад’яўлена ў сувязі з прычыненнем падчас марской перавозкі шкоды здароўю пасажыра, якая стала прычынай яго смерці, – з дня смерці пасажыра, але не павінен быць большым за тры гады з дня, калі пасажыр пакінуў судна;

у дачыненні да багажу – з дня выдачы багажу або з дня, калі ён павінен быў быць выдадзены;

2) па патрабаваннях, якія вынікаюць з тайм-чартару, бербоўт-чартару, буксіроўкі, марскога страхавання, здзелак, якія ажыццяўляюцца капітанам судна ў адпаведнасці з дадзенымі яму законам правамі, – з дня ўзнікнення права на іск;

3) па патрабаваннях аб пакрыцці страт ад сутыкнення суднаў – з дня сутыкнення суднаў;

4) па патрабаваннях, якія ўзніклі пры ажыццяўленні выратавальных аперацый, – з дня заканчэння выратавальных аперацый.

### Артыкул 314. Прымяненне агульных тэрмінаў іскавай даўнасці

Да патрабаванняў, для якіх тэрміны іскавай даўнасці гэтым Кодэксам не ўстаноўлены, прымяняюцца агульныя тэрміны іскавай даўнасці.

### Артыкул 315. Прыпыненне цячэння тэрміну іскавай даўнасці пры наяўнасці агульнай аварыі

Калі вылічэнне сумы патрабавання залежыць ад разлікаў па агульнай аварыі, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца на час з дня вынясення дыспашэрам пастановы аб наяўнасці агульнай аварыі і да дня атрымання дыспашы зацікаўленай асобай.

### Артыкул 316. Тэрмін для прад’яўлення прэтэнзій, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу

Прэтэнзіі да перавозчыка, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу, могуць быць прад’яўлены на працягу першых шасці месяцаў тэрміну іскавай даўнасці.

### Артыкул 317. Тэрмін разгляду прэтэнзій, якія вынікаюць з марской перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу

Перавозчык абавязаны на працягу трыццаці дзён разгледзець прад’яўленую прэтэнзію і паведаміць заяўніку аб яе задавальненні або адхіленні.

З дня прад’яўлення прэтэнзіі, якая вынікае з марской перавозкі грузаў, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца да атрымання адказу на прэтэнзію або сканчэння тэрміну, устаноўленага для адказу.

# РАЗДЗЕЛ XV
# ПРЫМЯНЯЛЬНАЕ ПРАВА

## ГЛАВА 29
## ПРЫМЯНЯЛЬНАЕ ПРАВА

### Артыкул 318. Выбар прымяняльнага права

Права, якое прымяняецца да адносін з замежным элементам, якія ўзнікаюць з гандлёвага мараплаўства, вызначаецца на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь,

гэтага Кодэкса, іншых заканадаўчых актаў, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь і не супярэчаць заканадаўству міжнародных звычаяў.

Пагадненне бакоў аб выбары права павінна быць яўна выражана або прама вынікаць з умоў дагавора і акалічнасцей справы, якія разглядаюцца ў іх сукупнасці.

Калі ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула немагчыма вызначыць права, падлеглае прымяненню, прымяняецца права, найбольш цесна звязанае з адносінамі, ускладненымі замежным элементам.

**Артыкул 319. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна і судна, якое будуецца**

Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на судна і судна, якое будуецца, вызначаюцца паводле права дзяржавы, дзе гэта маёмасць зарэгістравана.

**Артыкул 320. Права на затанулую маёмасць**

Права на маёмасць, затанулую ва ўнутраных марскіх водах або ў тэрытарыяльным моры, а таксама адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з гэтай маёмасцю, вызначаюцца паводле права дзяржавы, дзе гэта маёмасць знаходзіцца.

Да затанулых у адкрытым моры суднаў, грузаў, якія знаходзяцца на іх, і іншай маёмасці прымяняецца права дзяржавы флага судна.

**Артыкул 321. Адносіны, якія вынікаюць з дагавораў, заключаных у галіне гандлёвага мараплаўства**

Адносіны, якія вынікаюць з дагавораў марской перавозкі грузу, тайм-чартару, бербоўт-чартару, буксіроўкі, марскога страхавання, рэгулююцца правам, прадугледжаным пагадненнем бакоў, а па дагаворы марской перавозкі пасажыраў і дагаворы марскога круізу – таксама правам, указаным у білеце.

Пры адсутнасці пагаднення бакоў аб праве, падлеглым прымяненню, адносіны бакоў вызначаюцца паводле права дзяржавы, дзе мае асноўнае месца дзейнасці бок, які з’яўляецца:

1) перавозчыкам – у дагаворах марской перавозкі і марскога круізу;
2) суднаўладальнікам – у тайм-чартары;
3) арэндадаўцам – у бербоўт-чартары;
4) уладальнікам буксірнага судна – у дагаворы буксіроўкі;
5) страхоўшчыкам – у дагаворы марскога страхавання.

**Артыкул 322. Права, прымяняльнае пры агульнай аварыі**

Пры адсутнасці пагаднення бакоў аб праве, падлеглым прымяненню, агульная аварыя вызначаецца паводле права дзяржавы, ва ўнутраных марскіх водах або ў тэрытарыяльным моры якой адбылося здарэнне, што выклікала агульную аварыю.

Калі здарэнне, якое выклікала агульную аварыю, адбылося ў адкрытым моры і спрэчка разглядаецца ў Рэспубліцы Беларусь, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, калі ўсе асобы, інтарэсы якіх закрануты агульнай аварыяй, належаць да адной і той жа дзяржавы, прымяняецца права гэтай дзяржавы.

**Артыкул 323. Адносіны па пакрыцці страт ад сутыкнення суднаў**

Адносіны па пакрыцці страт ад сутыкнення суднаў ва ўнутраных марскіх водах і ў тэрытарыяльным моры рэгулююцца правам дзяржавы, дзе адбылося сутыкненне.

Калі сутыкненне адбылося ў адкрытым моры і спрэчка разглядаецца ў Рэспубліцы Беларусь, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Да адносін па пакрыцці страт ад сутыкнення суднаў, якія плаваюць пад адным нам, прымяняецца права дзяржавы гэтага флага незалежна ад месца сутыкнення суднаў.

**Артыкул 324. Адносіны па ратаванні судна і іншай маёмасці**

Пры адсутнасці пагаднення аб праве, падлеглым прымяненню да адносін па ратаванні судна і іншай маёмасці ва ўнутраных марскіх водах і ў тэрытарыяльным моры, прымяняецца права дзяржавы, дзе мела месца ратаванне, а калі ратаванне мела месца ў адкрытым моры і спрэчка разглядаецца ў Рэспубліцы Беларусь – заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Калі судна, якое ратавала, і ратаванае судна плаваюць пад адным флагам, прымяняецца права дзяржавы гэтага флага незалежна ад месца ратавання.

Да размеркавання ўзнагароджання, належнага за ратаванне, паміж суднаўладальнікам судна, што ратавала, яго капітанам і іншымі членамі экіпажа судна прымяняецца права дзяржавы флага судна, а калі ратаванне ажыццяўлялася не з судна – права, пад дзеянне якога падпадае дагавор, заключаны паміж выратавальнікам і яго работнікамі.

**Артыкул 325. Іпатэка**

Да іпатэкі прымяняецца права дзяржавы рэгістрацыі іпатэк, калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем бакоў.

## РАЗДЗЕЛ XVI
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 326. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уступае ў сілу з 1 студзеня 2000 года.

**Артыкул 327. Прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам**

Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў частцы, якая не супярэчыць гэтаму Кодэксу, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу аднаго года з дня ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса прыняць меры па прывядзенні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

(Неафіцыйны пераклад). Распаўсюджваецца згодна з пунктам 14 Палажэння аб дзейнасці па распаўсюджанні (прадастаўленні) прававой інфармацыі, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. № 712 «О совершенствовании государственной системы правовой информации Республики Беларусь».